КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY

ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г. / № 20 (1303) 20 мая 2017 г.

Міністр культуры Рэспублікі Беларусь Барыс Святлоў.

Народны мастак Беларусі Леанід Шчамялёў.

Алеся Скарабагатая.

Рыгор Сітніца. / Фота Тацяны МАТУСЕВІЧ



Народны мастак Беларусі Уладзімір Тоўсцік.

Паліна Пірагова і Васіль Цімашоў.

Яўген Колчаў.

Сяргей Белзокі.

Мікалай Кузьміч.

Глеб Отчык.

Эліна Шынкарэнка.

Барыс Крэпак.

ПЕРШАЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ПРЭМІЯ Ў ГАЛІНЕ ВЫЯЎЛЕНЧАГА МАСТАЦТВА

Падрабязнасці на старонцы 2.

"Кірылам Тураўскім" па моры Герадота

Нядаўна ён называўся саветам дырэктараў абласных метадцэнтраў. Цяпер гэта — Рэспубліканскі савет па пытаннях клубнай дзейнасці і народнай творчасці. Як зазначыў яго кіраўнік Алег Хмялькоў, адказнасці паболела, але і паўнамоцтвы сталі шырэйшымі. Маўляў, сёння ўзняць праблему — адно, а вызначыць шляхі яе вырашэння — зусім іншае. Вось пра гэта "зусім іншае" і паспрабую распавесці гаворку.

Яўген РАГІН, Мінск — Жыткавіцкі, Петрыкаўскі, Мазырскі, Буда-Кашалёўскі раёны Гомельшчыны — Мінск

Цягам 11 — 12 мая, падчас выязнога пасяджэння, члены савета — намеснік міністра культуры Васіль Чэрнік, начальнік упраўлення ўстаноў культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Наталля Задзяркоўская, галоўны спецыяліст згаданага ўпраўлення Алена Палавец, начальнік аддзела традыцыйнай культуры і аматарскай творчасці Інстытута культуры Беларусі Алесь Лозка ды кіраўнікі абласных метадычных цэнтраў — наведалі Гомельшчыну. Натуральна, дырэктар Гомельскага абласнога цэнтра народнай творчасці Мікалай Шамшэня пастараўся паказаць лепшае з культурных ціка-востак Прыпяцкага Палесся. І, трэба аддаць належнае, рэжысура ды драматургія двухдзённай праграмы была распрацавана па-майстэрску. І лейтматыў яе быў надзвычай актуальным: "Вёска ўчора, сёння, заўтра". А мне падчас камандзіроўкі пастаянна згадваліся словы загадчыка кафедры менеджменту сацыякультурнай дзейнасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў і члена згаданага савета Алены Макаравай: "Абавязкова варта павесці гаворку пра неадкладную неабходнасць маркетынгавага падыходу да справы, пра абавязковае выкарыстанне самых сучасных тэхналогій культурна-дасугавай дзейнасці!" Алена Аляксандраўна не змагла прыняць удзел у рабоце савета, бо ва ўніверсітэце тымі днямі праходзілі дзяржаўныя іспыты, але словы яе лічыце эпіграфам да гэтага артыкула (у згаданым выказванні, па маім перакананні, і трэба шукаць ключык да вырашэння ці не ўсіх нашых праблем). Да слова, такога стаўлення да справы не стае не толькі рэгіянальнай культуры Гомельшчыны, на гэта "хварэе" ўся культура краіны.

Піяр і яшчэ раз піяр

У Тураве мы заспелі свята шанавання свяціцеля Кірылы, епіскапа Тураўскага. Яно адбываецца раз на год менавіта 11 мая ў філіяле мясцовага музея — гісторыка-археалагічным комплексе "Старадаўні Тураў". Людзей сабралася мора. Мяркуючы па маіх ранейшых прыездах у Тураў, турыстаў у любы дзень тыдня ў мястэчку — з аншлагам. То тут, то там прыпаркаваны вялізныя турыстычныя аўтобусы. Інакш кажучы, Жыткавіччына даўно стала адным з важкіх аб'ектаў у Залатым турыстычным кольцы Гомельшчыны.

Па словах супрацоўніцы мясцовага музея Веранікі (нашага экскурсавода па Тураве), штогод бывае каля 15 тысяч турыстаў. Мястэчка для гэтага добра прыстасавана, ягоная інфраструктура пастаянна развіваецца. У далейшай гутарцы з ветлівай дзяўчынай высвятляем, што толькі тры працэнты ад агульнай колькасці гасцей — замежнікі (у асноўным — расіяне). Больш за тое, госці знаёмяцца з Туравам па накатанай схеме: археалагічны комплекс, помнік Тураўскаму, каменныя крыжы на мясцовых могілках, кафедральны сабор. А вось мясцовы краязнаўчы музей наведваюць зрэдчас. Вераніка, маркетолаг па адукацыі, сама каментуе сітуацыю: "Не стае рэкламы".

Заканчэнне — **на старонцы 10.**

Prof-партфоліа

Эфект кніжнага "стартапа"

Мяркую, вядомую прымаўку "скажы, хто твой сябар — і я скажу, хто ты" трэба сёння перафразаваць. Скажам, для работнікаў сферы культуры Беларусі лепш прагучыць выраз накшталт "скажы мне, хто твой сацыяльны партнёр — і я скажу, хто ты".

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Што трэба культработніку?

Аднойчы ў раёне давялося пачуць жарт: калі работнік культуры кажа, што ў яго ёсць усё для мерапрыемства, дык гэта… не работнік культуры. І ў гэтым жарце ёсць зерне праўды, балазе бюджэтнае фінансаванне скарачаецца. На жаль, бібліятэкі тут — у авангардзе. І не толькі таму, што ўстановы сёння ўсё больш робяцца не толькі асветніцкімі, але і інфармацыйна-культурнымі цэнтрамі, а і па зусім простай прычыне: кантакты з чытачамі вымушаюць супрацоўнікаў "кніжніц" шукаць новыя формы работы, прыцягваць увагу наведвальнікаў не толькі выставамі і сустрэчамі з літаратарамі. Часам з дапамогай сталых сяброў.

Напрыклад, як адзначыла "К" галоўны бібліятэкар аддзела маркетынгу і праектнай дзейнасці Навуковай бібліятэкі Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта Вольга Воўк, першы фестываль "Горад і Кнігі" тутэйшыя спецыялісты ладзілі з дапамогай сацыяльных партнёраў.

— Наш фэст нарадзіўся з выставы "хэнд-мэйд" герояў з сучасных кніг, якая прайшла ў БНТУ ў 2013 годзе і выклікала цікавасць наведвальнікаў, — кажа Вольга. — Тады мы падумалі: чаму не папрасіць знакамітых айчынных майстроў "хэнд-мэйду" зрабіць для фестывалю лялькі "нераскручаных" герояў кніг. Некаторыя з майстроў адгукнуліся на прапанову — і наш кніжны "стартап" у 2014 годзе выйшаў у народ.

Пазней ужо штогадовы фэст прызналі лепшым на форуме "HR-брэнд 2016" у намінацыі "Культура" (пра што "К", дарэчы, пісала). І заслуга сацыяльных партнёраў у гэтай перамозе — вялікая. Хаця на гэтым шляху паўстае шмат цяжкасцей.

— Паводле свайго вопыту магу сказаць, што ў асноўным праца з партнёрамі ідзе на асабістых кантактах, — кажа Вольга Воўк. — Напрыклад, каб знайсці майстроў хэнд-мэйду, мы выходзілі на знёмых або проста абыходзілі ўсе выставы падобнага кшталту (скажам, той жа "Млын"), якія ладзіліся ў сталіцы цягам года, і прапаноўвалі майстрам паўдзельнічаць.

Пра неабходнасць асабістых кантактаў у справе прыцягнення сацыяльных партнёраў казала мне і загадчык аддзела культурна-відовішчнай дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі Наталля Башкірава. Напрыклад, "Бібліяноч-2017", якую наведала па розных падліках ад 3 да 7 тысяч чалавек, супрацоўнікі аддзела зладзілі дзякуючы "сарафаннаму радыё".

Заканчэнне — **на старонцы 12.**

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" ПРАЗ ІНДЫВІДУАЛЬНЫ (63875) І ВЕДАМАСНЫ (638752) ІНДЭКСЫ.

З дапамогай банкаўскай карткі газету можна выпісаць праз інтэрнэт-сэрвіс на сайце "Белпошты" (пункт "Афармленне падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі").

Віншаванне

Дарагія сябры!

Прыміце самыя цёплыя і шчырыя віншаванні з Міжнародным днём музеяў! Музей — гэта цэлы свет, дзякуючы якому можна прасачыць эвалюцыю, развіццё культуры і жыццё цэлых народаў, навуковы і тэхнічны прагрэс, станаўленне мастацтва і літаратуры. Музей — тая мясціна, дзе кожны дзень ажыццяўляецца жывая повязь часоў і пакаленняў, дзе будучыня сустракаецца з мінуўшчынай.

Дзейнасць музеяў з году ў год становіцца ўсё больш разнастайнай і запатрабаванай. У сучасным свеце музей выступае як аб'ект культурнай, сацыяльнай і турыстычнай інфраструктуры. Сёння музеі не толькі месца захоўвання матэрыяльнай і духоўнай спадчыны, але і адкрытая пляцоўка для дыялогу культур, мінулага і цяперашняга, класічнага і сучаснага.

Неабходна адзначыць, што адзін з галоўных здабыткаў музеяў — гэта людзі, музейныя работнікі — энтузіясты, якія кожны дзень клапатліва захоўваюць культурную спадчыну роднай Беларусі.

Кажуць, што без мінулага — няма будучыні. І гэта сапраўды так. Працуючы ў музеі з вялікай самааддачай, вы робіце вялікую справу — захоўваеце старонкі гісторыі для нашых нашчадкаў.

Дарагія музейныя работнікі, у гэты вясновы святочны дзень ад усёй душы жадаю вам натхнення, творчых поспехаў, знаходак і адкрыццяў, шчасця, здароўя і дабрабыту.

Міністр культуры Рэспублікі Беларусь Барыс СВЯТЛОЎ

Падзея

"Цяпер у нас ёсць творы са статусам нацыянальнага скарба!"

Упершыню ў гісторыі рэспублікі беларускія мастакі, скульптары, фатографы, крытыкі ўганараваныя Нацыянальнай прэміяй у галіне выяўленчага мастацтва. "К" павіншавала лаўрэатаў на цырымоніі ўзнагароджання ў Палацы мастацтваў.

Вераніка МОЛАКАВА / Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

Пакуль у выставачнай зале збіраліся члены журы ды намінанты, скульптар Ксенія Шапо рыхтавала за сцэнай прызы да цырымоніі ўзнагароджання — шкляныя прамавугольныя канструкцыі, аздобленыя выявай дрэва, стылізаванага пад выцінанку. Ксенія разам з дызайнерам Юліяй Галавіной сталі пераможцамі конкурсу эскізных праектаў спецыяльнага прыза і дыплома лаўрэата прэміі, абвешчанага Міністэрствам культуры ў лістападзе 2016 года.

— Па ўмовах конкурсу ўзнагарода павінна раскрываць абагульнены вобраз беларускага мастацтва, — патлумачыла Ксенія Шапо. — Выява дрэва ідэальна пасуе такой задачы — у яго ёсць карані, а значыць традыцыі, і ёсць крона, якая сімвалізуе новае пакаленне мастакоў. Шкло, унутры яго латунь, спатрэбілася лазерная рэзка, літары на падстаўцы — гэта інкрустацыя. Рэалізаваць нашу задуму было складана, тым больш што вылучанага часу для працы не хапала. Вырабілі 12 статуэтак на заслаўскім шкляным прадпрыемстве "Енісей", бо толькі там знайшоўся літоўскі спецыяліст, які нам дапамог усё зрабіць як след. Вынік — паўнавартасны твор дэкаратыўна-прыкладнога і нават ювелірнага мастацтва.

Акрамя статуэткі, лаўрэатам падрыхтавалі яшчэ дыпломы і грашовыя прызы па 100 базавых велічынь (2300 рублёў). Тым часам для прывітальнага слова гасцям і ўдзельнікам цырымоніі да мікрафона запрасілі міністра культуры Рэспублікі Беларусь Барыса Святлова.

— Наш першы конкурс ужо амаль адыходзіць у гісторыю, нам ад яго застаюцца светлыя ўспаміны і надзея, што мы працягнем гэтую традыцыю. 310 заявак, 63 намінанты, больш за 20 членаў журы — гэта ўражвае! — адзначыў Барыс Уладзіміравіч.

Першым Нацыянальнай прэміяй "За ўнёсак у развіццё выяўленчага мастацтва" ўганаравалі народнага мастака Беларусі Леаніда Шчамялёва, але прысутнічаць на цырымоніі ён не змог, і прыз ад яго імя атрымаў старшыня Беларускага саюза мастакоў Рыгор Сітніца.

— Здароўе трэба мець, каб гэта трымаць, — пажартаваў ён, узяўшы ў рукі статуэтку. Праз некалькі хвілін Рыгор Сямёнавіч атрымаў яшчэ адну ўжо як пераможца ў намінацыі "Графіка".

— Я вельмі ўзрушаны, — прызнаўся лаўрэат. — Як старшыня саюза ад імя ўсіх мастакоў выказваю шчырую падзяку, што нарэшце гэта адбылося: нацыя

■ Віншуем лаўрэатаў

ЖЫВАПІС — Тоўсцік Уладзімір Антонавіч;
ГРАФІКА — Сітніца Рыгор Сямёнавіч;
СКУЛЬПТУРА — Цімашоў Васіль Валер'евіч, Пірагова Паліна Васільеўна;
ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНОЕ МАСТАЦТВА — Кузьміч Мікалай Пятровіч;
ТВОРЧЫ ДЭБЮТ — Скарабагатая Алеся Міхайлаўна;
МАНУМЕНТАЛЬНАЕ І МАНУМЕНТАЛЬНА-ДЭКАРАТЫЎНАЕ МАСТАЦТВА — Отчык Глеб Анатольевіч;
НАВАЦЫЯ — Белаокі Сяргей Часлававіч;
ДЫЗАЙН — Шындлер Эліна Генадзьеўна;
МАСТАЦКАЯ ФАТАГРАФІЯ — Колчаў Яўген Аляксеевіч;
КРЫТЫКА І МАСТАЦТВА — Крэпак Барыс Аляксеевіч;
Прыз глядацкіх сімпатый атрымала Алеся СКАРАБАГАТАЯ;
Мецэнатам галіны названы "Прыёрбанк".

Сустрэча з таленавітымі

Як паведамляюць у Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь, 22 мая ў сталічным Цэнтры дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі "Кантакт" намеснік Прэм'ер-міністра краіны Васіль Жарко сустрэнецца з навучэнцамі і студэнтамі — пераможцамі міжнародных прадметных алімпіяд, творчых конкурсаў і фестываляў, лаўрэатамі і стыпендыятамі спецыяльных фондаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў, студэнтаў і таленавітай моладзі.

Падчас мерапрыемства адбудзецца цырымонія ўзнагароджання лаўрэатаў названых фондаў за 2016 — 2017 гады і канцэрт, будзе працаваць выстава навуковых і творчых дасягненняў.

У цырымоніі ўзнагароджання разам з намеснікам Прэм'ер-міністра Васілём Жарко возьмуць удзел міністры культуры і адукацыі Барыс Святлоў ды Ігар Карпенка. Сярод ганаровых гасцей мерапрыемства — і сённяшнія старшыні спецыяльных фондаў Кацярына Дулава, Сяргей Абламейка, і тыя, хто кіраваў гэтымі фондамі ў розныя гады; а таксама — лаўрэаты фондаў, што адбыліся ў прафесіі, і педагогі, якія зрабілі важкі ўнёсак у развіццё таленавітай ды адоранай моладзі.

На выставе будуць прадстаўлены сацыяльна значныя праекты агульнарэспубліканскага значэння з удзелам студэнтаў і выкладчыкаў Акадэміі мастацтваў і музыкі. Сярод аўтараў работ — майстры выяўленчага мастацтва Алеся Скарабагатая, Ганна Конанава, лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, аўтар манумента "Брама памяці" ў Трасцянцы Канстанцін Касцючэнка і іншыя. Маладыя вучоныя прэзентуюць на выставе свае дасягненні і ўзнагароды ў галіне дакладных дысцыплін.

У канцэрце возьмуць удзел юныя таленты і ўжо знакамітыя артысты: Аляксандр Данілаў, Міхаіл Радунскі, салісты ансамбля "Універсум" і ансамбля Рэспубліканскай гімназіі-каледжа пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі пад кіраўніцтвам Уладзіміра Перліна ды іншыя.

Уласніку стала цесна...

Як знайсці кампраміс паміж "інтарэсамі" спадчыны і патрэбамі яе карыстальнікаў?

Выпадкова ці не, але апошняе на сёння пасяджэнне Рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны амаль цалкам прысвячалася адной і той самай праблеме ў некалькіх яе праявах. Уласніку або карыстальніку гістарычнага будынка стала замала наяўных плошчаў, і ён імкнецца іх пашырыць — з дапамогай сучасных матэрыялаў.

Ілья СВІРЫН

У заканадаўстве гэты від работ характарызуецца як "дапаўненне", а ў прастамоўі яго звычайна безапеляцыйна называюць "навадзелам". І тут непазбежна паўстае дылема: па-першае, спадчына ёсць спадчына, і нельга яе крыўдзіць. А па-другое… і людзям таксама трэба неяк жыць і развівацца. Спецыялістам застаецца хіба лавіраваць паміж двух агнёў, улічваючы гэтыя часам рознавектарныя інтарэсы.

Сутарэнні як цэнтр ініцыятыў

Падчас разгляду першага ў той дзень пытання на пасяджэнні прысутнічаў Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч. Гутарка вялася пра дазвол на будаўніцтва духоўна-асветніцкага цэнтра побач са знакамітым Чырвоным касцёлам. На прапанаваных да азнаямлення рэндарах і нават макеце — камяніца памерам 10 на 30 квадратных метраў, выкананая з неатынкаванай цэглы і стылізаваная пад архітэктуру касцёла. Відавочна, аўтары праекта імкнуліся, каб будынак у агульным ансамблі выглядаў "як родны".

Прычыну новага будаўніцтва яго заказчык патлумачыў проста і шчыра. Так, былі спасылкі і на ўвасабленне першапачатковай задумы Эдварда Вайніловіча, і на відавочную незавершанасць ансамбля. Але самая галоўная матывацыя ўсё ж іншая: парафія патрабуе плошчаў для ажыццяўлення сваёй дзейнасці.

І з гэтым, дарэчы, цяжка не пагадзіцца. Стараннямі пробашча Уладзіслава Завальнюка і, як дадаў бы сам ксёндз-магістар, Божай ласкай Чырвоны касцёл даўно стаў не проста храмам, але пляцоўкай для самых розных добрых ініцыятываў. Завітаўшы туды, можна здзівіцца таму вірліваму руху, што пануе з ранку да вечара ў лёхах — не толькі ў залах, але нават і ў калідорах. Нярэдка там адбываецца па тры-чатыры мерапрыемствы адначасова, і не перашкаджаць адзін аднаму іх удзельнікі не могуць чыста фізічна. Тым больш, як справядліва заўважыў Яго Эксэленцыя, сутарэнні самі па сабе не надта пасуюць, скажам, для нядзельнай школкі.

Агрэсіўным прыхільнікам секулярнай мадэлі грамадства, якія абавязкова запярэчаць, што праблемы царкоўнікаў іх не хвалююць, мы прапануем наступны кантраргумент. Апрача грэка-каталіцкіх набажэнстваў і катэхітычных заняткаў, у тых сутарэннях ладзіцца і процьма свецкіх пачынаў: выставы, канцэрты, імпрэзы, сустрэчы ўдзельнікаў руху ананімных алкаголікаў і нават пчаляроў… Па сутнасці, ужо і сёння Чырвоны касцёл з'яўляецца не толькі духоўна-асветніцкім, але і грамадска-культурным цэнтрам. Там ёсць і бібліятэка, дзе на паліцах далёка не толькі рэлігійная літаратура.

Цяжка не пагадзіцца і з тым, што новая пабудова дадасць ансамблю цэльнасці, утварыўшы ўнутраны дворык і аддзяліўшы прыкасцёльную тэрыторыю ад наваколля, якое не надта з ёю гарманіруе. Сёння ж тая галерэя, што адгаліноўваецца ад касцёла, па сутнасці, нікуды не вядзе. Да ўсяго, неўтаймоўны ксёндз Завальнюк ужо бачыць у тым дворыку прыгожы фантан… Цяпер там, нагадаю, аўтастаянка.

У той самы час, гістарычны базіс новай пабудовы выглядае даволі хісткім, прычым у дадзеным выпадку цяжка спаслацца нават на ўвасабленне нерэалізаванай аўтарскай

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь пастановай ад 15 мая № 354 вырашыў далучыць да Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Інстытут культуры Беларусі. Міністэрству культуры даручана цягам трох месяцаў прыняць меры па рэалізацыі пастановы.

Калектыў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь смуткуе з прычыны заўчаснай смерці ФЕНЬКО Алены Уладзіміраўны, дырэктара дзяржаўнай установы "Дзяржаўны ансамбль танца Беларусі", і выказвае шчырыя спачуванні яе родным, блізкім і калегам.

Калектыў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь выказвае шчырыя спачуванні кансультанту эканамічнага ўпраўлення Міністэрства культуры Цыбаевай Святлане Фёдараўне у сувязі з напаткаўшым яе горам — смерцю маці.

Газета КУЛЬТУРА
ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА)
Выдаецца з кастрычніка 1991 года.
Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Галоўны рэдактар — Сяргей Сяргеевіч ТРАФІЛАЎ. **Адказны сакратар** — Юрый КАРПЕНКА; **рэдактары аддзелаў:** Надзея БУНЦЭВІЧ, Барыс КРЭПАК, Яўген РАГІН, Ілья СВІРЫН; **агляднымі рэдакцыі:** Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Вераніка МОЛАКАВА, Настасся ПАНКРАТАВА, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ; **спецыяльныя карэспандэнты:** Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, Алег КЛІМАЎ, Алена ЛЯШКЕВІЧ, Канстанцін АНТАНОВІЧ; **карэспандэнт** — Ганна ШАРКО; **мастацкі рэдактар** — Наталля ОВАД; **карэктар** — Мая ХУТКОВА.
Сайт: **www.kimpress.by.** E-mail: **kultura@tut.by.** Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23. Тэлефон-факс: (017) 334 57 41. Рэкламны аддзел: тэл. (017) 286 07 97, 334 57 41. Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА". 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.
Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялу. *Матэрыял на правах рэкламы.
"Культура", 2017. Наклад 4 200. Індэксы 63875, 63752. Рознічны кошт — па дамоўленасці. Падпісана ў друк 19.05.2017 у 22.00. Замова 1793. Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку". ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

ўсвядоміла, чаго вартае яе мастацтва. Цяпер у нас ёсць творы са статусам нацыянальнага скарба!

Затым як "Мецэната выяўленчага мастацтва" адзначылі адкрытае акцыянернае таварыства "Прыёрбанк". Адзін за адным выходзілі на сцэну лаўрэаты — амаль заўжды без лішніх словаў і са шчаслівай усмешкай забіралі прыз. Гучнымі апладысментамі і крыкамі "Брава!" адрэагавала зала на перамогу Яўгена Колчава ў намінацыі "Мастацкая фатаграфія". Мастацтвазнаўцу, рэдактара аддзела "К" Барыса Крэпака ўзнагароджвалі пад усеагульнае "Ура!" Вялікай нечаканасцю для ўсіх намінантаў стаў прыз глядацкіх сімпатый, які ўручылі Алесі Скарабагатай — пераможцы ў намінацыі "Творчы дэбют".

— Я адразу нават не думала ўдзельнічаць, але калі чалавек пяць мне параілі падаць заяўку, падумала: "Чаму не?" — распавяла мастачка. — Атрымаць прэмію ўвогуле не чакала, тым больш прыз глядацкіх сімпатый. Гэта вельмі прыемна!

Убачыць творы пераможцаў і намінантаў можна да 27 мая ў Мінску ў залах Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў на праспекце Незалежнасці, 47 ("Жывапіс", "Графіка", "Манументальнае і манументальна-дэкаратыўнае мастацтва", "Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва", "Мастацтвазнаўства і крытыка", "Творчы дэбют") і на вуліцы Някрасава, 3 ("Навацыя", "Мастацкая фатаграфія", "Скульптура", "Дызайн").

Надалей Нацыянальная прэмія ў галіне выяўленчага мастацтва будзе праводзіцца раз на тры гады.

— Усё ж такі творы не пішуцца хутка, праекты не ствараюцца за адзін дзень, шмат хто любіць працаваць серыямі. Трэба даць мастакам час, каб яны прадставілі не прахадны твор, а рэч высокага ўзроўню, — патлумачыла дырэктар Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў і член журы конкурсу Наталля Шаранговіч.

Яна таксама адзначыла, што з боку мастакоў да конкурсу была вялікая цікавасць, заяўкі падало шмат удзельнікаў з рэгіёнаў.

— Фактычна гэта першая прэмія, дзе мастакі маглі прэзентаваць самі сябе, а не саюзы ці акадэміі, — дадала Наталля Шаранговіч. - Ім далі магчымасць самім ацаніць сябе, выбрасць знакавы твор за апошнія тры гады. Многія не чакалі такога пасылу і разгубіліся. Не ўсе зразумелі, што для першага тура важны фармат падачы для адборачнай камісіі — добра запісанае відэа, фотаздымак. У другім туры рашэнне прымала журы пасля таго, як убачыла 63 адабраныя працы на Рэспубліканскай выставе сучаснага выяўленчага мастацтва, якая пачалася 18 красавіка. За кожнага з мастакоў, якія сталі лаўрэатамі, было аддадзена не менш за 60 — 70 працэнтаў галасоў.

Зацверджана канцэпцыя

16 мая ў Полацку пад старшынствам намесніка Прэм'ер-міністра Беларусі Васіля Жарко, як паведамляе БЕЛТА, адбылося пасяджэнне нацыянальнага арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні Дня Беларускага пісьменства. У рабоце камітэта прымалі ўдзел міністры культуры і інфармацыі Барыс Святлоў і Лілія Ананіч.

Сябры камітэта наведалі шэраг аб'ектаў горада, якія цяпер рыхтуюцца да свята: Мастацкую галерэю, Сафійскі сабор, Музей беларускага кнігадрукавання, Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт. Зроблена шмат. Дарэчы, калыска беларускай дзяржаўнасці прымае Дзень беларускага пісьменства ў трэці раз. І кіраўніцтва горада імкнецца, каб мерапрыемства не было падобным на ранейшыя.

На пляцоўцы былога калегіума, дзе сёння знаходзіцца ўніверсітэт, побач са скульптурай студэнта, усталяванай у 2010 годзе, з'явілася сімвалічная бронзавая выява прафесара. Яе аўтар — дэкан мастацкага факультэта Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Аляксандр Прохараў.

Зацверджана канцэпцыя Дня беларускага пісьменства, распрацавана яго сімволіка. Аснова святочнай рэжысуры — мастацка-гістарычная дзея "Беларускі шлях", якую можна будзе ўбачыць на ўрачыстым адкрыцці мерапрыемства. Сцэнарным стрыжнем дзеі стануць дзве даты: 500-годдзе беларускага кнігадрукавання і 1155 дзень нараджэння Полацка. Менавіта ён лічыцца калыскай беларускай дзяржаўнасці. Гэтая тэма і стане лейтматывам свята. Музычна-тэатралізаваны блок будзе прысвечаны сучаснай Беларусі.

На Дні беларускага пісьменства ў Полацку чакаецца шмат замежных гасцей: літаратараў, дыпламатаў. Пісьменнікі з 15 краін прымуць удзел у "круглым стале", дзе гаворка пойдзе пра сённяшні літаратурны працэс, пра трывалую повязь сучаснасці з мінуўшчынай.

Падчас мерапрыемства пройдуць свята сярэднявечнай культуры "Рубон", фінал конкурсу юных чытальнікаў "Жывая класіка", фэст кнігі і прэсы. У Музеі беларускага кнігадрукавання адбудзецца некалькі выстаў: манет з Нацыянальнага банка Беларусі і старых Псалтыроў з усёй краіны. Ахвотныя прасочаць за працай афортнага станка. У Сафійскім саборы пройдуць канцэрты. На асобнай выставе будзе падведзены вынік пленэру "Полацк у гравюрах сучасных мастакоў".

Мова сумоўя — паэзія

15 мая на святочнай імпрэзе ў рамках культурнага супрацоўніцтва Беларусі і Кітая ў Доме дружбы да серыі кніг "Светлыя знакі: паэты Кітая" далучылася новае выданне — зборнік вершаў паэта Мэн Хаожаня ў перакладзе на беларускую мову Мікалая Мятліцкага.

Ганна ШАРКО

Дарэчы, ён сам, перакладчык кітайскай паэзіі, лаўрэат дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусі імя Янкі Купалы, выказаўся вельмі літаратурна наконт кітайскай паэзіі: "Гэта вялікі пяты акіян, яго духоўна напорыстыя хвалі імкнуцца ў нашу сучаснасць з глыбокай старажытнасці. Гэта адзіная цывілізацыя, якая стагоддзямі развівалася, якая бесперапынна здзейсніць вялікі чалавечы подзвіг існавання пад адзіным небам. Я вельмі рады, што нашы паэты цягнуць рух дружбы і маюць перакладчыцкі клопат, знаёмяцца з вялікай паэзіяй вялікай краіны".

У беларуска-кітайскі фонд, апрача таго, уваходзяць і іншыя кнігі, на старонках якіх асвятляюцца пытанні ўзаемаабмену вопытам ("Беларусь — Кітай: на шляху ўсебаковага супрацоўніцтва"), нацыянальнага мастацтва і літаратуры ("Пад крыламі драконаў. 100 паэтаў Кітая"), дыпламатычных адносін ("Беларуска-кітайскія адносіны ва ўспамінах беларускіх паслоў") і іншыя.

А ў планы ўваходзіць падрыхтоўка новых зборнікаў перакладаў Сюй Чжымо і Вэнь Ідо.

З урачыстага слова міністра культуры Беларусі пачалася прэзентацыя новай кнігі. Барыс Святлоў адзначыў, што праз некалькі дзён у Пекіне адбудзецца пасяджэнне беларуска-кітайскага падкамітэта па культурных сувязях, якое, дарэчы, будзе праходзіць падчас свята лодак драконаў, прысвечанага і паэзіі, і руху супраць гвалту ды вайны.

— Мы возьмем з сабой у Кітай не толькі нарматыўная дакументы, але і вялікую культурную праграму, якая пачнецца за межамі Пекіна ў іншым горадзе, дзе будзе святкавацца 25-годдзе станаўлення беларуска-кітайскіх дыпламатычных адносін, а пасля ў Пекіне адкрыецца беларускі культурны цэнтр — наш адказ на адкрыццё падобнага кітайскага цэнтра ў Мінску.

Намеснік міністра інфармацыі Аляксандр Карлюкевіч, які з'яўляецца адным з заснавальнікаў кніжнай серыі "Светлыя знакі: паэты Кітая", дадаў, што гэты зборнік — творчы праект, які дапамагае ўявіць мноства значных падзей за шматвяковую гісторыю кітайскай літаратуры. Літаральна за адзін год выдавецкі дом "Звязда" выдаў 8 кніг з творамі такіх знакамітых кітайскіх пісьменнікаў як Ван Вэй, Ду Фу, Лі Бо, Ай Цін, Лі Хэ, Лі Цінчжаа і Ван Ганчжэня.

— Наша выдавецтва вылучыла ідэю яднання культур нацыянальных літаратур менавіта праз мастацкі пераклад, таму ў кнігах серыі можна ўбачыць, што першапраходцамі ў прадстаўленні кітайскага мастацкага слова ў Беларусі былі Уладзімір Дубоўка, Рыгор Барадулін.

Новая кніга зборніка "Светлыя знакі: паэты Кітая" з вершамі Мэн Хаожаня з'яўляецца яскравым прадстаўніком росквіту танскай пейзажнай лірыкі, таму і там закранаюцца асноўныя тэмы творчасці пісьменніка — пейзажы і гісторыя месца яго жыхарства.

задумы — а менавіта гэты аргумент для дапаўненняў, прадугледжаны заканадаўствам, выкарыстоўваецца найчасцей.

Балкон прыгожы, але…

Старшыня рады, намеснік міністра культуры Аляксандр Яцко мудра прапанаваў падзяліць праблему на два складнікі: ці магчымае будаўніцтва цэнтра наогул, і калі так, дык ці магчымае яно ў прапанаваных праектантамі выглядзе і аб'ёмах? На першае пытанне большасць прысутных адказала станоўча, а вось наконт другога распаліліся дыскусіі.

Сапраўды, першапачатковая архітэктурная задума, мяркуючы па ўсім, уключала і плябанію леваруч ад касцёла, але… як сведчыць тагачасны "рэндар", выкананы ад рукі, архітэктарам тады яна ўяўлялася трохі іначай, чым уяўляецца сёння. Найперш, у куды больш сціплых аб'ёмах. Дарэчы, пазней прыбудовы да храма ўсё ж з'явіліся, аднак… задуме яны ўжо зусім не адпавядалі ды і ўвогуле атрымаліся даволі каструбаватымі. Падчас грунтоўнай рэканструкцыі 1971 года іх знеслі, і пра гэта наўрад ці выпадае шкадаваць.

Адпаведна, нічога падобнага на запраектаваную ў нашы дні камяніцу не толькі ніколі ў гісторыі не існавала, але і не планавалася. Аргументуючы праект, яго аўтары некалькі разоў ужылі слова "прыгожа" — пэўна, не зусім разумеючы, што ў дадзеных варунках яно можа гучаць як маветон, бо крытэрыі ў выпадку са спадчынай мусяць быць іншыя.

У чым жа тоіцца небяспека такіх стылізаваных дапаўненняў? Як адзначыла загадчык аддзела архітэктуры Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Таццяна Гаранская, яны нівеліруюць розніцу паміж новым і старым. Зліваючыся ва ўспрыяцці чалавека з самім помнікам, чые камяні набрынялі гісторыяй, навабуд у пэўнай меры дэвальвіруе яго каштоўнасць.

Прэтэнзіі з боку членаў Рады гучалі таксама і адносна запланаваных памераў новага цэнтра — ажно чатыры паверхі разам з цокальным і мансардным. На пасяджэнні не раз гучала пытанне: наколькі новы будынак паўплывае на ўспрыняцце як самога касцёла, так і ўвогуле ансамбля плошчы Незалежнасці? Тым больш, прадстаўлены праектантамі візуальны матэрыял адказу на яго не даваў.

Апошні паверх цэнтра, дарэчы, меўся прызначацца для апартаментаў высокіх прадстаўнікоў каталіцкага кліру. Запраектаваны нават балкон, з якога яны маглі б звяртацца, так бы мовіць, urbi et orbi. У звязку з тым, што Мінск плённа пазіцыянуе сябе як цэнтр экуменічнага дыялогу, і замежныя біскупы прыязджаюць да нас часта, такая задума падаецца цалкам дарэчнай. Але… магчыма, ад яе ўсё ж мэтазгодна адмовіцца на карысць "інтарэсаў" самога Чырвонага касцёла?

У пытанні будаўніцтва цэнтра была пастаўленая не кропка, а шматкроп'е: члены Рады адправілі праект на дапрацоўку. І паколькі ўсе зацікаўленыя бакі выяўляюць здаровую схільнасць да кампрамісаў, можна не сумнявацца ў тым, што "залатую сярэдзіну" паміж інтарэсамі спадчыны і патрабаваннямі сучаснасці ў выніку ўдасца знайсці.

Дабудова да прыбудовы

Два наступныя пытанні, якія разглядаліся на тым самым пасяджэнні, былі ў нечым падобнымі, хіба што значнасць аб'ектаў куды меншая. Даўно закінутая стагадовая камяніца на вуліцы Камсамольская ў Віцебску ўрэшце прычакала інвестара, які хоча пераўтварыць яе ў рэспектабельны гатэль. Плошчаў яму замала, і таму было вырашана зрабіць прыбудову, выкарыстоўваючы ў ёй візуальныя цытаты з даўно няіснага мадэрнавага будынку гатэля "Брытоль", які некалі месціўся побач. Архітэктурным шэдэўрам атрыманы праект я не назваў бы, але і "агрэгамурам" — таксама. У выніку — станоўчы вердыкт Рады.

Другі выпадак — нават трохі кур'ёзны. Уласнік захацеў зрабіць, па сутнасці, дабудову да прыбудовы: у савецкі час да старасвецкай камянічкі на мінскай Рэвалюцыйнай прыляпілі дзіўнай формы будан, і вось яго цяперашняму ўласніку стала зацесна… Варыянт пашырэння плошчаў абраны ўжо звыклы для цэнтраў нашых вялікіх гарадоў — мансардны паверх. Нагэўна, менавіта яны калісьці будуць успрымацца як архітэктурны сімвал гэтага прагматычнага і не ў меру капіталістычнага часу. Як адзначыла начальнік упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры Аксана Сматрэнка, гістарычны цэнтр Мінска такія дэталі зусім не ўпрыгожваюць. Але паколькі само архітэктурнае выкананне атрымалася даволі густоўным, праект таксама ўхвалілі.

Урэшце, усе гэтыя — і шматлікія іншыя — выпадкі непазбежна ставяць пытанне: калі дапаўненні непазбежныя, дык якімі яны тады павінны быць? Адказы на яго ў нашым прафесійным асяроддзі, мяркуючы па ўсім, даволі няпэўныя.

На Захадзе, дзе ў гістарычных ансамблях таксама нярэдка з'яўляюцца функцыянальна абумоўленыя інтэрвенцыі, праблема суадносных старога і новага вырашаецца праз рэзкі кантраст. Наваўводзіны выглядаюць настолькі сучаснымі, што са "старабудамі" іх ніяк не збліваюцца. Напрыклад, небезвядомая шкляная піраміда ў Луўры… Але, мяркуючы па выказваннях некаторых аўтарытэтных членаў Рады, такі радыкальны падыход у нас мае шансы ўкараніцца яшчэ няхутка.

■■■

Вядома, тут можна задаваць і яшчэ адно пытанне: а чаму ж дзяржаўныя органы, адказныя за справу аховы спадчыны, гэтак лёгка ідуць на кампраміс з уласнікамі? Адказ на яго відавочны — хочам мы таго ці не, але менавіта ад іх, уласнікаў, і залежыць захаванне помнікаў. Рыгарызм у гэтай сферы здатны яшчэ больш зменшыць іхнюю інвестыцыйную прыцягальнасць — і, што зусім немінуча, павялічыць і без таго немалы лік "нічыйных" аб'ектаў. Будзе як у Індыі са святарнымі каровамі: іх там вельмі шануюць і ні ў якім разе не крыўдзяць, але пры гэтым таксама і не даглядаюць…

Напрыканцы пасяджэння быў агучаны факт: сядзібны ансамбль у Снове больш не выкарыстоўваецца і неўзабаве пойдзе з малатка. Шыкоўны класіцыстычны комплекс, які доўгі час быў закрыты для наведвання, бо належаў сілавым ведамствам, можна будзе купіць менш чым за паўмільёна рублёў. Прычым супрацоўнікі Міністэрства культуры нават не спадзяюцца, што аўкцыён будзе з першага разу вызначаны. А між тым, у палацы ўжо, як кажуць, пачынае працякаць дах… Гэта, уласна, да таго, што дапаўненні — усё ж не самая вялікая на сёння праблема ў сферы аховы спадчыны.

Лічбавы падыход

Лён, навука і дзве стаўкі

Нягледзячы на невысокія заробкі ў сферы культуры, заўсёды ёсць магчымасць іх, можа, і не надта істотна, але павысіць. Дарэчы, так робяць не толькі работнікі культуры Беларусі.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Першы з варыянтаў — падпрацоўкі. Скажам, адзін знаёмы клубны работнік са Столінскага раёна ў вольны ад асноўнай працы час адкрыў у сабе талент тамады і цяпер проста "на расхват" на мясцовых вяселлях. Іншы — дырэктар сельскага клуба з Ваўкавыскага раёна Гродзенскай вобласці — прафесійна здымае самыя розныя ўрачыстасці, якія ладзяцца ў ягоным паселішчы, у першую чаргу, вясельныя картэжы ды святочныя імпрэзы ў сем'ях. Натуральна, абодва знаёмцы аформлены як індывідуальныя прадпрымальнікі.

Такім жа шляхам ідуць і расійскія калегі. Напрыклад, як адзначыў "К" заснавальнік Іркуцкага таварыства беларускай культуры імя Яна Чэрскага і сябар Іркуцкага беларускага клуба "Крывічы" Алег Рудакоў, падпрацоўкі для яго — справа будзённая.

— Таварыства працуе на грамадскіх пачатках, таму ўсе нашы вандроўкі ў Беларусь, на фэсты беларускай культуры ў Расіі, на міжнародныя канферэнцыі, адбываюцца за свой кошт, — адзначыў візаві. — Таму даводзіцца займацца бізнесам, напрыклад, гандляваць аршанскім ільном у Іркуцку. Праўда, цяпер справа ідзе значна горш, бо Аршанскі льнокамбінат падняў кошты, а магчымасці жыхароў Іркуцка і вобласці істотна зменшыліся.

Часам "перакваліфікоўваецца" ў тамаду яшчэ адзін мой знаёмы з Расіі — загадчык Ржаніцкага СДК, кіраўнік сямейнага фальклорна-этнаграфічнага ансамбля "Гарошыны" і вядучы метадыст па фальклоры Бранскага абласнога метадцэнтра "Народная творчасць" Іван Булаткін, хоць яму гэта і не надта даспадобы. Але што рабіць, калі трэба грошы?

Іншы шлях павялічыць заробак — удзельнічаць у дзейнасці сваёй установы культуры не толькі падчас працоўнага часу, а і пасля яго. Скажам, як я ўжо калісьці згадваў, супрацоўнікі Лельчыцкай раённай дзіцячай бібліятэкі спачатку рыхтуюць, а пасля разам з дзецьмі ладзяць лялечныя спектаклі на сцэне раённага Цэнтра культуры і народнай творчасці. За гэтую дадатковую працу маюць пэўныя даплаты да службовага акладу, бо імпрэзы — платныя і яны таксама папаўняюць "скарбонку" платных паслуг для аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі.

Акрамя таго, як вядома, у многіх рэспубліканскіх і раённых музеях краіны тыя супрацоўнікі, якія актыўна займаюцца навукова-даследчай дзейнасцю, выступаюць на канферэнцыях з дакладамі і друкуюцца ў навуковых часопісах, таксама маюць пэўную дадатковую "капейчыну" да асноўнага заробку.

Ды, кажа былы дырэктар Браслаўскага раённага аб'яднання музеяў і былы загадчык філіяла Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка, а цяпер спецыяліст па экскурсійнай рабоце агенцтва "Беларустурыст" Надзея Дударонак, тут ёсць нюансы. "Даплата за ўдзел у раённай ці рэспубліканскай канферэнцыі можа быць адна, а ўжо за актыўную працу на міжнародным мерапрыемстве — іншая, — адзначыла суразмоўца. — Прынамсі, летась, калі я працавала кіраўніком аб'яднання музеяў, даплаты супрацоўнікаў, якія займаліся навукай, вар'іраваліся ад 10 да 40 % ад акладу з улікам названага".

Яшчэ адзін шлях павялічыць заробак у культуры — уладкавацца працаваць на паўтары ці нават дзве стаўкі, як гэта звычайна і робяць многія супрацоўнікі сферы культуры, асабліва тыя, якія працуюць у дзіцячых школах мастацтваў. Пры падобнай умове зарабіць 600 — 800 рублёў для выкладчыкаў ДШМ не складае вялікіх праблем. Такія выкладчыкі, дарэчы, могуць зарабляць больш за дырэктара школы, у якой яны працуюць, бо ён двайной стаўкі сабе дазволіць, натуральна, не можа.

Іншая справа, што тыя паўтары — дзве стаўкі — не толькі рэальныя грошы, але і значная перапрацоўка па часе. Зразумела, не ўсялякі пагадзіцца праводзіць дзень у школе, пераходзячы з класа ў клас і даючы ўрок за ўрокам… К

Музеі не спяць дзеля попыту на... музеі

Што прапануюць установы ў спецпраграмах і якую матэрыяльную ды іміджавую карысць з таго маюць

Міжнародны дзень музеяў, які адзначаецца 18 мая, ужо ва ўсім свеце прынята святкаваць начнымі ці хаця б вечаровымі мерапрыемствамі. Першапачатковая задума гэтай акцыі — працаваць для ўсіх бясплатна і ў нязвыклы час, каб прыцягнуць да сябе ўвагу і займець новых наведвальнікаў — у большасці беларускіх музеяў паступова трансфармавалася ў гульнёвыя забаўляльныя праграмы, кошты на якія часам здзіўляюць не вельмі прыемна. Па што прыходзяць людзі на Ноч музеяў і як гэта дапамагае жыць самім установам, "К" высвятляла разам з супрацоўнікамі тых з іх, што знаходзяцца ў рэгіёнах рэспублікі.

Вераніка МОЛАКАВА

Паліна ХАРУТА,
спецыяліст па арганізацыі мерапрыемстваў і рэкламе Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка "Нясвіж":

— Мы ўжо правялі Ноч музеяў 13 мая. Нас наведала 432 чалавекі, і мы гэтай лічбай задаволеныя. Знаходзімся далёка ад буйных гарадоў, таму выбіралі дату так, каб было зручна нам і каб нікому не даводзілася выбіраць — ехаць ці заставацца дома.

Важна, каб людзі не проста маглі наведаць замак, а ўбачылі нейкую праграму. Звычайна мы прытрымліваліся тэматыкі XVI — XVIII стагоддзяў, але сёлета вырашылі прапанаваць наведвальнікам эпоху 1920 — 1930-х — напярэдадні адкрыцця выставы "Заходняя Беларусь: гісторыя паўсядзённасці", прысвечанай гэтаму часу. У нас працавала мноства фотазон, стаялі рэтраўтамабілі, граў джаз-бэнд, выступаў Віктар Шалкевіч, рэчы кшталту пасядзець на цвіках прапанаваў музей "Эксперыментум", у дворыку паказвалі нямое кіно. Наведвальнікаў мы прасілі апрануцца ў касцюмы той эпохі, і літаральна ва ўсіх, калі не касцюм, дык хаця б матылёк ці капялюш быў.

На праграмы Ночы музеяў кошт білета заўжды крыху павышаем, бо рыхтуем для ўсіх гасцей падарункі — салодкія пачастункі ці прыемныя дробязі, таму пра прыбытак ці нейкую фінансавую карысць тут казаць не выпадае. Прафесійным артыстам, якіх запрашаем, таксама ж трэба заплаціць. Для нас правесці Ноч музеяў — гэта перш за ўсё традыцыя і пытанне іміджу. Мы далучыліся да акцыі ў 2011 годзе, і цяпер людзі яе чакаюць, загадзя цікавяцца праграмай. Наведвальнікаў вабіць тое, што ў іх ёсць магчымасць трапіць у тыя часткі замка, якія звычайна зачыненыя — на валы, у падвал ці падземныя хады. Не трэба хадзіць за экскурсаводам, можна забаўляцца — гэта цікава і нясвіжцам, але больш усё ж такі турыстам, таму будзем думаць, як яшчэ прыцягваць увагу мясцовых жыхароў. Многія наведвальнікі, як аказалася, чакаюць маштабнай і працяглай рэкламы, але ж, пагадзіцеся, няма сэнсу год круціць паўсюль інфармацыю пра адну Ноч музеяў.

Летам па нядзелях арганізуем дадатковыя праграмы з квэстамі для дарослых і дзяцей — так мы працуем з індывідуальнымі наведвальнікамі. Яны могуць не спяшаючыся аглядаць замак і застацца ў нас у дворыку, каб паглядзець на рыцараў ці памаляваць з дзецьмі, а ў груп ад турфірм усё разлічана па часе. Нейкія дадатковыя імпрэзы арганізуем у несезонны для турыстаў час, але тых, каму гэта ў прынцыпе нецікава, нічым не прывабіш, а тыя, хто хоча, цікавяцца самі, і ўжо ад іх інтарэсаў мы і адштурхоўваемся.

Зараз спрабуем "вяртаць" людзей да нас у замак, напрыклад, конкурсамі відэаролікаў. Летась людзі здымалі на відэа, як праводзілі час у Ноч музеяў, і дасылалі нам, а мы абвясцілі галасаванне ў інтэрнэце і ўзнагародзілі пераможцаў. Тры фіналісты паехалі ў тур па Беларусі і атрымалі сертыфікат на ўдзел у нашым квэсце. Падчас калядных святаў мы прапанавалі здымаць святочныя ялінкі. Працягнем такую практыку, бо людзі праводзяць у нас час, фактычна пакідаюць відэаводгук, а потым вяртаюцца зноў. Тое, што мы зараз самаакупны музей, не азначае, што так будзе заўжды — трэба над гэтым увесь час працаваць.

Дзмітрый МАНКЕВІЧ,
загадчык сектара па экскурсійнай працы замкавага комплексу "Мір":

— У гэты перыяд усе музеі гудзяць, але мы 18 мая не чакалі ў сябе такога ж вялікага наплыву наведвальнікаў, як тое назіраецца ў Мінску. Праводзіць Ноч музеяў — добрая традыцыя, а мы прыхільнікі традыцый. Адкрылі выставу літоўскага мастака Раманаса Барысаваса, правялі канцэрт камернага аркестра "Рэзананс", інтэрактыўную праграму "У госці да Пане Каханку" разам з цыганскім ансамблем, вучылі наведвальнікаў мове ераў і мушак. Сёлета ўпершыню зрабілі свабодны ўваход, таму што раней неаднаразова даводзілася тлумачыць турыстам, чаму ў такі дзень ім трэба плаціць. Вырашылі, што гэтага лепш пазбегнуць.

За год да нас прыязджае каля 100 тысяч людзей. 7 мая ў нас была рэкордная колькасць экскурсій за дзень — 110. Мы ніяк спецыяльна не заахвочвалі нас наведаць — проста ў людзей вялікія выхадныя, быў час кудысьці паехаць. Падчас навагодніх ці вясновых школьных канікул таксама прыязджае шмат турыстаў. Калі мы ведаем, што турыстычная плынь пойдзе на спад у сакавіку ці ў нейкія восеньскія дні, тады робім спробы прыцягнуць да сябе ўвагу інтэрактыўнымі спектаклямі ці

Тоўстая і тонкая, з малюнкамі і без

Вопыт бібліятэкара: што ўсвядоміў яшчэ Скарына, але не ўсе сучасныя выдаўцы

З нагоды 500-годдзя беларускага кнігадрукавання усе, хто мае хоць нейкае дачыненне да кнігі, абмяркоўваюць яе мінулае, сучаснае і будучае. Да гэтага абмеркавання хачу далучыцца і я — просты бібліятэкар адной з дзіцячых бібліятэк Мінска. Нагодай для гэтага артыкула стала выказванне аднаго літаратара, што кніга, у тым ліку і дзіцячая, абавязкова павінна быць тоўстай.

Кожны дзень, назіраючы за выбарам кніг дзецьмі розных узростаў і іх бацькамі, з упэўненасцю кажу: дзіцячая кніга ні ў якім разе не павінна быць тоўстай! Гэта падлеткі, што чытаюць, на знешнасць і памер кніг увагі не звяртаюць, а кніжныя серыялы, дзе дзеяннне пераходзіць з адной часткі ў наступную, вабяць іх нібы магніт і прачытваюцца за два-тры месяцы (пацвярджэннем — серыі Наталлі Шчэрба, Яўгена Гаглоева, Рыка Рыардана, Джаан Роўлінг, Эрын Хантар, Кэтрын Ласка, дзе сумарная колькасць старонак даходзіць да некалькіх тысяч). Падлетка ж, што не чытае, на жаль, ніякая сіла не прымусіць звярнуцца да кнігі. А такі падлетак вырастае з маленькага дзіцяці, якога па нейкіх прычынах не далучылі да кнігі. І тут паўстае пытанне: дык якой жа павінна быць кніга для малога дзіцяці, каб яно палюбіла чытаць? Пачнём разбірацца яшчэ з тых, хто не чытае сам, а толькі слухае.

Яркая, з малюнкамі

Не сакрэт, што дзеці ў першую чаргу звяртаюць увагу на нешта яркае, прывабнае, незвычайнае, і кнігі тут не выключэнне. Таму першае, што павінна зрабіць кніга — звярнуць на сябе ўвагу, пачынаючы з вокладкі, каб ручкі дзіцяці самі пацягнуліся да яе. Пажадана, каб такую ж самую рэакцыю зведалі і дарослыя. Напрыклад, кніга "Беларуская азбука ў малюнках" — яркая аранжавая вокладка адразу кідаецца ў вочы і вабіць да сябе. А яшчэ яе можна даваць самым маленькім дзеткам, не баючыся, што яны парвуць старонкі, бо яны кардонныя.

Другое — колькасць малюнкаў. Іх у беларускіх (і асабліва беларускамоўных) дзіцячых кнігах страшна бракуе. Сустракаюцца кнігі для малых дзяцей, дзе на працягу сямі-дзесяці лістоў няма ніводнага малюнка, нават маленечкага. Такая кніга, якая б цікавая яна ні была, не прывабіць ні дзіця, ні яго бацькоў. "Малюнкаў няма — не будзе слухаць", — выраз, які я чую па некалькі разоў на тыдзень. Намаляваныя героі павінны суправаджаць чытача на працягу ўсёй гісторыі, а не зрэдку, нібы гуляючы ў хованкі, нясмела выглядаць з-за радкоў.

Да ўсяго, на паліцах бібліятэк пыліцца шмат цікавых кніг з захапляльнымі сюжэтамі і незвычайнымі героямі, з вострымі момантамі і жартамі, але — без ілюстрацый. Колькі бібліятэкар ні даводзіў бы, што кніга цікавая, чытаецца лёгка, яна застаецца ў бібліятэцы, а дадому бяруцца зусім іншыя. Апошнім часам нават знакамітыя Нязнайка, Карандаш і Самадзелкін, Карлсан, Баранкін застаюцца ў бібліятэцы, бо выданні старыя, непрыгожыя і амаль што без малюнкаў. Прычым сучасны наведвальнік бібліятэкі, і маленькі, і дарослы, патрабуе ілюстрацый менавіта рознакаляровых, а не шэра-чорных, якія менавіта для дзіцячых кніг асабліва ўпадабалі некаторыя нашы выдаўцы.

Менш тэксту — больш малюнкаў

Урэшце, маленькае дзіця яшчэ можна зацікавіць зместам, няхай кніга і не надта прывабная вонкава. "Ён малюе, канструктар складае ці ў ложку ляжыць — засынае", — дзеляцца досведам маладыя мамы, калі чытаюць кнігу без малюнкаў. А вось што рабіць з чытачамі-пачаткоўцамі? Кніга без малюнкаў іх не проста пужае — яна адштурхоўвае ад сябе. Але ж і аднымі малюнкамі такога чытача кніга не прывабіць. Тут паўстае шмат нюансаў знешняга афармлення.

Па-першае, памер літар і інтэрвал паміж радкамі. Што, дарэчы, актуальна для любога чытача, незалежна ад веку. Яркім прыкладам папулярнасці кніг з вялікім шрыфтам з'яўляецца серыя кніг Холі Вэб пра кацянят і шчанят. Кранальная выява звяркa на вокладцы, вялікія літары і інтэрвалы паміж радкамі (плюс тыя ж самыя малюнкі, няхай і некаляровыя) робяць кнігі мегапапулярнымі сярод малодшых школьнікаў, хоць па змесце яны падобныя адна да адной і не вылучаюцца асаблівай арыгінальнасцю. Тое ж самае датычыцца і кніг з серыі "Лес дружбы" Дэйзі Медоус.

Далей — аб'ём тэксту на старонцы. Пытанне вельмі спрэчнае. Адны выступаюць за поўнатэкставыя кнігі, іншыя ж нават падручнікі па гісторыі, алгебры, хіміі, астраноміі пішуць у коміксах. (Дарэчы, новая кніга "Грашовая азбука" ў форме коміксa адразу выклікала цікавасць з бо-

Аднымі з першых Ноч музеяў сёлета правялі ў Нацыянальным гісторыка-культурным музеі-запаведніку "Нясвіж". / Фота прадастаўлена Установай

выступамі калектываў, але гэта не мае належнага эфекту. Таму важна проста своечасова планаваць сваю дзейнасць, а не старацца выключна здзівіць.

Ноч музеяў, безумоўна, магчымасць яшчэ раз сябе прарэкламаваць, але няма неабходнасці рабіць штосьці падобнае часта, каб закрыць адносна "пустыя" дні. Мы стараемся, каб усім, хто да нас прыязджае, у нас спадабалася, і яны расказалі пра гэта камусьці яшчэ — гэта самая надзейная рэклама, якая працуе лепш за ўсё.

Калі ў Міры праводзяцца рыцарскія турніры ці канцэрты "Песня года" і інфармацыя пра гэта распаўсюджваецца загадзя, безумоўна, для нас гэта мае вялікі эфект — плынь турыстаў павялічваецца, бо пасёлак наведвае каля 10 тысяч людзей у дзень і ім хочацца паглядзець усё. З музейных падзей вялікая цікавасць назіраецца да калядных баляў — праводзіць іх стала штогадовай традыцыяй менавіта з-за попыту: цікава ж прыехаць на баль у сярэднявечны замак, прыгожа апрануцца.

Ваганнем кошту білета мы ніколі нават і не спрабавалі прыцягваць наведвальнікаў. Стараемся заўжды трымаць крыху меншы ўзровень за Нясвіжскі гісторыка-культурны запаведнік. Нядаўна крыху павысілі кошт — цяпер наш білет можна набыць за 12 рублёў. Апошні аўторак кожнага месяца — бясплатны дзень наведванняў, і ён заўжды вельмі насычаны, хаця экскурсіі праводзім платна.

Вольга БАБРОЎНІК,
выконваючая абавязкі дырэктара Рэчыцкага краязнаўчага музея:

— Правесці мерапрыемства нават увечары, а не тое што ноччу ў нас няма магчымасці, таму 19 мая прапанавалі наведвальнікам дзённую праграму ў нашым музеі і ва ўнутраным дворыку з 14.00 да 19.00 — майстар-класы па стварэнні мультфільмаў, працы з саломкай ці паперай, выставы, кірмаш народных майстроў. Уваход быў вольны. Платныя толькі квэсты-экскурсіі ўнутры музея, іх кошт не змянялі. Завяршылася ўсё канцэртам навучэнцаў дзіцячай школы мастацтваў і выхаванцаў Цэнтра творчасці дзяцей і моладзі з 18.00 да 19.00. Потым правялі яшчэ квэст-экскурсію па горадзе.

За год да нас прыходзіць каля 24 тысяч гасцей. Хочацца заўжды бачыць больш наведвальнікаў, але народ складана ўзняць. Наша асноўная аўдыторыя — гэта школьнікі і мясцовыя жыхары. Мы сябе сярод іх і рэкламуем, арганізуем новыя выставы, але тэматыка нашага музея такая, што амаль усе ў Рэчыцы асноўную экспазіцыю ўжо бачылі, а зменныя выставы цікавыя не ўсім. Актыўна людзі рэагуюць толькі на штосьці прынцыпова новенькае. Напрыклад, экскурсійны квэст "Перапалох у музеі" — адна з нашых апошніх прапаноў, таму на яго прыходзяць, бо гульнёвая форма прываблівае. Ноч музеяў праводзім не ў першы раз, таму людзі ўжо да гэтага прызвычаіліся, і хаця праграма заўжды розная, больш наведвальнікаў ад гэтага ў нас не становіцца.

Юрый ЗЯЛЕВІЧ,
дырэктар Музея-сядзібы "Пружанскі палацык":

— У нас 19 мая адбыўся фестываль эксперыментальнага мастацтва "Рэха Даху-V". Музей працаваў да гадзіны ночы. Уваход быў па стандартным білеце, які каштуе ад паўтара да двух з паловай рублёў. Зусім бясплатна ўсё ж такі не можам праводзіць такія мерапрыемствы — ёсць пэўныя выдаткі на электрычнасць і іншыя гаспадарчыя справы.

"Рэха Даху" — гэта падзея на мастацкім фронце і адно з галоўных мерапрыемстваў года ў нашым музеі, бо не часта са сталіцы да нас прыязджаюць навукоўцы, мастакі, музыканты. Фестываль праходзіць у Пружанах ужо пяць гадоў запар і сёлета супаў па часе з Ноччу музеяў, але яе мы заўжды стараемся праводзіць арыгінальна, каб гэта было эфектыўна і цікава для нашых наведвальнікаў.

Падчас правядзення міжнароднай акцыі музеі павінны па ідэі працаваць ноччу і бясплатна, але ў апошні час Ноч музеяў шмат дзе відавочна скіраваная ў камерцыйную плынь. Зразумела, што зараз гэта яшчэ і дадатковы піяр, але музей усё роўна павінен заставацца музеем, таму яго задача — не перагнуць палку ў атракцыях, знайсці мяжу паміж імі і сваёй эматыкай. Напрыклад, арганізоўвалі Ноч здароўя, прысвечаную нетрадыцыйнай медыцыне — расказвалі пра лячэнне ароматэрапіяй і гэтак далей, але і пра арт-тэрапію не забыліся.

Заканчэнне — **на старонках 6 — 7.**

ку нашых чытачоў, а яе "калегі", хоць яны і з малюнкамі, не вельмі запатрабаваныя.) Да ўсяго, расійскія выдавецтвы апошнім часам усё часцей прапануюць кнігі для дзяцей амаль без тэксту — старонкі запоўнены адным вялікім ці некалькімі маленькімі малюнкамі плюс два-тры сказы на старонцы. Кошт выданняў не меншы, чым у поўнатэкставых кнігах, а то і большы. "За што тут плаціць? Навошта выдаваць такія кнігі? Выдавецтвы проста грошы з нас выцягваюць?" — чулася раней ад бацькоў. Але, як паказала практыка, менавіта такія кнігі найбольш папулярны сярод і маленькіх слухачоў, і маленькіх чытачоў, прычым не толькі пачынаючых. Серыі кніг "Кацяня Шмяк", "Мімба-Джымба", "Жылі-былі трусы", "Міка і Міміка" і іншыя ніколі не затрымліваюцца на палічках у бібліятэцы.

А што з падобнымі выданнямі на беларускай мове? Ёсць яны і ў нас, толькі вельмі мала. Гэта серыі кніг "У свеце казак" (выдавецтва "Харвест") і "Казка за казкай" ("Мастацкая літаратура"). Маленькія, зручныя, кнігі выдадзены па прынцыпе адна беларуская ці руская народная казка — адна кніга, што даспадобы чытачам-пачаткоўцам.

Летась "Мастацкая літаратура" парадавала выданнем серыі кніг балгарскай пісьменніцы Галіны Злацінай "Прыгоды на Сонечнай ферме". Яркія, маляўнічыя тоненькія кніжкі з фігурна выразанымі старонкамі, дзе ўсю прастору займаюць цудоўныя малюнкі і крышачку тэксту, не залежваюцца на паліцах стэлажоў. Увесь час вандруюць па дамах чытачоў і кнігі Сяргея Давідовіча "Залаты буліт" і "Баявая нічыя", выдадзеныя таксама ў "Мастацкай літаратуры". Крыху раней з малой колькасцю тэксту ў "Галіяфах" у падсерыі "Каляровы ровар" выйшла кніга цудоўных казак "Сумны суп" Вольгі Гапеевай (іншыя кнігі для дзяцей з гэтай падсерыі таксама вартыя ўвагі). Зусім новая цудоўна афармленая кніга Надзеі Бука "Бася і Піглас". Вельмі парадавала серыя "Бібліятэка часопіса "Вясёлка" — прыгожыя, яркія, выдадзеныя на белай шчыльнай паперы з цудоўнымі малюнкамі на кожнай старонцы, зручнага аб'ёму і фармату.

Але, на жаль, падобных кніг у беларускамоўнай літаратуры бракуе. Кнігі, якія адпавядаюць прынцыпу "менш тэксту — больш яркіх малюнкаў", якія так запатрабаваны ў дзяцей, не папулярныя ў беларускіх кнігавыдаўцоў.

Затое, відаць, танныя…

Яшчэ адной неад'емнай рысай добрай дзіцячай кнігі з'яўляецца шчыльная белая папера. Адно мінскае выдавецтва выпусціла ў свет серыю кніг для пазакласнага чытання для малодшых школьнікаў, у якіх тэкст можна чытаць адначасова і з аднаго, і з другога боку ліста. Літары зліваюцца, чытаць цяжка, зрок псуецца. Затое, відаць, танныя.

І скрозь усе крытэрыі чырвонай стужкай праходзіць аб'ём і памер кнігі. Вялікія, у памер аркуша А4, але не тоўстыя кнігі ў пашане сярод малых дзетак і малодшых школьнікаў. Папулярныя і кнігі нестандартнага памеру — квадратныя, круглыя, выцягнутыя ў даўжыню ці вышыню. Толькі не тоўстыя. Такія пужаюць малога сваімі аб'ёмамі, да таго ж яна яшчэ і цяжкая, яе нават нязручна трымаць у руках. А бывае і такое, што тоўсты зборнік у дзвесце-трыста старонак, ды яшчэ фармату А4, другакласніку трэба несці ў школу, каб там пачытаць маленечкае апавяданне ці вершык. Яшчэ Францыск Скарына ўсвядоміў, што кніга павінна быць невялікая і нятоўстая, так яна больш зручная ў выкарыстанні.

Вядома, ёсць дзеці, якія ў другім-трэцім класе ўжо чытаюць Гары Потара альбо раманы Жуля Верна. Яны не звяртаюць увагу ні на памер літар, ні на адсутнасць малюнкаў, а вяртаючы падобныя кнігі ў бібліятэку з захапленнем расказваюць, як ім было цікава і як яны чыталі кожную вольную хвіліну. Але ж гэта ўсяго толькі выключэнне з агульнага правіла.

У суме вялікія літары, малая колькасць тэксту на старонках і невялікі аб'ём кнігі дазваляюць хутчэй яе прачытаць. Тое асабліва важна для дзяцей, якія толькі пачынаюць авалодваць гэтым навыкам. Чым хутчэй дзіця прачытае кнігу, тым больш задавальнення і асалоды атрымае ад усведамлення: гэта зроблена самастойна. Тады малеча хутчэй пачне чытаць чарговы твор, каб зноў сказаць: "Я прачытаў сам!" Балазе калі бачны канец, любая справа робіцца хутчэй. Паступова дзіця пяройдзе на больш змястоўныя і тоўстыя кнігі, а з цягам часу з яго атрымаецца выдатны чытачы падлетак.

Пацверджаннем гэтаму з'яўляюцца папулярныя і ўлюбёныя малодшымі школьнікамі серыі пра Ката да Вінчы, Алёшу Папова, неандэртальскага хлопчыка, Агату Містэры, "Тайну кватэры № 8"… Пералічаныя кнігі не надта і маленькія, аб'ём некаторых з іх каля двухсот старонак, але ж палову іх займаюць ілюстрацыі. А вялікія літары дазваляюць хутчэй перагортваць прачытаныя старонкі. Такім чынам, дзіця паступова прывыкае да аб'ёмных кніг і вялікіх гісторый. З часам неабходнасць у малюнках знікне, а любоў да чытання захаваецца.

Мова кніг — беларуская ці руская — пры выбары стаіць на апошнім месцы. Упадабаныя кнігі малыя дзеці будуць слухаць і чытаць на любой з іх. Яскравым прыкладам таму з'яўляюцца перакладныя беларускамоўныя кнігі пра Маму Му Юі Віспандэр і Фінудса ды Пэтсана Свэна Нурдквіста. У нашай бібліятэцы іх бяруць нават тыя, хто ніколі ніводнай кнігі на беларускай мове не ўзяў.

■■■

Ну а калі кнігі выбраныя, дома іх пачнуць чытаць. Калі гісторыя захопіць з першых старонак, яе дачытаюць да канца. Але ж гэта залежыць ад майстэрства пісьменніка. Каб кнігу ўзялі ў бібліятэцы ці набылі ў кнігарні, існуе шмат крытэрыяў, а вось каб дачыталі да канца — толькі адзін.

Марына ПЕТРАШКЕВІЧ,
бібліятэкар Дзіцячай бібліятэкі № 8 горада Мінска

Дзяжурны па нумары

17-е месца як перамога

Колькі гадоў таму, шукаючы абгрунтаванне прычын аб'яднання раённых і абласных аддзелаў культуры і ідэалагічнай работы, прыйшоў да высновы, што галоўная задача дзяржаўнай ідэалогіі — кансалідацыя грамадства. Гэтаксама як і культуры. Бо нават вузкарэгіянальная культурная з'ява ў далёкай ад сталіцы палескай вёсачцы сведчыць пра разнастайнасць і багацце агульнанацыянальнай культуры не менш за пастаноўкі ў оперным ці драматычным тэатрах.

Кастусь АНТАНОВІЧ

Менавіта таму выступленне нашых прадстаўнікоў на сёлетнім конкурсе "Еўрабачанне" ў Кіеве выклікала ў грамадстве не толькі захапленне выканальніцкім майстэрствам гурта NaviBand, але і гонар за годную прэзентацыю Беларусі свету. І не англамоўнымі спевамі, не айчыннай фірмовай гарэлкай, а родным беларускім словам, прыязнымі і ўсмешлівымі спевакамі, роднымі матывамі ў промапрадукцыі і афармленні сцэны.

У сацыяльных сетках даводзілася чытаць здзіўленыя допісы сяброў, уражаных не столькі выступленнем NaviBand, як ад начных спеваў "Гісторыі майго жыцця" з суседніх паверхаў і пакояў. Пацвярджае тую народную згуртаванасць і інфармацыя пра калектыўны спеў гэтай песні пасажырамі рэйса "Белавія" з Кіева ў Мінск. І масавы ды даволі нечаканы флэш-моб пацалункаў нашых закаханых суайчыннікаў у падтрымку гурта.

Дагэтуль адносна і больш лакальна вядомы гурт здолеў аб'яднаць не толькі моладзь. Сваякі і знаёмыя сярэдняга і старэйшага ўзросту толькі і казалі ў суботу, што пра ўдзел беларусаў на "Еўрабачанні", хоць раней і не глядзелі той конкурс. І нават сваю першую спробу ставак у букмекерскіх канторах рабілі менавіта праз NaviBand. Гэты малады гурт падтрымалі і іх калегі — спевакі абсалютна розных жанраў і кірункаў, ствараючы каверы песні ды ўсяляк рэкламуючы яе. Прыемнай стала і падтрымка гурта беларускай супольнасцю замежжа, якая не толькі агітавала галасаваць за наш гурт сваіх цяперашніх суграмадзян, але і сама гэта актыўна рабіла.

Людзі розных перакананняў былі аб'яднаныя чаканнем перамогі. І самае цікавае, што 17 месца, калі і выклікала расчараванне, то хіба невялічкае. І не з-за таго, што "нашы як заўсёды на большае не здатныя". А таму, што гэта не спартыўнае спаборніцтва, а творчы конкурс, дзе галоўнае не перамога, а яскравае сведчанне сваёй самабытнасці і арыгінальнасці.

Калі такое было раней? Згадваецца хіба драматычная перамога нашай хакейнай зборнай у далёкім 2002 годзе ў чвэрцьфінале Алімпійскіх гульняў над шведамі. Тады беларусы познім вечарам з фінальнай сірэнай выйшлі на вуліцы сваіх гарадоў святкаваць перамогу, захопленыя самаадданасцю нашых хакеістаў, а пасля з тыдзень абмяркоўвалі тую падзею сярод сяброў ды калег. Але тое спорт. Са сферы культуры згадваецца ўдзел Юры Дзямідовіча ў дзіцячым "Еўрабачанні" з арыгінальнай песняй "Чароўны трусік", якая хоць і не ўпісалася ў еўрафармат, але здолела аб'яднаць многіх беларусаў. А ўдзел айчыннага фільма "У тумане" ў Канскім кінафестывалі? Тая знакавая падзея захоўваецца ў памяці не толькі кінематаграфістаў, але і шырокай грамады ды і цяпер выклікае гонар. Хай сабе і з меншым ахопам публікі, але прымусіў ганарыцца айчыннай культурай і наш удзел у Венецыянскім біенале, які сцвердзіў, што кансалідаваць народ можа не толькі масавая культура.

Гэтыя прыклады сведчаць пра адно: беларусы могуць быць скансалідаваныя толькі праз беларускасць. І гаворка не толькі і не столькі пра беларускую мову. Хутчэй — пра нашу натуральнасць, калі сваё роднае выклікае гонар за краіну — тое, што характэрна і палякам, і французам, і іспанцам… Кожнаму народу, які паважае сябе.

К

Сярод нядаўніх лаўрэатаў Дзяржаўнай прэміі Беларусі — салістка нашага Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета, заслужаная артыстка краіны, пераможца сямі міжнародных конкурсаў Аксана ВОЛКАВА. Яе спеўнае майстэрства даўно прызнанае не толькі ў нас, але і ў замежжы — ад Масквы да Лондана і Нью-Ёрка, куды яе пастаянна запрашаюць для ўдзелу ў асобных пастаноўках і фестывалях. З параўнанняў "тут і там", "у нас — у іх" і пачалася наша размова.

Надзея БУНЦЭВІЧ

Аксана Волкава.

Яна паўсюль!

Аксана Волкава: сола і "ў ансамблі"

— Рознымі з'яўляюцца самі тыпы тэатраў. Наш тэатр адносіцца да так званых рэпертуарных, што распаўсюджаны, бадай, на ўсёй постсавецкай прасторы і ўтрымліваюць у афішы адначасова безліч спектакляў. На Захадзе існуе іншая схема: усе працуюць выключна на адну прэм'еру, ніхто паралельна не заняты іншым рэпертуарам. Другое прынцыповае адрозненне ў тым, што калі справа тычыцца нейкіх тэхнічных момантаў, працы тэхнічных службаў, там няма слова "нельга". Жывы агонь? Калі ласка. Найскладаныя канструкцыі на сцэне? Няма праблем. А ў нас на ўсе рэжысёрскія фантазіі ёсць іншы звыклы адказ: забаронена паводле тэхнікі бяспекі. Але я пастаянна сутыкаюся з парадоксам: усё тое, што ў нас "забаронена" — у замежных тэатрах чамусьці дазваляецца. Увогуле, адным з апошніх трэндаў у сусветнай сцэнаграфіі стала максімальнае ўжыванне не бутафорыі і муляжоў, а натуральных рэчаў: жывога агня, вады, пяску, зямлі, келіхаў, каб звінелі… Гэта сапраўды заварожвае. Калі ж нават замест свечкі, якую без аніякай рызыкі мы запальваем і ў храме і дома, выкарыстоўваецца электралямпачка, гэта адразу зніжае ўражанне ад відовішча.

— А ўласна рэжысёрскія прыдумкі? Запытваю яшчэ і таму, што ўжо некалькі гадоў вы сумяшчаеце напружаны спеўны графік і сям'ю, дзе двое дзяцей, з заняткамі па класе опернай рэжысуры ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. Дык як — набраліся ў замежжы "авангардызмаў"?

— Нейкіх радыкальных пастановак у маёй выканальніцкай практыцы пакуль не было, а шкада. У той жа "Кармэн" мяне ніколі не прасілі зрабіць, да прыкладу, іншы характар, змяніць пластыку… Заўсёды адштурхоўваліся ад таго, што прапаноўваю ў маёй гераіні я. Але ў хуткім часе мяне чакае ўдзел у рыжскім спектаклі, дзе ўсё перанесена ў сучаснасць: хіп-хоп, татуіроўкі, шэры бетон, паўзмрок, банда… Мне цікавы такі паварот! Не люблю я выходзіць у цыганскай спадніцы — не арганічна гэта для мяне! Да таго ж, ёсць шмат артыстак, хто робіць гэта лепш, для каго цыганскія матывы, што называецца, у крыві. Вось вам, дарэчы, адрозненне нашай опернай рэжысуры ад заходняй: там часцей зыходзяць з канкрэтных салістаў, з таго, што ім бліжэй. Затое ў нас надзвычай глыбока распрацоўваюць псіхалагічныя дэталі, звяртаюць увагу выканаўцаў на тое, што думае іх персанаж у той ці іншы момант. Але ў мяне ўзнікае праваамернае пытанне: добра, я ведаю, што адчувае зараз Кармэн, а што — Хазэ. Ды толькі як нам гэта паказаць? Праз які жэст, рух ці нейкія іншыя дэталі данесці тыя патаемныя думкі сваіх герояў да гледача? А тым больш, у вялізнай опернай зале, каб быць зразуметым не адно ў партэры, але і на балконе? Вырашаюць гэту праблему не ўсе пастаноўшчыкі, так што даводзіцца шукаць самастойна.

— А калі рэжысёр не сочыць за далейшымі паказамі ці ён увогуле запрошаны і з'язджае пасля прэм'еры, дык салісты і ўвогуле змяняюць многія мізансцэны.

— Часцей гэта бывае не таму, што лянуюцца, а з-за неразумення ўчынкаў свайго героя. Бо рэжысёр кіруе звонку, а герой — у цябе ўнутры. І ты лепш адчуваеш, што менавіта ён можа зрабіць, а што — не. У мінулыя сезоны ў Вялікім тэатры Масквы ішла "Кармэн" англійскага рэжысёра Дэвіда Паўнтні, дзе было многа танцаў, элементаў бурлеску, але ў фінале Хазэ хапаў каханую за валасы і біў галавой аб парапет. Рэжысёр з'ехаў — і Кармэн пачала паміраць больш традыцыйным спосабам.

— Вы з гэтай гераіняй яшчэ з часоў навучання, калі ў канцэртах вельмі часта спявалі "Хабанэру", у тым ліку з Прэзідэнцкім аркестрам Беларусі. За гэтыя гады змянілася ваша ўяўленне пра Кармэн?

— У студэнцтве ў маёй Кармэн было многа ілюстрацыйнага: маўляў, паглядзіце на мяне! З часам, калі цябе "адпускаюць" уласна вакальныя пытанні, з'яўляецца творчая свабода, пачынаецца сапраўднае "жыццё" твайго персанажа. Асабіста мне ў гэтым вельмі дапамагае партнёр: калі ёсць паміж намі нейкая іскра, дык і жэсты самі нараджаюцца, і ў каханне глядач паверыць, і ў нянавісць. Тут вельмі важна, каб абодва героі былі вельмі моцнымі асобамі, і ўсё ж яна яго перамагае. А калі ты перамагаеш яго з першай ноты, дык і далей не надта цікава.

— Тыя канцэртна-сольныя прэзентацыі "Кармэн" вам неяк дапамаглі ў далейшым спасціжэнні гэтага вобразу?

— Любая канцэртная дзейнасць, асабліва ў пачатку кар'еры, вельмі важная. Аднакурснікі за маёй спіной, здаралася, кпілі: яна паўсюль, а мы… А я толькі таму была паўсюль, што, быццам кіношная Фрося Бурлакова, сама грукалася ва ўсе дзверы і прасіла: ну, вазьміце мяне! Я не хацела быць той "класнай" спявачкай, якая спявае толькі ў класе. Удзельнічала ва ўсіх студэнцкіх канцэртных брыгадах, выступаючы па шпіталях, дамах ветэранаў. Гэта вельмі важна, бо з'яўляецца "імунітэт", які дапамагае справіцца са сцэнічным хваляваннем, набыць вопыт выступленняў у любых умовах.

— Што самае важнае для станаўлення маладога вакаліста?

— Творчая асоба, якая будзе накіроўваць яго на правільны шлях. Спачатку гэта выкладчык — і мне вельмі пашанцавала, што я патрапіла ў клас Лідзіі Галушкінай, дзякуючы якой на выхадзе з Акадэміі музыкі ў мяне не было відавочных вакальных дэфектаў. А далей — праца з дырыжорам. Для мяне гэта быў Аляксандр Анісімаў, які ў той час працаваў у тэатры. На Захадзе вельмі распаўсюджаная сістэма майстар-класаў, але я лічу, што карыстацца гэтым трэба тады, калі ў цябе ўжо ёсць правільна сфарміраваная базавая ўстаноўка, на якую, бы на ёлку навагоднюю, ты можаш вешаць любыя ўпрыгожванні.

— А конкурсы?

— Мне заўсёды было ўсяго мала, хацелася большага. І муж увесь час стымуляваў: вось, ты нічога не робіш, на конкурсах нічога не атрымліваеш. Я нічога не атрымліваю? І панеслася… Разоў шэсць быў "ледзяны душ", але хутка я пачала разумець, што акрамя голасу вельмі цэніцца тое, як ты ім умееш валодаць, як абіраеш праграму. Гэта таксама неацэнны вопыт! Я вельмі ўдзячная, што мне дапамагалі і старэйшыя калегі (той жа Уладзімір Пятроў, які на двухтыднёвым конкурсе імя Глінкі ў Чалябінску пасяліў мяне ў сваёй маці), і муж, які і натхняў, і грошай на паездкі не шкадаваў.

— Дзякуючы яму, дарэчы, вы сталі Волкавай. Змена прозвішча неяк паўплывала на ўнутраны стан? Можа, і сапраўды з'явілася гэткая "воўчая хватка"?

— Я так хацела замуж, што калі мы прыйшлі ў ЗАГС падаваць заяву, была на ўсё згодна і на пытанне наконт змены прозвішча чыста механічна адказала "так". А потым задумалася: мяне ж ведаюць і любяць як Бондараву. Раптам стану Волкавай — ці не давядзецца ўсё пачынаць з пачатку? Але Васіль быў катэгарычны: "Пераходзіш на маё прозвішча ці мы развітваемся. На сцэне можаш называцца хоць Пупкінай, а ў сям'і — толькі Волкавай". — "Дык, можа, узяць падвойнае?" — "Ага, яшчэ патройнае прыдумай". Я тады заканчвала Акадэмію музыкі і нават паспела дыплом атрымаць на новае імя. Праўда, была смешная сітуацыя. У трупу тэатра мяне прынялі яшчэ на трэцім курсе. І вось прыходжу пасля вяселля, а там вывесілі загад аб размеркаванні партый на новы спектакль. Адна з маіх калег стаіць ля стэнда і абурацца: маўляў, што гэта такое — прызначана нейкая Волкава! Ды мы не ведаем такую, адкуль яна ўзялася? Я ёй ціхенька: "Гэта я". — "Прозвішча змяніла? Гэта ж крута! Ну, што такое Бондарава? Штосьці рамеснае, звязанае з вырабам бочак. А Волкава — гучыць. Адразу зразумела: дарогу ёй не пераходзь, бо загрызе".

— І што, даводзілася кагосьці "загрызці"?

— Ды не, я па натуры не баец — змагаюся толькі з сабой. Упэўнена, калі чалавек увесь час знаходзіцца ў стане барацьбы, з самага пачатку нацэлены на гэткае змаганне з усім і ўсімі, асабліва ў мастацтве, нічога добрага не атрымаецца. Калі адчуваеш сябе пакрыўджаным, лепш за справу не брацца: будзе штосьці не тое, не так. Можа, гены крыўды-помсты заразныя? І наадварот: калі з цябе сыходзяць праменні любові, дабрыні, калі палаеш творчасцю, энергіяй, дык усім гэтым таксама "заражаеш" астатніх — і набываеш не ворагаў, якіх трэба знішчыць-спаляліць, а паплечнікаў. Ну, а ўвогуле… Хочаш зрабіць добра — зрабі сам (пры ўмове, вядома, што сам у гэтым разбіраешся).

— Што яшчэ на сёння вы павінны "зрабіць самастойна"? Акрамя новых партый, новых спектакляў…

— Я дасягнула далёка не ўсяго, на што здольная: ніхто не ведае нас лепш, чым мы самі. Мяне не задавальняе, да прыкладу, тое, што я чалавек "апошняга моманту", жыву выключна "сёння і зараз". З аднаго боку, гэта добра, што я хуткая на пад'ём і гатова імгненна сесці ў самалёт і выратаваць спектакль хоць на краі свету. Але хацелася б больш доўгатэрміновага планавання — як у многіх іншых вядомых салістаў, калі планы, паездкі, запрашэнні распісаны на пяцігодзе наперад. У свой час муж зрабіў мне сайт, а я там не магу нават біяграфію сваю давесці да ладу, неяк структураваць інфармацыю, унесці апошнія сведчанні, рэгулярна адпраўляць у агенцтвы апошнія запісы, новыя фотасесіі.

— Усім гэтым, калі няма свайго адміністратара, могуць займацца блізкія — той жа муж.

— Ні ў якім разе! Так, ён куды больш арганізаваны, усё для мяне рабіў і робіць. Склаў, да прыкладу, табліцу маіх выступленняў: што, дзе, калі. Але даўнішні мой сольнік "Опера-мадэрн" быў цалкам на ім — і з-за гэтага мы часта сварыліся. Таму арганізацыйнымі пытаннямі цяперашняга вечара "Аксана Волкава — Solo" я займалася сама. Вася па характары таксама лідар, таксама выпускнік Акадэміі музыкі. І калі пачынае дапамагаць, дык яму трэба быць галоўным. Але мне трэба таго ж самага — быць галоўнай! Навошта тыя "спаборніцтвы"? Таму цяпер кожны займаецца сваёй справай: ён — сваёй фірмай, я — сваёй творчасцю.

— А сям'ёй, дзецьмі хто займаецца?

— Разам.

"Расправіўшыся" з дзіцячымі школамі мастацтваў і сярэднімі спецыяльнымі навучальнымі ўстановамі вуснамі дзеючых музыкантаў, што яшчэ і выкладаюць у іх, мы лагічна падабраліся да ВНУ. Змяняць сабе "К" не стала і зноў звярнулася да прафесіяналаў сцэны ў галіне музыкі, якія таксама навучаюць студэнтаў.

Алег КЛІМАЎ

Шанц для ўсіх

Аляксандр САПЕГА, бубнач гурта Apple Tea, старшы выкладчык кафедры духавой музыкі факультэта музычнага мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў:

— Радуе новае пакаленне студэнтаў. Яны працаздольныя, зацікаўленыя ў той сваёй будучыні, якую плануюць звязаць з прафесіяй музыканта. Больш азартныя ў вучобе, чым тыя, хто ў мяне займаўся гадоў пяць таму. І настырныя ў атрыманні інфармацыі, што праўдамі-няпраўдамі з мяне выпампоўваюць, ды я і сам з імі ахвотна дзялюся нейкімі сакрэтамі, бачачы, што "таемнае" падае на добрую глебу. Прыемна выкладаць такім людзям, якія словам "кулёк" наш ўніверсітэт не называюць, ва ўсялякім выпадку, пры мне. І я ганаруся тым, што… ну, добра, 99 % маіх гадаванцаў знаходзяць сябе ў музыцы. Прытым трапляюць да мяне не самыя суперадораныя — у самых дарога ляжыць у Акадэмію музыкі, або на нашу кафедру мастацтва эстрады — да майго "канкурэнта" па інструменце Аляксандра Старажука. Але ў цэлым якасцю выпускнікоў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, што да нас паступаюць, я задаволены. Выдатна, што менавіта там іх сапраўды прыстойна "нацягваюць". Заўважу, што мае калегі з

(Заканчэнне. Пачатак на старонках 4 — 5.)

Для нас далучыцца да акцыі — справа гонару. Перш за ўсё гэта свята для сталых наведвальнікаў, якія пастаянна прыходзяць на нашы выставы і іншыя імпрэзы. Ноч музеяў — магчымасць прапанаваць ім штосьці новае.

Я не адкрыю Амерыку, калі скажу, што музеі наведваюць усё радзей — гэта наступствы эры інфармацыі, якая захапіла ўсё. Вербальныя і візуальныя рэчы адыходзяць на другі план. На першы выходзяць атракцыі. Пры ўсёй лаяльнасці і зменлівасці музей — кансерватыўная з'ява ў гэтым сэнсе.

За год да нас прыходзіць каля 8 тысяч людзей. Асноўная катэгорыя наведвальнікаў — мясцовыя жыхары, але часам бывае непрадказальна шмат турыстаў. У жніўні ў нас сапраўднае жніво — вельмі шмат экскурсій у дзень. За кошт мерапрыемстваў ці новых паслуг таксама спра-

Што ў ВНУ табе тваёй?

Вышэйшыя навучальныя установы — вуснамі музыкантаў-педагогаў

рэгіянальных ССНУ ў даверных размовах неаднаразова казалі пра тое, што не рэдкасць, калі на некаторых іншых аддзяленнях педагогі строга прытрымліваюцца старой школы выкладання, не прымаюць і не разумеюць новых павеваў. Але мы, "грукачы", заўсёды знаходзімся ў пошуку!

Я наогул вазьму на сябе смеласць "адказаць" за ўсю беларускую вышэйшую музычную адукацыю. Пры ўсіх тых папроках, часам справядлівых, што адрасуюцца дзіцячым школам мастацтваў і ССНУ, "вышка" марку трымае. Магчыма, асобныя напрамкі ў ёй і "праселі", але, на мой погляд, вельмі асобныя, і ўсё гэта — сітуацыя часовая. Першыя месцы мы ў рэйтынгу сусветных універсітэтаў не займаем — грошы ў нашай адукацыі не тыя, каб ва ўсім быць сучасным і сярод перадавых, але за нашу альма-матар я скажу — гэта якасць і ўзровень. Як мне распавёў з нагоды маіх выпускнікоў адзін аўтарытэтны расійскі музычны дзеяч, спецыяліст у "барабаннай справе", любы з іх мог бы стаць лаўрэатам любога адпаведнага міжнароднага конкурсу. І становяцца ж!

Сяргей ТРУХАНОВІЧ,
гітарыст гуртоў "Палац" і "Крама", выкладчык гітары кафедры мастацкай творчасці і прадзюсарства факультэта мастацтваў Інстытута сучасных ведаў імя Аляксандра Шырокава:

— На дзённае аддзяленне ў наш інстытут могуць паступаць людзі, якія наогул не маюць ніякай музычнай адукацыі — ні пачатковай, ні сярэдняй, якія не адрозніваюць ноту "до" ад ноты "рэ". І такія, як ні дзіўна, ёсць, і іх не так ужо і мала, тых, што нейкім чынам ледзь было не прайшлі міма свайго, як яны лічаць, сапраўднага паклікання. У працэсе навучання яны робяць "прарыў" у ведах і пазней становяцца першакласнымі музыкантамі. Прыкладам таму служыць Віталь Ткачэнка, які працягнуў сваю музычную адукацыю ў Атланце, дзе на выдатна скончыў Atlanta Institute of Music and Media, а ў дадзены момант ужо з'яўляецца і выкладчыкам гэтай легендарнай навучальнай установы (пра яго "К" пісала ў №№ 5 і 9 за 2014 год).

Выкладчыцкі склад у нас проста шыкоўны, досыць успомніць Пятра Елфімава. А колькі яшчэ педагогаў, адначасова і артыстаў-практыкаў ("палявых хірургаў", як я іх называю): Юрый Дзмітрыеў, Аляксей Зайцаў, Андрэй Маўрын... І ў дзяржустановах, і ў нас, наколькі я ведаю, хапае "тэарэтыкаў". Але па спецпрадметах тут практычныя заняткі праходзяць вельмі прадуктыўна, тэорыя падмацоўваецца наглядными прыкладамі абавязкова.

Ці "мінус" тое, што ў інстытуце, натуральна, няма размеркавання? Магчыма. Таму што малады спецыяліст, падрыхтаваны дзяржаўнай ВНУ, не "платнік", гарантавана будзе працаўладкаваны (тут ёсць тонкасці, але я кажу пра агульнае правіла). (Іншае пытанне, калі канкрэтным размеркаваннем чалавек можа быць незадаволены.) Таму ў параўнанні з калегамі з дзяржаўных "вышак" студэнты тут больш мэтанакіраваныя, жорсткія, учэпістыя, ім трэба адразу пачынаць плыць. Асабліва завочнікі больш адказныя і немінчане. Найбольш "прасунутых" дзяўчат і хлопцаў мы самі "ўладкоўваем" у калектывы, часцяком хтосьці тэлефануе нам і просіць даць добрага музыканта. Некаторыя ўжо граюць у вядучых гуртах і аркестрах Беларусі.

Заплацілі — вучы

Сяргей ТРУХАНОВІЧ:

— З дзіцячых школ мастацтваў, сярэдніх спецыяльных устаноў прыходзяць да нас з рознай падрыхтоўкай. Але з вельмі ўжо жудаснай я не сустракаўся: усе нешта ведаюць і ўмеюць, ці хоць нешта, прынамсі. Але вось той "плюс", пра які я гаварыў у адносінах да тых, хто зусім не разбіраецца ў музыцы, абарочваецца і "мінусам" — для выкладчыкаў. Таму што з імі даводзіцца займацца з азоў, што вядома, некалькі "напружвае" — не вельмі ж вабіць кагосьці цягнуць за вушы. Аднак — "уплочено". І становіцца шкада ўласнага змарнаванага часу на такіх студэнтаў, калі яны пасля заканчэння інстытута ў музыцы не застаюцца менавіта з той прычыны, што да іх нарэшце дайшло — не іх гэта справа.

На жаль, і людзі таленавітыя сёння ў прафесію са страшнай сілай не імкнуцца: як я бачу, значная частка выпускнікоў інстытута, нягледзячы на тое, што яны аплачвалі сваю вучобу, потым ад музыкі па вялікім рахунку адыходзяць. Сустракаю некаторых у студыях гуказапісу, у крамах інструментаў, дзе яны працуюць дэманстратарамі, пытаюся: "А чаго не на сцэне?" "Ай..." — адказваюць і махаюць рукой. Калі шчыра, то цяперашнія студэнты наогул не тыя, што былі яшчэ сем гадоў таму, калі я прыйшоў выкладаць. Няма таго бляску ў вачах у цяперашніх. Ды і цікавейшыя раней хлопцы былі. Як той жа Андрэй Кацікаў, якога мне калісьці пашчасціла вучыць, — выпускнік знакамітага каледжа Бэрклі ў Бостане.

Фінансавае становішча выкладчыкаў і інстытута ў цэлым залежыць ад колькасці нашых студэнтаў. На жаль, апошнія гады два набор падае ў многіх навучальных установах. Я звязваю гэта ўсё ж з дэмаграфічнымі праблемамі, а не з тым, што стала менш ахвотных паступіць. Можа, таму і на характэрных асобаў дэфіцыт.

Хацелася б умацавання матэрыяльнай базы — па камп'ютарах, гукаўзмацняльнай апаратуры. А то давялося выкладчыкам самім абсталёўваць другі клас для заняткаў уласнымі комбікамі і правадамі. У нас няма добрай залы, у якой можна было б ладзіць канцэрты, конкурсы, фестывалі і іншае, а калі яны пад бокам, яшчэ і вельмі карысныя для студэнтаў як наглядны дапаможнік. Хоць, вядома ж, кіраўніцтва інстытута заўсёды ідзе насустрач пажаданням і стараецца дапамагаць, па меры магчымасці.

Аляксандр САПЕГА:

— У маёй працы турбуе нейкі геаграфічны перакос, калі асобныя вобласці сваімі студэнтамі наогул не прадстаўлены, і такое паўтараецца, а я ж выкладаю тут добры тузін гадоў. Заўсёды ёсць моцныя выхадцы з Брэста і Магілёва, з Маладзечна. А з Гродна не едуць, з Гомеля — за рэдкім выключэннем, як і з полацкіх краёў. Зыходзячы з гэтага, ці можна зрабіць выснову пра тое, як у тамтэйшых сярэдніх музычных установах рыхтуюць барабаншчыкаў? Хто ведае... Але і не могуць жа ўсе іх выпускнікі быць геніяльнымі і вучыцца толькі ў Акадэміі і ў Старажуках?!.. Я ўзяў бы нават шырэйшы ахоп, кафедру наогул, якая, па ідэі, павінна была б рэгулярна і ў неабходнай колькасці папаўняцца навучэнцамі. А адкуль ёй папаўняцца, адкуль папаўняцца дзіцячым школам мастацтваў, ССНУ, калі ў дамах культуры ліквідуюцца духавыя аркестры, знікае пажыўная база для навучальных устаноў? Наш знакаміты саксафаніст Ігар Люты пачынаў з такога гуртка, а сёння за шчасце па святах пачуць на плошчы аматарскі аркестр духавой музыкі, а раней гэтыя калектывы гралі ў парках ледзь ці не кожныя выхадныя. Што, людзям цяпер яны не патрэбныя? Мяркуючы па тым, колькі народу збіраецца ў Мінску ля Ратушы на выступы джазавых або класічных музыкантаў, патрэбныя. А мы ўжо губляем цэлы пласт культуры...

І яшчэ адзін "крык душы", спадарожны. Разумею, што бессэнсоўны... Ці ведаеце вы, які аклад сярэднестатыстычнага выкладчыка музычнай навучальнай установы?.. Дык вось, часам і "заідэйныя" людзі выдыхаюцца. Культуру мы, вядома, не страцім, але сякія-такія яе пласты потым трэба будзе доўга аднаўляць, і з прыцягненнем ужо зусім іншых фінансаў. У лепшым выпадку. У горшым — нешта давядзецца закансерваваць, як сёння некаторыя замкі...

І пара словаў пра матэрыяльнае забеспячэнне. Зайдзіце ў мой кабінет, паглядзіце на інструменты, на якіх займаюцца студэнты, і паспрабуйце самі адказаць на сваё пытанне: "Яны лаўрэатамі конкурсаў становяцца, вучачыся граць на іх?.." Так, на іх. А я ўсё з дому прынесці не магу...

К

Аляксандр Сапега. / Фота аўтара

Сяргей Трухановіч.

Музеі не спяць дзеля попыту на... музеі

Што прапануюць установы ў адмысловых праграмах і якую карысць з гэтага маюць

буем павялічыць колькасць наведвальнікаў. Праводзім, напрыклад, творчыя сустрэчы з пісьменнікамі, што збіраюць мясцовую творчую інтэлігенцыю. Але ўсё адно галоўнае, што цікавіць людзей — экскурсіі і агляд экспазіцыі, таму тут пытанне толькі ў асабістым жаданні.

Людміла МАТВЕЕВА,
навуковы супрацоўнік Аршанскай гарадской мастацкай галерэі Віктара Грамыкі:

— Наша Ноч музеяў адбудзецца 27 мая. Значную частку мерапрыемстваў хочам правесці ў дворыку побач з музеем, але апошнія тры гады нам не шанцавала з надвор'ем і даводзілася ўсё запланаванае там адмяняць, таму зараз мы вырашылі ўсё ж такі дачакацца цяпла.

Сёлета Орша святкуе юбілей, таму музейную ноч прысвяцім тэме гісторыі і адкрыем нашым наведвальнікам "950 таямніц". Выбралі вечаровы час — з 20-й да 23-й гадзіны. У дворыку малюем, слухаем музыку, дэгустуем стравы народнай кухні. Унутры будынка кожная зала мае сваю тэматыку — як працавалі фотаатэлье XIX стагоддзя ці як людзі апраналіся ў той час у Оршы, як пяклі хлеб, што важна ведаць пра жывапіс і графіку. Арганізуем фотазоны, плануем тэатральныя пастаноўкі. Уваход бясплатны, але будуць асобныя мерапрыемствы, на якія трэба купіць асобны білет.

Не першы год удзельнічаем у гэтай міжнароднай акцыі і бачым, што гэта ўсё ж такі прыцягвае да нас новых наведвальнікаў і дае нам магчымасць папулярызаваць нашы фондавыя зборы. Усе мерапрыемствы насычаныя нашымі экспанатамі, некаторыя з іх звычайна наведвальнікі не бачаць, а для свята мы можам іх выкарыстаць.

Канечне, людзі прыходзяць, каб атрымаць задавальненне і радасць, новыя ўражанні. Фінансавае пытанне першым не ставім у гэтым выпадку — адзначаем сваё прафесійнае свята Ноччу музеяў і запрашаем да сябе гасцей. Часам павышаем кошт, часам робім бясплатны ўваход, як цяпер — залежыць ад мерапрыемства. Колькасць наведвальнікаў памяншаецца апошнім часам. Даследаванняў прычын такога працэсу мы не праводзілі, але, мне падаецца, усё залежыць ад плацежаздольнасці насельніцтва. Паход у музей не самае неабходнае для жыцця пры планаванні фінансавых выдаткаў. Але мы ўсё адно стараемся звяртацца да нетрадыцыйных формаў працы з наведвальнікамі, каб зацікавіць іх — зараз гэта гульнёвыя праграмы "Інтэрактыўная карта па зале Грамыкі" і "Напалеон у Оршы".

Наталля АРЦЁМЧЫК,
дырэктар Бабруйскага краязнаўчага музея:

— Удзельнічаем у Ночы музеяў ужо восьмы раз. Гэта адно з мерапрыемстваў, якое ў горадзе чакаюць — нават загадзя набываюць білеты. Яны ў нас па даступных коштах — адзін рубель для дзяцей, два рублі для дарослых. Зусім бясплатна не праводзім мерапрыемства проста для таго, каб абмежаваць колькасць наведвальнікаў. Прасторы ў нас не так шмат, таму калі ўваход будзе вольны, ёсць верагоднасць, што не ўсіх зможам прыняць.

У Бабруйску нямала калектываў, якія адгукаюцца на нашы прапановы супрацоўнічаць на працягу года, але найбольш яскравае свята атрымоўваецца на Ноч музеяў. Сёлета яна адбылася 18 мая — была невялічкая выстава "Бабруйск на старых картах", майстар-класы па вырабе паштовак, супрацоўнікі музея прадстаўлялі кулінарныя рэцэпты ад карэнных бабруйчан, працаваў музычны салон. Традыцыйна праводзілі ўсё ў вечаровы час — з 18-й да 20-й гадзіны.

Перад намі не стаіць мэта прыцягнуць новых наведвальнікаў — яны прыходзяць, але няшмат. Нашы зменныя выставы звычайна камерныя, пастаянная экспазіцыя не змяняецца, таму стараемся рабіць штосьці, каб усім магло быць цікава — не толькі тым, хто ў нас упершыню. Інтэрактыўныя мерапрыемствы арганізоўваем абавязкова, праводзім шмат выязных музейных заняткаў у школах і дзіцячых садках. Наведвальнікам вельмі падабаецца этнаграфічны вясельны абрад.

Наша асноўная аўдыторыя — навучэнцы каледжаў, студэнты філіяла Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта, мясцовыя жыхары, што цікавяцца гісторыяй, прадстаўнікі бабруйскіх прадпрыемстваў. Большасць з іх нашы сталыя госці.

К

Адпусці сябе ў Венецыю!

Мы і свет на знакамітым біенале мастацтваў

Не ведаю больш такога небанальнага горада. Такі супярэчлівы, цякучы, з культам мастацтва і падлікам кожнага еўра ў кішэнях яго прыхільнікаў. Горада, дзе перамог пафас класікі і самае актуальнае — дызайн, нефармальнасць жэстаў, прыступак, спрытца, вечныя каналы і кале — праходы без гарызонту, у глыбіні кварталаў. Непрадказальны горад.

Канцэнтрат

Папіць кавы ў Арсенале. Пагутарыць з мастакамі ў Джардзіні. Паслухаць мовы свету. Убачыць самых стылёвых людзей свету — не паводле павеву моды, а па духу свабоды, свабоды думкі, свабоды ве візуалізацыі. Збольшага вербалізацыі, але толькі збольшага. І ўсё гэта, у тым ліку кава, — практычна адна мова, таму што пяць тысяч чалавек, якія працуюць у сучасным мастацтве, сабраліся тут усяго на тры дні, на прэв'ю біенале ў Венецыі. "Мастацтва — мой запал, — падкрэсліла на прэс-канферэнцыі Крысцін Масэль, куратар біенале 2017. — І ў Венецыі яно жыве ў найлепшым кантэксце."

Як важна захаваць пазіцыі

Нам уласціва падвышана крытычна ставіцца да беларускага ўдзелу ў міжнародных форумах. Мастакі раз'яднаныя, схільныя да іроніі, узаемных папрокаў і занудства. Але адносна Венецыі хачу заўважыць: вельмі пашанцавала краінам, у якіх ёсць нацыянальныя павільёны, і, думаецца, у гэтым няма іх заслугі. Проста так склалася гістарычна: гэта ўласнасць, асобная тэрыторыя, як пасольства краіны, прычым абжытае за шмат гадоў, і абжытае менавіта як art place.

Беларусам трэба вырашаць гэтую праблему кожны раз нанова: Castello, 15 пазалетась, Fondamenta S. Giuseppe Castello, 925 зараз... Ад зручнасці лакацыі і плошчы арэнды да святла, кліматкантроля і гэтак далей. Кожны год усё пачынаецца спачатку.

Што значыць быць у Венецыі з нацыянальным павільёнам, то бок у асноўнай праграме? Вырашайце самі: расійскі Пушкінскі музей, напрыклад, удзельнічае толькі ў паралельнай. Аб'яднаная Еўропа пад назвай "European Cultural Centre" арандавала ажно тры павільёны, але таксама ў горадзе. Такіх прыкладаў шмат. А адначасова, гэта значыць у разліку на ўвагу той жа публікі, адкрытыя выставы — увага! — Дэміяна Херста (у двух палацах), Давіда Лашапеля, Дэвіда Хокні, Валерыя Кашлякова, раннія серыі Роберта Раўшэнберга і Эндзі Ворхал, Віка Муніса. Фэсты GlassStress 2017 і "Венецыя Дызайн". У даведніках Пол Макартні з відэаскульптурамі прамільгнуў. І яшчэ шмат-шмат менш вядомых імёнаў.

Беларусі вельмі важна тут быць. Так, і мастакоў з асноўнай праграмы можна пачуць у штотыднёвым праекце "Адкрыты стол" з запрашэннем крытыкаў і журналістаў. Наш "Стол" будзе пачуты 15 чэрвеня (Цэнтральны павільён). І яшчэ адзін цалкам незалежны фармат — адзіночны пікет. Таксама пляцоўка, дзе няма ўзгаднення зместу.

За "Столам" і столы ў мінідацорах.

Проста трэба быць. У чаканні большых фінансавых магчымасцяў, большай адкрытасці конкурсу канцэпцый, з папярэднімі абмеркаваннямі і публікацыямі — з усім гэтым можна працаваць, гэта праблемы, якія вырашаюцца. Але нельга ўпусціць у гэтым працэсе галоўнае — удзел нацыянальнага павільёна ў сусветнай арт-кампарацыі "Біенале ў Венецыі". Як сказаў на адкрыцці яе прэзідэнт Паола Барата, "...тут пачынаецца ўсё. І мы бачым давер усяго свету да таго, што мы робім".

Рэклама біенале на венецыянскіх вапорах.

Жыццё за "Сталом"

Беларускі павільён сёлета прадставіў праект "Стол" куратара і мастака Рамана Заслонава (рэжысёр Сяргей Талыбаў, прадзюсар Віктар Лабковіч). Камісарам павільёна выступіла Наталля Шаранговіч, удзел Беларусі ў біенале падрыхтаваны Нацыянальным цэнтрам сучасных мастацтваў краіны і Міністэрствам культуры рэспублікі пры падтрымцы Пасольства Беларусі ў Італіі.

Fondamenta S. Giuseppe Castello, 925 — гэта набярэжная венецыянскага канала з прывідным святлом, палац насупраць, і пастаянная плынь людзей — на шчасце, павольная і ўмераная, без натоўпу. Бліжэй за ўсё айчынны павільён размешчаны да цэнтральнага ўваходу ў Джардзіні, што адразу падвышае шанцы быць убачаным шматкроць. Прастора ўяўляе з сябе анфіладу з двух памяшканняў: у адным дэманструецца відэа, а ў іншым размешчаны аб'екты. З пункту гледжання экспазіцыі ўсё выбудавана вельмі дакладна — па прасторы, святле, прапорцыях, суадносінах аб'ёмаў і формы. Арганізацыя інсталяцыі і аб'ектаў вядзе гледача ад некалькі тэатральнай фіксацыі асабістых гісторый да абстрагавання ад іх. Выява выніковага "Стала" — як бясконцай плыні мноства лёсаў, сюжэтаў, характараў — у чымсьці нават пераклікаецца са зменлівасцю і парадаксальнай сталасцю самой Венецыі.

Пэўная прастата канцэпцыі, адсутнасць, на мой погляд, неадназначнасці і "наваротаў" адрозніваюць "Стол" ад многіх праектаў біенале. Годнасць гэтая "яснасць" альбо недахоп? Складана сказаць, але агульнай заяўленай тэме "Via arte viva" яна сапраўды адпавядае. Лаканізм формы ні ў якім разе не выключае легіён сэнсаў. Але, зноў жа, гледзячы з чым параўноўваць. Напрыклад, асноўны кураторскі праект перагружаны сэнсамі па вызначэнні, але счытваецца далёка не ўсё: замінае відовішчнасць, маштаб, а часам і дэкаратыўнасць. Хоць канцэптуальна большасць праектаў перанасычаныя сацыяльнай праблематыкай — міграцыя, посткаланіялізм, правы чалавека, тэрарызм, фатальнасць тэхналагічнай будучыні.

У беларускім павільёне гэтага дакладна няма — ён камерны, інтравертны, рыхтаваўся адмыслова для невялікага памяшкання, і ў цэлым атрымаўся арганічным і зразумелым.

Нагэўна, варта сказаць і пра медыя. Аб'екты і відэаарт, думаю, самыя папулярныя на сёння як у асноўным праекце, так і ў нацыянальных, паралельных і гэтак далей. Падыходзіць да першых пазіцый перформанс, але яго не ўсе могуць сабе дазволіць (у маленькіх памяшканнях), ды і не ўсюды ён патрэбны, не кожнай культуры блізкі. У беларускіх павільёнах перформанс паказваў Віктар Пятроў (2013), інтэрактыўным быў "Архіў сведкі вайны" (2015). У гэтых жа гадах відэа Дзяніса Скварцова і Канстанціна Селіханава канцэптуальна дапаўнялі экспазіцыю. Так што ў гэтай частцы нашы падыходы можна параўноўваць з міжнароднымі. З іншага боку, класічныя жанры — жывапіс, графіка — таксама прысутнічалі на біенале, і выдатна, сучасна былі рэпрэзентаваны і прачытаны гледачамі. Усё залежыць ад канцэпцыі, ад таго, што мастак распавядае нам пра свет і пра час. Венецыя ў гэтым сэнсе — добрая праверка.

Любоў ГАЎРЫЛЮК,
арт-журналіст
(спецыяльна для "К"),
Мінск — Венецыя — Мінск
Фота аўтара

Працяг — **у наступных нумарах "К".**

"Маладзечна-2017": паказаць голас

Пачнас рэпетыцыі будучых канкурсантаў з мастра фінбергам. / Фота аўтара

Менш за два тыдні засталося да пачатку XVII Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі "Маладзечна-2017", галоўнай падзеяй якога з'яўляецца конкурс маладых выканаўцаў. Як рыхтуюцца да выступу з вялікім аркестрам і за што любяць беларускія песні, "К" распавялі самі вакалісты.

Вераніка МОЛАКАВА

Канкурсантам давядзецца спяваць "жыўцом" у суправаджэнні заслужанага калектыва краіны Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра Беларусі на сцэне маладзечанскага Летняга амфітэатра. Для большасці з іх гэта першы такі вопыт у жыцці, таму ўсе яны на працягу месяца прыязджалі на рэпетыцыі ў Мінск, нягледзячы на тое, што жывуць у розных кутках краіны. На гэтым тыдні адбылася апошняя перадфестывальная сустрэча.

— Дякуй, што прыехалі! Разумею, што гэта няпроста, таму што амаль усім вам трэба ехаць да нас здалёк, — павітаў канкурсантаў мастацкі кіраўнік аркестра, прафесар, старшыня журы конкурсу Міхаіл Фінберг у рэпетыцыйнай зале калектыва.

Цяпер кожны мусіць чакаць сваёй чаргі, каб праспяваць адзін раз з музыкантамі і выслухаць парады маэстра. У наступны раз такая магчымасць будзе ўжо толькі ў Маладзечне, куды змагацца за Гран-пры і прызавыя месцы прыедзе 21 вакаліст — кожную вобласць і асобна сталіцу прадстаўляюць па тры ўдзельнікі.

— Думаю, што гэты конкурс адзін з галоўных у краіне для маладых выканаўцаў, а спяваць з такім аркестрам пад кіраўніцтвам Міхаіла Якаўлевіча — гэта вялікі вопыт і шчасце, — лічыць Вадзім Лукашэвіч з Ашмянаў. — Не кожны мае такую магчымасць, таму я вельмі рады, што прайшоў адбор, хаця давялося аднойчы выходзіць на сцэну з тэмпературай 38. Спяваю адну са сваіх любімых песень — "Крылы". І музыку, і словы для яе напісаў сучасны кампазітар Уладзімір Фалалееў. Сам сябе лічу лірычным выканаўцам, таму мне падабаюцца адпаведныя песні. Прыгажосць "Крылаў" — у меладычнасці мовы і музыкі.

— Вучуся ў каледжы культуры і мастацтваў на другім курсе, — распавядае пра сябе канкурсантка з Віцебска Вольга Мазго. — Упершыню буду выступаць з аркестрам, таму хвалююся за тое, каб усё атрымалася акуратна, прыгожа. Трэба пастарацца — гэта, напэўна, пакуль мой самы значны конкурс і самая вялікая сцэна. Спяваю "Васільковае неба" на музыку і словы Юрыя Быкава і Яўгена Алейніка. Любаю гэту песню з дзяцінства, і мне падаецца, што па тэматыцы яна вельмі пасуе конкурсу ў Маладзечне. Я магу спяваць любыя песні ў залежнасці ад умоў творчага спаборніцтва, але добра, калі можна не засяроджвацца толькі на адным кірунку. Заўважыла, што менавіта беларускія песні на конкурсах аўсньваюць неяк асабліва.

— Я заўжды спяваю шмат беларускіх песень, гэта мая стыхія, а "Рэчанька" — тая, якая падабаецца больш за ўсё і раскрывае мае вакальныя магчымасці, — тлумачыць свой выбар рэпертуару Мілана Урбановіч, якая прадстаўляе Гомель. — Яшчэ дакладна не вырашыла, ці буду звязваць сваю прафесію з вакалам — займаюся з чатырох гадоў, скончыла музычную школу, але зараз проста вучуся ў 10 класе сярэдняй школы. Перад конкурсам крыху хвалююся, але гэта толькі "падганяе" рэпеціраваць з імпэтам. Усе ўдзельнікі вельмі моцныя, і я рада, што буду змагацца за перамогу разам з такімі годнымі спевакамі.

Вынікі конкурсу маладых выканаўцаў канкурсантаў мастацкі кіраўнік аркестра, прафесар, старшыня журы конкурсу Міхаіл Фінберг у рэпетыцыйнай зале калектыва.

Пачнас прэм'еры праграмы Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра Беларусі пад назвай "Купала і Колас, вы нас гадавалі".

— Удзельнікі спяваюць "жыўцом" і абавязкова на беларускай мове, як гэтага патрабуюць умовы конкурсу, — кажа Міхаіл Фінберг. — Мы робім усё магчымае, каб падтрымаць артыстаў, таму што фестываль заўжды адкрывае новыя імёны, якія нам так патрэбны. Гэта адзіная пляцоўка такога кшталту ў краіне, якая мае статус нацыянальнай, таму я адчуваю вялікую адказнасць — узровень вельмі высокі. Ужо на конкурсе ў Маладзечне можна пачуць тых, хто праз год-два здолеў бы прадстаўляць Беларусь на конкурсе ў Віцебску на "Славянскім базары..."

Але конкурс — гэта толькі адна частка фестывалю беларускай песні і паэзіі "Маладзечна-2017". Многія мерапрыемствы пачнуцца ўжо 1 чэрвеня і скончацца толькі 4-га — будуць працаваць канцэртныя пляцоўкі, пазтычныя гасцёўні, мастацкія плэнэры і выставы, ладзіцца кніжная прэзентацыя. Як адзначыла на прэс-канферэнцыі з нагоды падзеі першы намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь Ірына Дрыга, сёлета ўсе фестывальныя мерапрыемствы так ці інакш прасякнутыя тэмай творчасці Янкі Купалы і Якуба Коласа.

У амфітэатры купалаўцы прадставяць сваю "Паўлінку". На сцэне Мінскага абласнога драматычнага тэатра адбудзецца паказ спектакля "Беларусь. Дыдактыка" Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі з удзелам народнай артысткі Беларусі Тацяны Мархель і Змітсра Лук'янчыка — музычнай споведзі пра адчуванне сябе ў сваёй краіне. Канцэрт-закрыццё фестывалю 3 чэрвеня будзе прысвечаны 45-годдзю ансамбля "Сябры". Традыцыйна для моладзі 4 чэрвеня плануецца канцэрт "Рок яднае" з удзелам беларускіх гуртоў NaviBand і :B:N:, а таксама O.Torvald (Украіна) і "Hory свело!" (Расія).

Красавіцкія аўдыя / відэаработы айчынных выканаўцаў рэцэнзуюць фронтмэн гурта LiteSound Дзмітрый КАРАКІН (А.) і спецыяльны карэспандэнт газеты "Культура", музычны крытык Алег КЛІМАЎ (В.).

Аўдыя & Відэа





Алег КЛІМАЎ, спецыяльны карэспандэнт "К"



Дзмітрый КАРАКІН, фронтмэн гурта LiteSound







АЎДЫЯ

Гурт Haina, сінгл "Токам"

А.: Мода — гэта заразна. Пачынаеш баяцца любой новай музыкі, калі па волі злога року ці насмешкі лёсу трэкі "Грыбоў" і Джыгана ледзь не да секунды супадаюць ад пачатку і да фіналу, пасля чаго яшчэ доўга чакаеш вяртання свайго адэкватнага стану. Таму незразумела і з яшчэ большым дыскамфортам на гэтым фоне пачынаюць гучаць песні, якія "ні на што не падобныя". У сілу свайго абмежаванага музычнага далягляду альбо будучы заражанымі эпідэміяй музыкі, напісанай пад "грыбамі", усё цяжэй нам становіцца адзньваць самабытную творчасць аўтараў розных жанраў, песень ды тэкстаў, створаных відавочна не на карысць меркантыльнасці, дурманлівай камерцыйнай пажадлівасці.

Праект Haina — гэтакі маніфест і выклік папсе, спроба доказу магчымасці пісаць "у сваё задавальненне", пісаць, адгарадзіўшыся ад любых павеваў і тэндэнцый, без надзеі калі-небудзь атрымаць талерку ад "Муз-ТБ" або які-небудзь "Залаты грамафон". А яно, відавочна, ім і не трэба — мабыць, пляваць удзельнікі Haina хацелі на ўсе гэтыя талеркі і іншыя атрыбуты статусу, прагляды на ютубе. Што ж, такая музыка асуджана застацца незразумелай або разарваць кайданы ланцугоў пахабнай камерцыі, што абылталі нас, і стаць новай Nirvana.

В.: Каб я яшчэ зразумеў, пра што, упаска, песні гурта, што хочуць данесці іх аўтары слухачам, то было б і нядрэнна. Трагізму музыкай, аранжыроўкамі і вакалам наганяецца вышэй за дах, здаецца, яшчэ пара нот і акорду" — і свет праваліцца ў тартарары, вершнікі Апакаліпсісу вытруць скрываўленыя шашкі ад грывы сваіх коней і толькі ў аналах нашай галактыкі знойдзецца некалькі радкоў аб некалі былой планеце Зямля. Ураджае, карацей. І ўсё ж: каб я яшчэ зразумеў, чаго так перажываюць-пакутуюць таварышы-музыканты...

Насарогаў і "!ХОП!",

альбом "Дзюра"

А.: З першых акордаў скарае рамантычным шансонрокам гэты альбом. Грымоты, пералівы гармоніка агаляюць у душы самыя тонкія стрункі, і вось ужо захацелася адкарабкаваць бутэлечку "горкай" і пусціцца ў скокі. Так, спадары, у нас ёсць свой "Ленінград". Музыкі-майстры выразна здабываюць гукі з інструментаў і выстаўляюць праўду-матку тэкстамі. Вакалу-рыку, вакалу-рэху пазайздросціць сам Сукачоў, а ў тэкстах прыкутнічаюць самаіронія, сатыра, гумар, годныя "ляпісаў". Безумоўна, гэтая работа, гэты праект у прыняцьце заслугоўваюць увагі аматараў таго, што "гарачэйшае".

В.: Лічу Міхея Насарогава лепшым айчынным рускамоўным паэтам-песеннікам, прынамсі, у альтэрнатыўнай музыцы. Ён не проста вельмі ўмела аперуе рыфмамі, а складвае з іх дапамогай сапраўды напоўненыя сэнсам сюжэтныя творы. У іх не трэба нешта дадумваць за аўтара, прадзіраюцца скрозь сімвалы ды метафары, якімі любяць дражніць слухача, напрыклад, многія прасунутыя рокеры. Міхей адноўкава яркі і як апавядальнік-трагік, і як лірык, каго кідае ад любові да нянавісці і наадварот, і як адкрыты пазтычны хуліган. Інструментал у яго кампазіцыях, хутчэй, выконвае другарадную ролю, "пасуе", але без дакладнай перадачы і гола не было б, ці не так? Ды і з аранжыроўкамі ў яго ўсё ў парадку.

На новым альбоме артыста вас чакае так ім упадабаны джаданс, перажыванні ды стрыманая весялосць. Выпучаю трэкі "Дурны герой" (драматычная полечка з выбухным апафеозам у прыпеве) і "Гаў-гаў" (з відавочным адсылам да Ясеніна).

Гурт "Сярод добрых людзей",

альбом "Неба дажджоў"

А.: Дзікая салата пад уплывам беларускіх The Stokes, брытанскага Стынга, расійскіх "Братоў Грым", запраўлены "белай паэзіяй" з загадкавым для мяне сэнсам. Увогуле, цікавая, самабытная работа, якая выклікае, хутчэй, жаданне праслухаць яе яшчэ раз хаця б у надзеі, што ў наступны незразумелае стане больш зразумелым, а таямнічая душа аўтара раскрыецца больш. Расчароўвае залішняя манатоннасць альбома ў цэлым і адсутнасць разнастайнасці, што, між іншым, можна спісаць на жаданне гурта паказаць сябе ў нейкім пэўным рэчышчы, задаючы сабе жорсткія рамкі стылю.

В.: Не выключана, што гурт у тэкстах сваіх кампазіцый абраў усе магчымыя ў песенных жанрах словазлучэнні. Тое ж тычыцца і ідэй, закладзеных у трэках. Добра, каб у музыцы не-не, ды і прасквала штонебудзь гэтакае, але артысты паспядоўняя і ў гэтым. Сыграна добра, матэрыял асэнсаваны, але не нараджае ўва мне падзены блюз-рок з псіхадэлічным адлівам нічога, апроч тугі. Радуе, што самім музыкантам тое, што яны робяць, мабыць, вельмі падабаецца, напэўна, першаадкрывальнікамі яны сябе ў чымсьці адчуваюць. Пакінем іх у спакоі з гэтым.

ВІДЭА

Анатоль Ярмоленка,
кліп на песню "Накцюрн"

А.: Калі легендарны артыст замест таго, каб спачываць на лаўрах, працягвае тварыць, ды яшчэ і адыходзячы пры гэтым ад звыклых для яго формаў выразнасці, гэта, як мінімум, варта ўвагі. Сумесь парыжскага шансона з лацінаамерыканскай басановай разам з вытанчаным відэа — гэта і ёсць свежы кліп Анатоля Ярмоленкі. Пяшчотная кампазіцыя, прызнанне і споведзь, дзесьці нават танга ў духу "слова любви вы говорили мне" зойме пачэснае месца ў сэрцах прыхільнікаў выканаўцы.

В.: Чорна-бела, у каварні граюць музыканты, за акном лье дождж, вечар у кампаніі мужчыны ва ўзросце і маладой жанчыны. Стыльна, інтымна, душэўна, цёпла. Выдатна, што і мэтры выпускаюць кліпы. І не абы якія, а цалкам сабе прыемныя. Як гэты ролік — так, немудрагелісты, але вока заміноўвае, настрой стварае і нешта там унутры кранае. І песня светлая-светлая, рэтра, натуральна, але не меазой які-небудзь. Я ўключыў бы гэта відэа ў лонг-ліст Нацыянальнай музычнай прэміі "Ліра" ў адпаведнай намінацыі. І хай аддасца яму!

Адзінай чорнай стужкай

Ці можна сказаць, што World Press Photo радуе беларусаў чарговай выставай? Можна, але слова "радуе" — не тое, што можа апісаць усю сёлетнюю экспазіцыю па выніках міжнароднага фотаконкурсу ў Мінску. На кадрах амаль не сустрэнеце блакітнага неба ды зялёнай травы, шчаслівых сем'яў. Вы ўбачыце кроў, пыл, агонь, голад, беднасць і смерць. А што рабіць, калі 2016-ы такім патрапляў у аб'ектывы фатографаў.

Ганна ШАРКО

Фрагменты экспазіцыі і красамоўна сведчаць пра тэматыку выставы.

Сёлета ў прасторы "Цэх" прадстаўлены 45 фотаздымкаў, якія прайшлі вялікі конкурс, і зараз дэманструюць жыццё без цэнзуры. Тут, вачыма журналістаў з розных дзяржаў, я пабачыла, што такое вайна, смерць, браканьерства, голад і многа розных рэчаў, пра якія больш хочацца спытаць кагосьці зверху: "Чаму так і дзе справядлівасць?!"

Адсоль вынікае пытанне: ці падрыхтаваныя беларусы да такой голай праўды? Бо не ведаем, на шчасце, як выглядае вайна ў XXI стагоддзі...

Нагадаю, што экспазіцыя года складаецца з наступных тэм: фотапераможца, праблемы сучаснасці, штодзённае жыццё, галоўныя навіны, доўгатэрміновыя праекты, прырода, людзі, спорт і яго навіны. Цікава, што фотаздымкі, па сутнасці, не дакладна адпавядаюць тэматычнай разнастайнасці, хіба толькі спорт больш стаіць асабняком, як ужо іншая "культура". Усе астатнія фота абагульнены адзінай чорнай стужкай, мы быццам бачым смерць ва ўсіх яе іпастасях: пачынаючы з разбураных гарадоў Бразіліі, масавых забойстваў рэдкіх відаў жывёлаў і заканчваючы фота ваенных падзей, зробленых як з боку мірнага насельніцтва, так і з пазіцыі ваенных.

Вось, скажам, дзесьці там, далёка на ўсходзе, маленькіх дзяцей, забітых падчас ваенных дзеянняў, выносяць з разбураных дамоў ацалелыя мясцовыя жыхары, сярод якіх — брудныя з-за крыві, пылу, поту і спёзаў абліччы бацькоў тых нямшчасных малечаў. А на сцяне насупраць кадры, дзе маладыя ваенныя хаваюцца з вінтоўкамі за руінамі, бежанцы пераплываюць акіян, людзі ў вёсцы хаваюцца ад выстралаў. Але, на жаль, зараз гэтым нікога не здзівіш — наш свет перанасычаны трагічнымі навінамі, таму іх не ўспрымаюць як нешта значнае.

Фота-пераможца здзівіла ўсіх і проста выбухнула ў інтэрнэце, бо гэта — эксклюзіў: не кожны дзень можна сфатаграфаваць забойцу на месцы злачынства. Бурхан Азбілічы выпадкова апынуўся ў мастацкай галерэі і зрабіў некалькі здымкаў жахлівага моманту — забойства расійскага паста ў Турцыі Андрэя Карлава. Гэту фатаграфію я бачыла ва ўсіх сацыяльных сетках, сябры дасылалі яе мне ў асабістыя паведамленні і пісалі "Паглядзі, ён выглядае шчаслівым". А ён, забойца, сапраўды выглядае шчаслівым, і гэты дысананс мяне пужае, асабліва на фоне дзіцячых забойстваў. Арганізатары выставы вельмі добра зрабілі кампазицыю з фотаздымкаў пераможцы: побач з кадрам з забойцам паста ў поўны памер змясцілі здымак наведвальнікаў той галерэі, якія забіліся ў кут ад жаху. Выглядае так, быццам хтосьці зрабіў скрышшоты з баевіка, але гэта — рэальнае фота.

Выснова: каб стаць пераможцам World Press Photo, трэба быць у патрэбным месцы ў патрэбны час, але што ў гэтым добрага, калі атрымліваецца, што ўсе фотажурналісты, якія працуюць у "гарачых кропках", вядуць палявання на злачынствы. Такім чынам, фатографы едуць на вайну, каб папоўніць сваё партфоліа, а хіба не гэта — прыкмета камерцыялізацыі тых жа ваенных дзеянняў? Спынюся на гэтым, аднак я ўсё ж такі спадзяюся, што гэта паляванне ў хуткім часе скончыцца, як і ўсе войны. Бо кожны з нас натэўна не адночы марыў аб міры ва ўсім міры?

Другі бок праблемы забойстваў — жывёлы, якія сваёй унікальнасцю правакуюць браканьераў на жудасныя знішчэнні. Ахвяры — і панды, і насарогі, чарапахі, якія забіраюцца ў рыбалоўных сетках, і іншыя жывёлы, што проста не трапілі ў аб'ектыў фатографаў. Аднак тут выснова больш простая: беражыце жывёл ад браканьераў, старайцеся забяспечваць ім здаровае жыццё, выратоўвайце рэдкія віды ад вымірання.

Іншыя тэматычныя блокі менш жудасныя, але — не менш дзіўныя. Гэта спорт. Фотаздымкі, што нясуць у сабе нейкую эстэтычную каштоўнасць — рэдкая ўдача, якую спартыўныя фатографы атрымліваюць у барацьбе за лепшы здымак. Падчас экскурсіі па выставе, прадстаўніца конкурсу ў Беларусі І Вэнь Ся распавяла, што на спаборніцтве можа быць каля дзвюх соцень фатографаў, якіх мы проста не бачым па тэлевізары, аднак на іх баку адбываецца не менш гарачая барацьба. Таму і здымкі адпаведныя (як кажуць, адзін на мільён), дзе спартсмены быццам у бязважкасці лётаюць у кадры. Спорт такім чынам пераўтвараецца ў новую катэгорыю эстэтыкі.

На астатніх стэндах былі прадстаўлены здымкі на тэмы жыцця сексуальных меншасцяў, дзяцей з мікрацэфаліяй, іранскіх жанчын і... маленькага амерыканскага мястэчка. Гэтая серыя фатаграфій — вынік добрай даследчай працы журналіста. Пад фота было кароткае апісанне, у якім гаварылася, што калісьці Маркус Ёкела заехаў у маленькую сельскую абшчыну Тэйбл Пок, якая яму так спадабалася, што ён здымаў яе на працяку практычна 25 гадоў. На здымках неверагодная атмасфера 1990-х, якія спыніліся ў часе.

На мой погляд, акурат такой працы і не хапае сучаснай фотажурналістыцы. Мы ўсе спрабуем першымі ўхапіцца за навіны, а тыя навіны насамрэч ёсць у розных месцах, не толькі на вайне ці ў саване з тыграмі. Так, жыццё маленькага гарадка куды больш бяспечнае, але, увогуле, не ў тэзіс справа... Навіны ёсць усюды, проста іх трэба ўмець шукаць, а ў выпадку выставы World Press Photo — і фатаграфаваць, у тым ліку, каб знайсці ўласную тэму і эстэтыку.

Катар "Кірыла Тураўскі" і разліў на Прыпяці.

"Кірылам Тураўскім" па моры Герадота

Выязное пасяджэнне Рэспубліканскага савета: будучыня вёскі

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 1.)

Усё правільна. Аснова маркетынгавага падыходу нескладаная — піяр, прасоўванне брэнда, стварэнне станоўчага іміджу, папулярызацыя культурнага складніка і мясцовых традыцый. З гэтай нагоды ў нас любое мястэчка, любая беларуская вёска мае падставы стаць брэндавым аб'ектам. На якой стадыі знаходзіцца гэты працэс? У тым ліку і на гэтае пытанне члены савета паспрабавалі даць адказ на пасяджэнні савета, што адбылося ў Дварэцкім ГДК (дом культуры знаходзіцца ў гарадскім мікрараёне Дварэц, таму і носіць такое імя).

Гаворка ішла аб дзейнасці клубных устаноў у сучаснай нарматыўна-прававой прасторы (з гэтай нагоды абмяркоўваўся Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры), пра тое, што абласныя цэнтры народнай творчасці (метадычныя цэнтры), якім неўзабаве споўніцца па 80 гадоў, павінны зацвердзіць падчас юбілеяў, што яны былі, ёсць і будуць своеасаблівымі лабараторыямі, дзе апрабуюцца самыя свежыя ідэі і прагназуецца будучыня рэгіянальнай культуры, а значыць, будучыня беларускай вёскі. Але не ўсё тут так гладка, як хацелася б. Аднак на тое і існуе Рэспубліканскі савет, каб дзеянні ў названым кірунку былі каардынаванымі і эфектыўнымі. Як падаецца, вынік такой каардынаванасці — вёска Ляскавічы, што на Петрыкаўшчыне.

Салаўіная анімацыя

Асаблівы дзякуй генеральнаму дырэктару Нацыянальнага парка "Прыпяцкі" Сцяпану Бамбізе. За гасціннасць, за камфартабельны начлег у шыкоўным мясцовым гатэлі, за цудоўныя вясковыя ландшафты і нечаканыя ўражанні. Вось ён ведае, як прасоўваць брэнды: і Нацыянальны парк, і Міжнародны фестываль этнакультурных традыцый "Покліч Палесся", адным з ініцыятараў якога ён з'яўляецца. Прынамсі, мы ў Ляскавічах убачылі красамоўны прыклад маркетынгавага творчага ўзаемадзеяння вёскаўтваральнага Нацыянальнага парку і мясцовых устаноў культуры: Ляскавіцкага ЦКіД ды Музея прыроды; першы — на балансе аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі, другі — на балансе парка. І ўсё гэта "дыхае" непаўторнай мясцовай традыцыяй: адмысловым саламяным жывапісам ды драўлянай разьбой мясцовых рамеснікаў Валянціны Фалеевай і Аляксея Батана (скульптуры апошняга можна пабачыць не толькі на шматлікіх выстаўках, але і на вуліцах Ляскавічаў); унікальнымі тутэйшымі песнямі (Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці нават асобную кніжку выпусціў — "Фальклор прыпяцкага запаведніка", дзе занатаваны традыцыі вёсак Азяраны, Перароў, Пепрароўскі Млынок, Хваенск, Хлупін Жыткавіцкага раёна). Пазалішне казаць, што не існуе ў межах "Прыпяцкага" нейкіх ведамасных бар'ераў: музейшчыкі пастаянна стасункуюцца з клубнікамі ды бібліятэкарамі. Анімацыямі багаты не толькі "Покліч Палесся", нестандартнымі акцыямі адметныя і шараговыя будні мясцовых работнікаў культуры.

Пра нечаканыя ўражанні. Побач з гатэлем — прыстань, ля яе — катар з нечаканым назовам "Кірыла Тураўскі". Мы ўжо пра сон думаць пачалі, але прагучаў катэгарычны заклік: "На катар, адыходзім слухаць салаўёў!" Не буду падбіраць словы, каб дакладна перадаць нашы ўражанні ад нечаканага плавання па Прыпяці падчас разліву (сапраўднае Герадотава мора!) і салаўіны акампанемент. Няма такіх словаў! Для мяне Гомельскае, так бы мовіць, Палессе — малая радзіма. Так што начная вандроўка на "Кірыле Тураўскім" — нібыта вяртанне ў юнацтва. Дзякуй! Так што ў Ляскавічах апрача стацыянарнай сцэны ёсць яшчэ і сцэна, якая не тоне.

Рэчык па дзраве Аляксей Батан.

Алена Шаўчэнка кіруе клубам у Чабатовічах.

Чабатовіцкі цэнтр народнага побыту.

Падчас пасяджэння Рэспубліканскага савета ў Тураве.

Спорт — за культурай

"К" часта бывае на Мазыршчыне. Таму не буду асабліва спыняцца на тым, як сябры савета наведалі замчышча, Музей "Палеская веда". Пра гэтыя аб'екты мы шмат і ўдумліва распавядалі. А пабывалі мы яшчэ ў аграгарадку Рудня Міхайлаўская, паглядзелі, як працуе мясцовы сельскі дом культуры. Працуе бездакорна. Я асабіста даўно ведаю начальніка аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Ірыну Міронычаву. Як мне падаецца, яна — адна з самых дасведчаных кіраўнікоў. А Мазыршчына — раён больш чым асаблівы, мае трывалую ды прыбытковую прамысловасць. Дык вось, і культура тут — адпаведная.

Чым запомнілася Рудня Міхайлаўская? Тым, што СДК мае спартыўную залу, з інвентаром і футбольнай разметкай. Цудоўна! Трэнажорныя пакоі сустракаюцца шмат у якіх клубных установах краіны, а вось такую спартыўную раскошу, як у згаданым аграгарадку, бачыць даводзіцца досыць рэдка. Зразумела, гэта спадчына савецкага часу. Але ашчадна захаваная для нашчадкаў.

У Мазыры мы пабывалі ў Палацы культуры нафтаперапрацоўчага завода. Ірына Міронычава зазначыла: "Мы — калегі, а не канкурэнты". Кіруе ўстановай Аляксандр Буры, называе яе працягам завода — цэхам добрага настрою. Мне спадабалася тут тое, што сцены палаца ўпрыгожваюць вялікія фотапартрэты артыстычных клубных дынастый. А вось гэта ўжо маркетынгавы падыход да стварэння іміджу ўласнай установы культуры. Нашым клубам гэтага не стае хранічна. Падобную фотагалерэю бачыў толькі ў Шклоўскім РДК.

А была яшчэ дарога на Гомель, якая запомнілася дакументальнай стужкай пра палескі край, якую мы прагледзелі ў салоне бусіка. Азёры, рэчкі, балацянкі, знятыя з вышыні птушынага палёту, сапраўды нагадвалі бясконцае люстранае мора, у якім адбівалася ласкавае беларускае неба. У Тураве нам распавялі, што адзін з каменных крыжоў адным часам перастаў расці. Людзі напалохаліся (чым, маўляў, мы Бога прагнявілі?) і супакоіліся толькі тады, калі крыж зноў пачаў павялічвацца. У свае гады я пачынаю разумець, што ступень пяшчотнасці неба і росту каменных крыжоў залежыць ад стану душы не асобна ўзятага чалавека, а ўсёй грамады ў цэлым. Варта толькі шанаваць вытокі, якія мацуюць нашы крыжы…

У адрамантаваным Гомельскім абласным цэнтры народнай творчасці давялося сустрэцца з неглюбскай ткачыхай Людмілай Кавалёвай. Яна ткала калісьці вясельны ручнік для майго малодшага сына.

Не аптымізацыя, а ўзбуйненне

Так, у вёсцы Чабатовічы, што на Буда-Кашалёўшчыне, пра аптымізацыю не думаюць, наадварот — дбаюць пра ўзбуйненне клубнай установы. Але пра ўсё па парадку.

Больш за тры дзясяткі гадоў працуе на культурнай дзялянцы Алена Шаўчэнка, кіруе клубам у Чабатовічах. І ці не ўвесь гэты немалы час выношвае думку: адзін клуб — гэта сумнавата, трэба яшчэ хату выкупіць і ўладкаваць там музей сялянскага жыцця-быцця, ды такі музей, каб жывым быў. Калі марыш па-сапраўднаму — жаданае здзяйсняецца. Грошы на хату збіралі ўсім светам, райвыканкам дапамог значна.

Цяпер "стары" ДК выкарыстоўваецца як глядзельная зала. А асноўная дзея — у клубным "філіяле", які называецца "Цэнтр народнага побыту". Па яго падворку ходзяць куры, дзесьці ў стайні засяроджана дыхае конь, у печы даходзіць хлебны каравай, у студні — смачная вада, а ў возеры за гаклопату, ды купіла парася" не мае ў дадзеным выпадку ніякага сэнсу. Ну як можна не ганарыцца такімі людзьмі? Іх як наглядны дапаможнік самаадданасці варта паказваць будучым маладым спецыялістам ва Універсітэце культуры і мастацтваў.

Адна толькі заўвага. Канешне, датычная піяру, дакладней — яго адсутнасці. Новая ўстанова культуры існуе ў Чабатовічах з 2005 года. А мы пра гэта нічогенька не ведаем. Шкада! Гэта якраз той досвед, пра які варта біць ва ўсе званы. Не для паказухі, а дзеля сцвярджэння факта: вёска жыве і чэрпае для гэтага гаючыя сілы з крыніцы беларускай народнай традыцыі. Такім чынам, Чабатовічы — таксама вёска будучыні. Сюды трэба вазіць экскурсіі з усёй Беларусі, паказваць ды расказваць, хто мы такія, дзе і як выраслі і куды рушым.

Слова заключнае

"Адноўлены ды абноўлены" Рэспубліканскі савет па пытаннях клубнай дзейнасці і народнай творчасці толькі пачынае працу. Наступны выезд, наколькі ведаю, запланаваны на Брэстчыну. Цалкам згодны з Алегам Хмяльковым, адказнасць на сябрах савета — вялізная: па абагульненні станоўчага досведу, выпрацоўцы алгарытму клубных намаганняў і захаванні нашай вёскі. К

Прычына суму — аднастайнасць. Каб не сумаваць, парыжане прыдумалі Музей каналізацыі (самы сапраўдны фрагмент 2000-кіламетровай падземнай сістэмы). А ў шведскім Стакгольме ёсць Музей танца з жывой харэаграфіяй (рэжысура яе залежыць ад часіны года). Музеем сняжынкі ганарацца на японскім востраве Хакайда. Бадай, самы арыгінальны — Музей хлусні ў горадзе Кюрыц (Германія). Чым можам пахваліцца мы?..

Удзельнікі ўзорнага ансамбля цымбалістаў "Спадчына".

На сцэне джазавага фестывалю-конкурсу "Птушка".

Летні "бум", дамок для кнігі і Цэнтр спадчыны

Яўген РАГІН

Падчас заключнага канцэрта конкурсу "Зоркі Палесся".

Прарэктар па навуковай рабоце **Беларускага** дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Віктар Языковіч паведамляе: *"Пры падтрымцы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь праведзена XI Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Культура. Навука. Творчасць", прысвечаная Году навукі. Гаворка ішла пра ацэнку сучаснага стану нацыянальнай культуры і мастацтва і вызначэнне тэндэнцый іх развіцця ў сусветным культурным працэсе, распрацоўку навуковага забеспячэння работы ўстаноў культуры. Навукоўцы з Украіны, Беларусі, Расіі, Казахстана, Літвы, іншых краін прадставілі вынікі даследаванняў у культуралогіі, музеязнаўстве, бібліятэчнай справе, кампаратыўным мастацтвазнаўстве, у тэорыі, методыцы і арганізацыі сацыякультурнай дзейнасці, сацыяльнай філасофіі, паліталогіі…"*

Пра клопаты Культурнай сталіцы Беларусі-2017 распавяла загадчык аддзела абслугоўвання **Бабруйскай** цэнтральнай гарадской бібліятэкі імя Максіма Горкага Валянціна Нікіціна. Дзейнічае літаратурная гасцёўня "Бабруйскі почырк", якой амаль пяць гадоў. Бібліятэка, як магнітам, прыцягвае таленавітых людзей: паэтаў, фатографаў, музыкантаў, журналістаў, мастакоў. Днямі ў гасцёўні чытачоў чакала чарговая музычна-паэтычная праграма.

Мастацкі кіраўнік Цэнтра культуры і дасугу Ленінскага раёна **Бабруйска** Антон Тацькоў распавёў пра ўзорны ансамбль цымбалістаў "Спадчына", што дзесяць гадоў дзейнічае пры названай установе. Кіруе калектывам цымбалістка і педагог Сняжана Смолерава. Юбілейны канцэрт "Спадчына" дала на сцэне Магілёўскага абласнога тэатра драмы і камедыі імя Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча.

У краіне распачаўся летні фестывальны "бум". Сёння фэст **"Гальшанскі** замак-2017" стартаваў у аднайменным аграгарадку **Ашмянскага** раёна. Мерапрыемства прысвечана 595-годдзю з часу ўступлення ў шлюб Соф'і Гальшанскай — родапачынальніцы дынастыі Ягелонаў. Фэст сабраў аматараў сярэднявечнай культуры і прыхільнікаў рыцарскіх турніраў.

20 мая пройдзе і VIII Абласны фестываль народнай музыкі "Зайграйце, музыкі!" у Палацы культуры **Ліды**. Выступяць дарослыя і дзіцячыя аркестры народных інструментаў, ансамблі музыкі і песні. А **Лідская** дзіцячая школа мастацтваў правяла Абласны адкрыты джазавы фестываль-конкурс "Птушка". Першае такое мерапрыемства адбылося ў 2013 годзе. Сёлета ў конкурсе саперничалі 130 юных удзельнікаў з 26 навучальных устаноў краіны.

18 — 20 мая на **Любаншчыне** ладзіцца XI Абласны фестываль дзіцячай тэатральнай творчасці "Чароўны куфэрак". Сёлета праекту споўнілася 20 гадоў. 17 творчых калектываў з гарадоў і мястэчак выступілі на сцэнах **Сароцкага** СДК і Любанскіх цэнтра культуры і дзіцячай школы мастацтваў.

Заўтра завершыцца XXIV Міжнародны фестываль песні і музыкі "Днепроўскія галасы ў **Дуброўне**".

Наша сталая аўтарка Галіна Гашчук са **Століна** піша пра заключны канцэрт раённага конкурсу сучаснага эстраднага мастацтва "Зоркі Палесся", які адбыўся ў гарадскім парку. Сцэнарый дзеі стварыла намеснік дырэктара **Рэчыцкага** ГДК Валянціна Палхоўская.

Сям'я Грахоўскіх з **Мінска** піша пра свае ўражанні ад экскурсіі ў **Чырвоны Бераг Жлобінскага** раёна. Экскурсанты наведалі палац Козел-Паклёўскіх і мемарыял, прысвечаны малалетнім вязням фашысцкага канцэнтрацыйнага лагера.

Работнікі сельскага дома культуры аграгарадка **Райцы Талачынскага** раёна сумесна з супрацоўнікамі аўтаклуба рыхтуюцца да рэалізацыі праекта "Лета на календары". Яны прыйшлі ў школу, як паведамляе вядучы метадыст **Віцебскага** абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці Ала Лялькіна, і прапіярылі свае культурныя паслугі. Падчас перапынкаў школьнікі пазнаёміліся з клубам аматараў фальклору "Забава", развучылі народныя гульні, прынялі ўдзел у міні-дыскатэцы.

Лельчыцкая цэнтральная раённая бібліятэка падрыхтавала тэматычную праграму "У нас у сям'і ўсе сябруюць з кнігай". Для чытачоў прадугледжаны салон псіхалагічнай дапамогі з кансультацыямі псіхолагаў, урачоў, юрыстаў.

Метадыст аддзела бібліятэчнага маркетынгу **Дзятлаўскай** раённай бібліятэкі Марына Бортка піша: *"**Казлоўшчынская** гарпасялковая бібліятэка арганізавала выставу "Вайна вачыма мастакоў", запрасіла на мерапрыемства школьнікаў і ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. Падобныя акцыі прайшлі як у раённай, так і ў **Хвінявіцкай**, **Вензавецкай**, **Жукоўшчынскай**, **Дварэцкай** сельскіх бібліятэках".*

Загадчык філіяла № 2 "Цэнтр спадчыны" **Гродзенскага** гарадскога цэнтра культуры Святлана Палчанкова распавядае пра тое, што гэтая ўстанова набірае папулярнасці ў гродзенцаў і турыстаў. "Цэнтр спадчыны" адкрыўся летась у гістарычнай частцы Гродна. Гэта — комплекс павільёнаў, майстэрняў, выставачных залаў, дзе працуюць народныя майстры, ладзяцца мастацкія выставы, пленэры, народныя святы, канцэрты. Днямі, да прыкладу, прайшло свята льну.

На пагранічнай заставе "Сямёнаўка" з запрашэннем пагранічнікаў заставы "Русакі" работнікі культуры **Бераставіцкага** раёна правялі канцэртна-забаўляльную праграму "Дзембель-2017". Пра гэта паведаміла бібліятэкар філіяла **"Лішкаўская** сельская бібліятэка" Зоя Хлебнікава.

Аграгарадок **Залессе**, што на **Смаргоншчыне**, стаў месцам правядзення свята народнай творчасці "Таямніцы бабулінага куфэрка". Загадчыца аддзела традыцыйнай культуры "Раённы дом рамёстваў" Таццяна Гобач распавядае: *"Такім чынам рэалізоўвалася партнёрская ініцыятыва "Творчая майстэрня. Залескія сувеніры". Майстры Ірына Маеўская, Аляксандр і Людміла Мускія, Дзяніс Маркаў, Уладзімір Навіцкі, Ніна і Паліна Кянько, Наталля Логач прэзентавалі на выставе свае вырабы. Кожны з гасцей выбраў сувенір на свой густ".*

Бібліёбус наведаў вёску **Каменка**. Разам з бібліятэкарам мабільнай установы Галінай Аніхоўскай завіталі сюды і супрацоўнікі **Ашмянскай** раённай бібліятэкі. Чытачам прапаноўваліся не толькі кніжныя навінкі, але і відэаролікі. Пра гэта напісала загадчык аддзела абслугоўвання і інфармацыі Ашмянскай райбібліятэкі Святлана Галінская.

Загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу **Зэльвенскай** раённай бібліятэкі Вольга Камякевіч распавядае: *"У **Князеўскай** сельскай бібліятэцы ўдзельніцы аматарскага аб'яднання "Сучасніца" сустрэліся з зямлячкай Валянцінай Дзерачэнік. Валянціна Станіславаўна — майстар на ўсе рукі. Можа шкліць вокны, класці плітку, займаецца садам і гародам, а яшчэ — вышывае крыжыкам".*

Там-сям у **Навагрудку** з'явіліся мініяцюрныя дамкі. Жывуць у іх… кнігі. Сутнасць своеасаблівых бібліятэчак простая: любы ахвотны можа ўзяць асобнік, а ўзамен пакласці свой. *"Гэтым праектам,* — піша загадчык аддзела Навагрудскай райбібліятэкі Фаіна Малюжэнец, — *мы далучыліся да руху па стварэнні міні-бібліятэк пад адкрытым небам (да слова, у ім занятыя 16 тысяч бібліятэк з 60 краін свету), прычым кнігаабарот адбываецца без удзелу сацыяльных сетак. Задача — даць чалавеку магчымасць чытання ў любым месцы і ў любы час. Ідэя рэалізаваць праект у Навагрудку належыць "маладзёжнаму парламенту" пры раённым Савеце дэпутатаў. Домікі зрабілі і ўсталявалі супрацоўнікі ЖКГ, а мы расклалі ў іх першыя кніжкі. Вось такі тройчы саюз дзеля кнігі і чытання".*

К

З "Куфра-радцы"

Свята бульбы

Панадворак з агароджай. На агароджы — ручнікі, жбаны. Намаляваныя вялікія калараднскія жукі прыбітыя да забору. На вазу ляжаць мяшкі з бульбай. У драўляным карыце насыпана дробная бульба. На лавах сядзяць удзельнікі калектываў. Побач — сталы, дзе гаспадыні прапануюць свае стравы (амаль усе стравы з бульбы). На імправізаванай пляцоўцы ідзе выступленне. Тэатралізаванае прадстаўленне вядуць: Ганна, Хвядот, Кабета. Хвядот ляжыць каля мяшкоў з бульбай, накрыўшыся мешкавінай.

Ганна: Дзень добры, Ганнаю завуся.
На Беларусі пчолы, як гусі.
А ў Шуміліна бульба, што гарбузы,
Дык мы прывезлі цэлыя вазы.
(З натоўпу выходзіць Кабета, якая хоча купіць бульбу.)
Кабета: Нават так крычыш, што вушы залажыла.
Ганна: Гады ў рады, вось бульба ўрадзіла.
Кабета: А што за бульба гэта?
Ганна: Не бачыш, мілая, — "Адрэта".
Кабета: Ой, не мані, сяброўка,
Тут бульба — "Саракоўка"!
Ганна: "Крыніцы" — гаспадарка ля Дзвіны.
У нас там бульба, нібы валуны.
Працуюць у гаспадарцы плённа,
Бо бульба — брэнд раёна.
Кабета: Колькі гатункаў?
Ганна: Дванаццаць будзе.
На продаж ідзе вашым людзям.
("На кірмашы" — тэатралізаваная праграма з жартамі, песнямі, прыпеўкамі, танцам "Бульба", усё выконвае народны фальклорны калектыў "Гульбічы" ДУК "Шумілінскі раённы цэнтр культуры".)
Ганна: Не ўсё ўсходзіць, што сееш,
Не ўсе прадасі, што мееш.
(Кабета пад нагамі ўбачыла Хвядота.)
Кабета: А хто ляжыць, вось тут, ды дагары нагамі?
Ганна: Хвядот з Шуміліна, прыехаў з намі.
Кабета: Накрыўся, бачыш ты, мяшком, ляжыць цішком.
Ганна: З дарогі стаміўся, таму разваліўся.
Кабета: Які гаспадар, такі і тавар.
Ганна: Сёння пуста, заўтра густа.
Кабета: Ідзі ў натоўп, вазьмуць твой боб *(паказвае дробную бульбу). (Узнімаецца Хвядот.)*
Хвядот: Ад вашых сварак баліць ужо карак!
Кабета: У торгу гневу няма.
Хвядот: Бяры хутчэй, аддам дарма.
Кабета: Лепей ніякая, чым такая:
І дробная, і крывая.
(Народны ансамбль "Абалянка" Обальскага ГДК выконвае песню "Бульбачка" (на словы Любові Казачонак і музыку Уладзіміра Асадчага).)
Ганна: Бульбу прадаць трэба, во дзе ліха.
Хвядот ляжыць…
Кабета: Што за шуміха?
Чаму маўчыш, Хвядот,
Вады набраўшы ў рот?
Хвядот: На мокрай пашы бульба не расце, як наша.
Ганна: Не прыкладзеш рукі, з'ядуць яе жукі.
Кабета: Вазьму вось гэты мех.
Хоць бульба, як арэх,
Ляжала на святле ці дзе на пожні.
Хвядот *(у натоўп)*: Мяшок жа выбрала парожні.
(Аўтарскую песню "Бульба" выконвае Аляксандр Петухоў.)
Ганна: Усіх з далёкага краю Гарадок частуе караваем.
А мы натоўпу прапануем з Шуміліна картоплю.
Кабета: Плач, галасі, гляджу, рады не дасі.
Хвядот: Не кожная курачка — чубата,
Не ў кожнага бульбачкі багата.
Кабета: Паспрабуй, прадай яшчэ свой ураджай.
Хвядот: Урадзіў, не ўрадзіў, яшчэ голы не хадзіў.
Кабета: Хваляцца з кірмашу едучы з грашыма.
Ганна *(кабеце)*: Прэч пайшла, не стой перад вачыма.
Кабета: Бульбу прадасі, а грошы праясі.
Ганна: Ніхто не ведае, як хто абедае.
Кабета: Добрая гаспадыня і падносіць
І, каб пілі-елі папросіць.
Хвядот: Паслухай, галубачка,
У нас сем страў, ды ўсе — бульбачка.
(Вакальная група народнага хора "Світанак" ДУК "Шумілінскі раённы цэнтр культуры" выконвае песню "Бульба".)
Хвядот: Ці памятаеш, Гануля,
Як у бульбоўніку гулялі мы ў гулі?
Ганна: Што ты, Хвядот? Не смяшы народ.
Твая маці, мая маці елі бульбу ў адной хаце.
Кабета: Хто пра што, а вы ўсе пра бульбу вядзеце гаворку…
Вельмі сумна на вашым панадворку.
Хвядот: Прыйшла пара ісці з двара.
Часцей бы святы!
Кабета *(у натоўп)*: Такое кажа толькі гультаваты.
На ўсё свой час, на ўсё сваё надвор'е.
Хвядот: Мы ўсім жадаем берагчы здароўе.
Ганна: А на шляху каб не было вам слізка.
Хвядот *(кабеце)*: Паедзем у Шуміліна, тут блізка!
(Песню "Бульба, бульбачка" выконвае народны ансамбль "Абалянка" Обальскага ГДК.)

Аўтар сцэнарыя — намеснік дырэктара Шумілінскага РЦК Людміла ДАРЗНЕК

Рэпарцёрскі марафон

Крок да фэст-сталіцы Паазер'я

На Глыбоччыне прайшоў I Фэст дударскіх рэгіёнаў / Частка II

(Заканчэнне. Пачатак у № 19.)

У касцёле Беззаганнага Зачацця Найсвяцейшай Дзевы Марыі ў вёсцы Удзела на Глыбоччыне пачынаецца ранішняя служба. Прыхаджане чакаюць уступ аргана, калі цішу храма пранізваюць высокія гукі дуды. Усе ўстаюць — па цэнтральным праходзе ўрачыста крочыць шатландскі дудар, і мелодыя інструмента запаўняе прастору. Дудар праходзіць у першы шэраг і змаўкае. І тады іншая дуда пачынае свой рэй — беларускі музыка крочыць праз храм у зацікаўленай і здзіўленай радасці тых, хто прыйшоў на імшу. Калі ён займае месца побач з калегам з Шатландыі, уступае дуда бельгійца…



Шатландская дуда ў беларускім касцёле.

Пэтр Сов'як з Маравіі (Чэхія).

Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Мінск — Глыбоцкі раён — Мінск

Нечаканае яднанне

Фестываль "Дударскі рэй" завітаў у вёску Удзела, каб спалучыць у нядзельнай службе касцёла беларускія традыцыі, і тое атрымалася незабыўна — дуда стала жывой музычнай аздобай імшы.

— Але мяне ўжо абазвалі "нехарошым чалавекам", — каментуе выступленне ў касцёле ініцыятар фэсту і музыка Віталь Воранаў. — У Беларусі ёсць дудары, якія ставяцца падазрона да падобнага спалучэння. Але я бачыў службы з удзелам дудароў у Славакіі, Польшчы, — і тое не падалося блюзнерствам. Наадварот — імшы прайшлі ва ўзнёслай атмасферы, прыгожа і арганічна.

Сапраўды, калі на ўласныя вочы бачыш, як стрымана і ўрачыста гучыць дуда ў касцёле, усе сумневы наконт яе прысутнасці ў храме сыходзяць. Пакідаюць уражанне і светлыя твары прыхаджан, і шэпт бабулек: "Дудары ідуць!" Каб пераканацца, што дударская традыцыя зусім не "чорт з гарохам" для мясцовых людзей, варта пабываць на падобнай імпрэзе. Калі адзін з маравакаў, сыграўшы мелодыю, прыпадае на калені, каб прыняць камунію, мясцовыя адчуваюць еднасць з госцем.

Вяртанне як праект

Паўсюль, дзе выступалі дудары ў сваім туры па Глыбоччыне ў межах фэсту, іх чакала ўважлівае стаўленне і вось гэтае адчуванне таго, што так і мае быць. Калі гукі дуды скаралі дзіцячую публіку ў школцы імя Ігната Буйніцкага ў Празароках, у згаданым уздзельскім касцёле, у Мосары, у прасторы шыкоўнага парка, створанага ксяндзом Ёзафам Булькам, ля магілы слыннага рупліўцы… Ды нават у санаторыі "Пліса", новым комплексе ля Празарокаў, дзе публіка, што прыехала адпачыць, усё больш з Расіі, — паўсюль дуду ўспрымалі прыязна і з цікаўнасцю. Як нечаканую госцю, у якой пазнаеш шляхетную постаць.

Выступленне капэлы з Вялікапольшчы ў Мосары.

— Я бачыла падобны інструмент у маёй вёсцы, — рэагуе на ўнікальную вялікапольскую "сэршэнку" настаўніца са школы ў Празароках. "Сэршэнка" (ці "сесенька") — адзін з найстаражытных інструментаў Еўропы, што мае паходжанне з X — XIV стагоддзя. Яна робіцца з пульхіра свінні, мае два "мяхі", і звяртае на сябе ўвагу нязвыкла высокім гучаннем.

— У нас падобную дуду рабілі са страўніка цяляці, якое п'е толькі малако, — удакладняе жанчына падчас выступлення вялікапольскай капэлы ў празарокскай школе. — Я бачыла такі інструмент, калі была дзяўчынкай.

Вось калі пераконваешся, што Глыбоччына — дударскі край. І калі праект Воранава ўдасца раскруціць, апошні мае атрымаць, падаецца, не толькі сімвалічныя дывідэнды.

Музей, указальнікі, школа

— Каб замацаваць дуду за Глыбоцкім раёнам, выношваем і ідэю стварэння музея дуды, — дзеліцца сваім пражэктам руплівец. — Па папярэдняй дамоўленасці ва Удзеле нам згодныя прадаставіць дамок, дзе раней жыў арганіст. Ён належыць францысканам, але зараз пустуе. У хатцы дастаткова зрабіць адзін пакойчык, а далей гэты куток можна развіць у больш паўнавартасны музей, які мог бы стаць філіялам Глыбоцкага краязнаўчага.

Візаві адзначае, што "музейнага матэрыялу" ў беларусаў для падобнай ініцыятывы дастаткова. "І дуды знойдзем, і рэканструкцыю зробім, і знакавыя фотаздымкі для рэгіёна збяром, літаратурныя, этнаграфічныя крыніцы… — пералічвае ён. — Галоўнае, паразуменне паміж усімі партнёрамі".

У дудара прадугледжаны і наступны крок — стварэнне табліцаў на ўездзе ў Глыбоцкі раён з надпісам "Дударскі рэгіён". У больш далёкай перспектыве — помнік памяці дудара Адама Шульгі з тэатральнай трупы Ігната Буйніцкага. "Каб усё гэта ўдалося ажыццявіць, атрымаўся б цалкам завершаны праект", — адзначае ён. Імпэту Віталя Воранава, які з'яўляецца і аўтарам кнігі "Дударская Глыбоччына", можна пазайздросціць. Галоўнае, каб адгукнуліся на ідэю культурна-крэатыўнага праекта мясцовыя ўлады.

Дарэчы, у час фестывалю адзін з нашых дудароў — Сяргей Чубрык — падараваў Глыбоцкай дзіцячай школе мастацтваў жалейку, зробленую ўласнымі рукамі. Казаць пра вывучэнне дуды як музычнага інструмента ва ўстанове пакуль яшчэ зарана, але гэты крок таксама можна лічыць прапановай аб супрацоўніцтве ад няўрымслівых дудароў.

"Дударскі…" ці "Вішнёвы…"? Абодва!

— Не ўсё адразу, — дала каментарый "К" на агучаныя ініцыятывы начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Глыбоцкага райвыканкама Таццяна Тарасевіч па завяршэнні фестывалю. — Сёння ў школе мастацтваў на жалейцы ўжо вучыцца

Эфект кніжнага "стартапа"

Раскладаем па палічках: падзея з сацыяльным партнёрам

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 1.)

— Напрыклад, мы змаглі "дагрукацца" да знакамітага выканаўцы Яна Жанчака, да іншых артыстаў, якія выступілі перад наведвальнікамі бясплатна, — кажа Наталля Башкірава. — Ахвотна адгукнуліся на прапанову паўдзельнічаць у "Бібліяночы" і студэнты ўніверсітэта культуры і мастацтваў (іх было каля 50 чалавек), і студэнты педуніверсітэта імя Максіма Танка, якія паказалі калекцыі авангардная моды, і рок-гурты, і дзіцячы тэатр сталічнай ДШМ № 2 ды многія іншыя... Гэта ды многае іншае арганізавалі дзякуючы асабістым кантактам.

Натуральна, сувязі не бяруцца з паветра. Па словах суразмоўцаў, для таго, каб стварыць базу кантактаў, бібліятэкарам трэба бываць на мерапрыемствах, знаёміцца з цікавымі людзьмі, прапаноўваць ім супрацоўніцтва калі не цяпер, дык у перспектыве.

Як прымусіць застацца?

Гэта яшчэ адзін важны момант паспяховага сацыяльнага праекта.

— Чалавек прыйшоў на "Бібліяноч" ці на фестываль "Горад і Кнігі", і ён не павінен пашкадаваць аб тым, што завітаў у бібліятэку, — кажа Вольга Воўк. — Таму трэба стварыць ва ўстанове культуры такую атмасферу свята, каб кожны мог адшукаць тут нешта для душы. А для гэтага, натуральна, трэба запланаваць як найбольш тэматычных пляцовак, запрасіць на свята знакамітасцей (скажам, мы змаглі праз асабістыя сувязі нашых партнёраў "зацягнуць" да нас вядомую пісьменніцу Вольгу Грамыка) або абраць цікавую тэму для падзеі — напрыклад, прысвечаную кніжным коміксам.

Падчас фестывалю "Горад і Кнігі", 2015 год. / Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ з архіва "К"

Скажам, падчас "Бібліяночы" ў Нацыянальнай бібліятэцы працавала 14 тэматычных зон для дзяцей, моладзі і людзей сталага веку. Такая колькасць разнастайных пляцовак, кажа Наталля Башкірава, — вынік узаемадзеяння з сацыяльнымі партнёрамі.

— Асаблівую ўвагу надавалі маладому пакаленню, каб данесці да іх простую думку: не ўсё сёння можна "прагугліць", — кажа візаві. — Таму знаёмілі ахвотных з магчымасцямі, якія прадастаўляе Нацыяналка карыстальнікам, піярылі дзіцячую пляцоўку, ставілі лялечныя спектаклі...

Акрамя таго, па словах Башкіравай, аказваецца, мала хто ведаў, што ў музеі кнігі кожны можа ўбачыць старадрукі мінулых стагоддзяў, а ў фондах Нацыянальнай бібліятэкі захоўваецца багатая калекцыя вінілавых пласцінак.

А што ў рэгіёнах?

Натуральна, у сталіцы нашмат больш магчымасцяў для таго, каб зладзіць маштабную імпрэзу з разлікам на дапамогу сацыяльных партнёраў. Але і ў раёнах зрабіць цікавую акцыю ў бібліятэцы цалкам магчыма.

— У сталіцы бібліятэкі ўжо не маюць манаполіі на правядзенне літаратурных вечарын, кніжных фестываляў, сустрэч аўтараў з чытачамі, а ў раёнах Беларусі ўсё гэта яшчэ цалкам магчыма, — кажа Вольга Воўк. — Таму поспех на рэгіянальным узроўні, на мой погляд, рэальны і нават прадказальны. Асабліва калі адшукаць у сваім горадзе цікавых людзей, апантаных тым або іншым хобі, майстроў народнай творчасці, хэнд-мэйду... І тут вельмі можа дапамагчы збіранне звестак па краязнаўстве або інфармацыя пра знакамітых людзей горада.

Як лічыць Вольга Воўк, падобныя мерапрыемствы абавязкова маюць праходзіць у бібліятэках, але, натуральна, як разавыя акцыі.

— Час сёння імкліва змяняецца, і з дапамогай такіх акцый, як "Бібліяноч" або кніжны фестываль, бібліятэкары ламаюць стэрэатыпы пра тое, што ў бібліятэцы павінна быць цішыня, і што людзі, якія там працуюць, — нецікавыя асобы, якія ўмеюць толькі перастаўляць кнігі з месца на месца, — адзначыла суразмоўца. — Акрамя таго, гэтыя разавыя акцыі ўплываюць на станоўчы імідж бібліятэк, а яны самі рэкламуюць сваю дзейнасць і прыцягваюць увагу новых наведвальнікаў, прапаноўваючы ім жывыя стасункі з жывымі людзьмі, чаго ў эпоху гаджатаў не стае.

Важны тут яшчэ адзін момант, на які звярнула ўвагу Наталля Баш-

граць хлопчык, тое было выдатнай прапановай, але такія сур'ёзныя ініцыятывы, як стварэнне музея дуды, патрабуюць часу. Ды і помнік Адаму Шульгу можа з'явіцца, мяркую, толькі на пяты фестываль, — мы ж правялі толькі першы.

Тым не менш, поспех I Фестывалю дударскіх рэгіёнаў Таццяна Тарасевіч прызнае і шчыра вітае ініцыятыву. "Фестываль атрымаў мноства станоўчых водгукаў, і мы рады, што Глыбоччына пабагацела на такую міжнародную імпрэзу. Колькасць мясцовых форумаў нас не засмучае, — адказвае яна на пытанне наконт суседства "Дударскага рэя" з "Вішнёвым фэстам". — Наадварот, толькі вітаем. Гэта розныя мерапрыемствы, кожнае з якіх вылучае сваю лінію: "Вішнёвы фэст" — папулярызуе нашу кулінарную традыцыю. Фэст дударскіх рэгіёнаў — музычную. Так, весці некалькі мерапрыемстваў — складана, але чаму Глыбокае не можа стаць фестывальнай сталіцай Паазер'я?" — слушна адказвае Таццяна Тарасевіч.

Што да кульмінацыі Першага "Дударскага рэю", то ёй стаў вялікі Гала-канцэрт на Цэнтральнай плошчы мястэчка, што сабраў разам не толькі беларускіх і замежных дудароў, але і мясцовыя калектывы. Не прамінуць увагай удзячную публіку імпрэзы, якая з вялікай цікаўнасцю рэагавала на выступленні ўдзельнікаў нават у дождж. Своеасаблівы фармат фэсту, варта адзначыць, патрабуе больш уважанай рэжысуры свята і стылёвых рамак, — не адмоўлюся ад невялікіх заўваг са свайго боку. А форум прагучаў важным і ладным праектам на карце культурных падзей не толькі Глыбоччыны, але, бадай, і ўсёй Беларусі.

"Хэлоў! Мы прыехалі з Нью-Ёрка паглядзець на Глыбокае. А ці можна папрасіць у вас праграму фестывалю?" — яшчэ на пачатку імпрэзы звярнуліся да Віталя Воранава падчас майго інтэрв'ю з ім відавочна нетутэйшыя турысты. А яшчэ Віцебск, Мінск, Паставы… Гэта толькі тыя цікаўныя госці, з якімі давялося пазнаёміцца асабіста. Што казаць, дуда сапраўды вядзе рэй.

К

кірава: падобныя мерапрыемствы карысныя і чытачам, і бібліятэкарам, і сацыяльным партнёрам.

— Справа ў тым, што тыя ж сацыяльныя партнёры часам не ў стане зладзіць актыўную рэкламную кампанію ў СМІ, а бібліятэка прадастаўляе ім такую магчымасць, — адзначыла Наталля Башкірава. — Пры такой умове ўсе застаюцца ў выйгрышы. Так што за сацыяльным партнёрствам, на мой погляд, — бібліятэчная будучыня.

■■■

Бібліятэкі займаюць асаблівае месца ў сістэме сацыяльнага партнёрства. Інстытуцыя, шчыльна звязаная з дзяржавай, яны, па сутнасці, выступаюць формай арганізацыі грамадскіх ініцыятываў, становяцца каталізатарамі актыўнасці чытачоў. Так што іх дзейнасць у галіне сацыяльнага партнёрства будзе актуальнай заўсёды. Іншая справа, што не ўсялякі аддзел маркетынгу той або іншай бібліятэчнай установы сёння можа ўзяць на сябе ролю падобнага аб'яднаўчага і крэатыўнага цэнтра для правядзення маштабных падзей.

К

■ Дарэчы

19 — 20 мая ў Мінску адбываецца чарговы праект Навуковай бібліятэкі БНТУ. Гэтым разам форум "Горад і Кнігі" ўпершыню атрымаў фармат вулічнага кніжнага фестывалю. На ім працуе 5 вялікіх пляцовак: выставачная, дзіцячая, маладзёжная, экспертная, а таксама выстава хэндмэйд герояў з сучасных кніг.

Бярэзінскі "Іван"

Папанаў, Макарава ды іншыя: кінакраязнаўства праз 35 гадоў

2017-ты пазначаны 35-годдзем з часу здымак мастацкай кінастужкі "Іван" (аўтар сцэнарыя — вядомы беларускі пісьменнік Анатоль Кудравец, рэжысёр-пастаноўшчык — Віталь Дудзін, аператар — Анатоль Зубрыцкі). А жыхары Бярэзінішчыны ганарацца тым, што фільм мае "прапіску" адтуль. Што ж адбывалася "за кадрам"?

Калектыў бухгалтэрыі аддзела грамадскага харчавання Бярэзінскага райспажыўтаварыства з Анатолем Папанавым. / Фота з архіва жыхаркі Беразіно Людмілы Сушыцкай

У красавіку — маі 1982 года ў Бярэзінскі раён завітала творчая група кінастудыі "Беларусьфільм" здымаць фільм з удзелам народнага артыста СССР Анатоля Папанава. Стужка гэтая пра лёс франтавіка Івана Клімовіча, каго праз шмат гадоў знаходзіць баявая ўзнагарода. Тады пасля шпіталю ён вярнуўся ў родны калгас. А праз шмат гадоў у пярэдадзень Дня Перамогі франтавіка выклікалі ў ваенкамат…

Прэм'ера адбылася 24 лістапада 1983 года. Галоўная жаночая роля (Мар'я, жонка Івана) у народнай артысткі Беларусі, народнай артысткі СССР Галіны Макаравай. А за ўвасабленне вобраза Івана Папанаў на Усесаюзным фестывалі ў Алма-Аты (1983) атрымаў прыз за лепшую мужчынскую ролю. Цікава, што 60-гадовы Папанаў, сам франтавік, выконваў у фільме ролю равесніка. Артыст не перагружае вобраз эмоцыямі — праўдзівы і арганічны, ён быццам іграе сябе.

Партнёрамі Папанава і Макаравай сталі беларускія акцёры Аляксандр Дзянісаў, Віктар Тарасаў, Фёдар Шмакаў (апошнія двое — таксама народныя артысты СССР). У фільме здымаліся і артысты Бярэзінскага народнага тэатра Анатоль Маскалькоў, Лілія Зубцова, Вера Казак і іншыя. Скажам, Арсен Гаеўскі стаў паштальёнам, які дастаўляе Івану позву ў ваенкамат і вядзе з ім размову. Лёгка і вольна самадзейны артыст валодае словам, без напругі выражае стан персанажа.

Праўда Прыбярэжнага

Так, бярэзінцаў фільм прыцягвае душэўным магнітам. Напрыклад, стужку лічаць сваёй у вёсцы Прыбярэжнае, краявіды якой паслужылі жывой дэкарацыяй: фільм пачынаецца кадрамі ранішняга вясковага пейзажу з рачнымі затокамі, дзе спяваюць салаўі. У водах Бярэзіны, якая працякае паблізу гэтай жа вёскі, Мар'я мые бялізну, вясковыя козы "падарожнічаюць" у лодцы па рацэ. Менавіта тут, у Прыбярэжным, разгортвалася галоўнае дзеянне фільма, тут жылі галоўныя героі. Родным домам для Івана і Мар'і на час здымак стала хата Станіслава і Аліны Славашэўскіх. На сцяне — фотаздымкі ў агульнай драўлянай рамцы, рэпрадукцыя карціны "Тры асілкі". Ля ложка — сціплы насценны дыванок. Этажэрка з сурвэткамі, тэлевізар "Рэкорд", швейная машынка, куфар, на стале трохлітровы слоік малака… Праўда вясковага непрыхарошанага жыцця — не разбаўленага да бясколернасці, а аб'ёмнага, праўдзівага.

У фільме пазнавальная як хата, так і вясковая вуліца. Халадзільнік персанажы карціны, скажам, цягнулі ў дом Баляслава Шпакоўскага, а лазня належала Бельскім. Вароты, якія "штурмаваў" Іван, устанавілі ў Станіслава Славашэўскага, спецыяльна для здымак. У грузавой машыне, якая рухаецца па вясковай вуліцы — кабеты ў квяцістых хустачках едуць на працу і зладжана спяваюць вядомую песню "По Дону гуляет казак молодой". Льецца песні харастро. У кузаве машыны побач з народнай артысткай Галінай Макаравай — нашы землячкі. Радуюць вока дарагія аблічча бярэзінскіх жанчын, сонечная разнастайнасць твараў, сярод якіх буйным планам пакаёўка бярэзінскай гасцініцы Вольга Ермаловіч.

Анатоль Папанаў і Галіна Макарава: кадр з фільма "Іван".

Бананы пад пражэктарам

Многім бярэзінцам пашчасціла пазнаёміцца з вядомымі на ўвесь Савецкі Саюз акцёрамі, а жыхары Прыбярэжнага пэўны час жылі з імі поруч, здзіўляліся іх сціпласці, прастаце, жыццёвай мудрасці. Той жа Анатоль Папанаў не любіў сядзець упустую, захапляўся прыродай. Калі здымалася сцэна, у якой патрабавалася цягнуць халадзільнік, усё не было надвор'я, дык акцёр, каб не марнаваць час, пайшоў слухаць салаўёў. А Галіна Макарава любіла кветкі. "Што ты толькі вяргіні садзіш, — казала яна адной з вясковых жанчын, — я табе іншых кветак прывязу". І слова, дарэчы, стрымала.

У кадрах фільма, якія здымаліся ў райцэнтры, — пабудовы цэнтральнай плошчы, галоўнай вуліцы Кастрычніцкай, камяніцы гасцініцы, Дома культуры, РКБА… Прыцягваюць позірк бярэзінцаў знаёмыя вітрыны камбіната бытавога абслугоўвання, калі Папанаў пераходзіць вуліцу наперарэз светлым "Жыгулям". Вось каля бярэзінскага універсама проста на вуліцы чарга па дзіковінныя тады бананы. На пытанне Івана "Што даюць?", яму бойка адказвае жанчына з чаргі, у якой угадваеш артыстку Бярэзінскага народнага тэатра Веру Казак: "Бананы! Вазьмі сваёй бабцы, ёй якраз па зубах будзе". У ролі іншых пакупнікоў — жыхары Беразіно, сярод якіх выкладчыкі музычнай школы Галіна Каждан, Валянціна Новікава і Вольга Скадорва з шыкоўнай русай касой. Прадавец бананаў — работнік Бярэзінскага райхарча (рэстарана) Лілія Вайчуленя.

Экзатычныя фрукты ў пачатку 1980-х былі ў Беларусі яшчэ ў навінку, таму купіў і насіў па горадзе Іван у хатульку штучныя. Красавік і пачатак мая 1982 года выдаліся не надта цёплымі, таму для "сонечнасці" вулічным кадрам на здымках узмоцнена працавалі пражэктары. Дарэчы, ёсць у фільме яшчэ адзін "гандлёвы" эпізод, які здымаўся на базе магазіна сплаўучастка ў Беразіно. Калонка ж, з якой п'е ваду Іван падчас паездкі ў горад, размешчана ля дома № 19 па вуліцы Перамогі насупраць будынка міліцыі.

Дождж з брандспойтаў

Сцэна прыхода героя ў райсабес здымалася ў будынку аддзела грамадскага харчавання райспажыўтаварыства па вуліцы Аляшкевіча ў Беразіно. Эканаміст Людміла Сушыцкая прыгадвае: "Ранкам 22 красавіка абвясцілі, што ў нас будуць здымаць кадры нейкага фільма і прапанавалі ўсім заставацца на сваіх працоўных месцах. Нас, работнікаў бухгалтэрыі разам з галоўным бухгалтарам Янінай Душэўскай, у рабочым пакойчыку чалавек сем — восем, усе за сталамі, завалены стосамі папер, пануе дзелавы настрой. Святло пражэктараў слепіць вочы. Разгублены Іван (Папанаў) з авоськай з бананамі ўваходзіць у дзверы і коратка прамаўляе: "Добрага здароўечка ўсім! Я наконт пенсіі", — і пачынае сваё блуканне ад аднаго стала да другога ў пошуках патрэбнага спецыяліста... Рэжысёра штосьці не задавальняе, і акцёр робіць некалькі дубляў. Нас уразіла, што здымкі невялічкага эпізода доўжыліся цэлы дзень. На твары Папанава — стомленасць, але пасля здымак акцёр не адмовіўся зняцца на памяць з работнікамі бухгалтэрыі. І, як у сапраўднага артыста, у яго на твары блукала лагодная ўсмешка ветлівасці — лепшыя лекі ад стомы і спустошанасці… А ўвечары прадоўжыліся здымкі, тады для імітацыі непагадзі на шыбы з брандспойтаў лілі ваду. Атрымалася натуральна".

Калі ўручалі ордэн

У сцэнах кінафільма, знятых у будынку райваенкамата, на той час яшчэ драўляным, з доўгім калідорам, цешаць сэрца і позірк постаці ветэранаў, сярод якіх вылучаецца Мацвей Шмэрка ў вайсковай форме падпалкоўніка, з афіцэрскай выпраўкай, нягледзячы на гады, Кандрат Баранаў і статная фігура былой партызанскай радысткі Веры Шрэйн. Да здымкаў сцэны ўручэння Івану Клімовічу ордэна былі далучаны піянеры і школьнікі СШ № 1 Беразіно, сярод якіх — Міхаіл Кудзейка і Сяргей Бурымскі. З замілаваннем глядзяцца кадры фатаграфавання ардэнаноснага ветэрана для газеты з караблём у руках, з кнігай успамінаў маршала Жукава, якія здымаліся ў фотаатэлье Бярэзінскага РКБА. Кадры наведвання Іванам вяскоўца ў бальніцы здымаліся ў нашай гасцініцы "Беразіна". Папанаў у накінутым на пінжак белым халаце, з-пад якога выглядае ордэн, сядзіць у фае другога паверха каля вакна, з якога бачныя плошча і будынак вузла сувязі.

Нарэшце, 28 красавіка ў Бярэзінскім РДК праходзілі здымкі ўшанавання героя фільма. У фае першага паверха грае мясцовы духавы аркестр пад кіраўніцтвам Валерыя Шагойкі. Усе музыканты — у шыкоўнай парадной форме. На трыбуне — Віктар Тарасаў у ролі ваенкама і Аляксандр Дзянісаў, што ўвасобіў першага сакратара райкама. Першы ў ганаровым прэзідыуме на сцэне РДК наш легендарны ветэран, партызанскі камандзір, старшыня раённай ветэранскай арганізацыі Дзмітрый Шрэйн, на лацкане чыйго гарнітура — ордэны Леніна, Чырвонай Зоркі і Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I ступені, медалі. Побач з ветэранамі — моладзь, сярод яе і прыгажуня-харэограф Бярэзінскага РДК Аксана Панкевіч. У зале — Лілія Зубцова з сынам Лёшкам на руках, Валянціна Пытляк, Арсен Гаеўскі і іншыя жыхары Беразіно рознага веку. У сцэнах вулічнага святкавання Дня Перамогі сімвалам ваеннай памяці выступае ў кадры помнік-абеліск воінам 153-й стралковай дывізіі, якая ў ліпені 1944 года фарсіравала Бярэзіну і вызваляла раён на высокім абрыве ля рэчкі на паўночна-ўсходнім ускрайку вёскі Жорнаўка.

■■■

У маі 1982 года ў гарадскім кінатэатры "Юбілейны" адбылася творчая сустрэча бярэзінцаў з Анатолем Папанавым. На высокай ноце даверу і шчырай нязмушанасці народны артыст распавёў пра свой творчы шлях. З натуральна беларускай сціпласцю жартаваў: "Якая я знакамітасць? Ну, трохі вядомы ў нашай сусветнавядомай краіне". Між тым акцёр зняўся ў 70 кіна- і тэлефільмах, выканаў 50 тэатральных роляў. Дарэчы, сёлета спаўняецца 30 гадоў са дня смерці легендарнага акцёра, а 31 кастрычніка — 95 гадоў з дня яго нараджэння.

Пайшлі з жыцця і Папанаў і Макарава, але іх творчасць бессмяротная. Помняць жа акцёраў вёскі Прыбярэжнае, Лешніца, Жорнаўка, райцэнтр Беразіно. Засталіся фільмы — помнікі акцёрскаму майстэрству, і сярод іх блізкі нам фільм з бярэзінскай прапіскай "Іван".

Тамара КРУТАЛЕВІЧ,
загадчык аддзела маркетынгу Бярэзінскай цэнтральнай раённай бібліятэкі

Да Міжнароднага дня музеяў

Каралеўскі замак у Стакгольме.



Царскасельскі арсенал.

Яўстах Піевіч Тышкевіч сёння прадстаўлены ў энцыклапедычных выданнях як "гісторык, археолаг, этнограф, краязнаўца". Адтуль можна даведацца, што ён прыклаў намаганні да ўзбагачэння археалагічнымі артэфактамі "прыватнага музея" ў Лагойску, а таксама з'яўляўся фактычным стваральнікам Віленскага музея старажытнасцяў. Тым не менш, музейная дзейнасць графа Тышкевіча ўяўляе маладаследаваны бок яго біяграфіі. Асабліва гэта тычыцца фармавання разумення музея і музейнай дзейнасці, "уваходжання" ў прафесію.

Паводле плана Берзеліуса

Падарожжа графа Тышкевіча ў Скандынавію і вытокі музейнай прафесіі

Чаму Яўстах Тышкевіч вырашыў стварыць Віленскі музей старажытнасцяў? Якія былі яго погляды на музейную справу? У чым навуковец бачыў яе сэнс? Адказы на гэтыя пытанні дапамаглі б пашырыць наша разуменне феномена першага публічнага музея на землях Беларусі і Літвы, гэтаксама як і зараджэння музейнай справы ва Усходняй Еўропе. На жаль, навуковец не вёў дзённікаў, не пакінуў успамінаў альбо навуковых работ. Тым не менш, з вялікай верагоднасцю можна вызначыць тры крыніцы інфармацыі, якія сфармавалі погляды Тышкевіча на музей: знаёмства з сучаснымі яму ўстановамі; друкаваныя выданні; зносіны з навукоўцамі, музейнымі дзеячамі, калекцыянерамі.

З кабінетаў калекцыянераў

Інтэлектуальнае жыццё Еўропы першай паловы XIX стагоддзя праходзіла ў рэчышчы вальтэрыянства. А Вялікая французская рэвалюцыя ў 1795 годзе спарадзіла першы ў свеце публічны гістарычны музей — Музей французскіх помнікаў у кляштары малых аўгустынаў у Парыжы. Затым падобнага кшталту ўстановы пачалі з'яўляцца ў іншых краінах. Аднак паказ калекцый у першых адкрытых для шырокай публікі музеях аказаўся на нізкім узроўні. Напрыклад, у той час адсутнічалі тэксты ў экспазіцыі. Наведвальнік павінен быў добра разбірацца ў прадстаўленай у музеі тэматыцы, каб папоўніць веды ці атрымаць стымул да развагаў. Спробы арганізаваць працэс камунікацыі, зробленыя ў шэрагу экспазіцый, часта зводзіліся да нуля візуальным "шумам" перапоўненымі несумяшчальнымі прадметамі вітрынамі.

Правілы, якія абмяжоўвалі доступ наведвальнікаў у музеі, не заўсёды былі галоўнай прычынай іх невысокай папулярнасці. Большасць людзей не ўспрымала каноны пабудовы экспазіцый ад кабінетаў і галерэй прыватных калекцыянераў. Прычым яны часта перараджаліся ў неверагодныя гібрыды, якія спалучалі функцыі сховішча, палаца і майстэрні мастака. Тое, што людзі бачылі ў большасці еўрапейскіх музеяў, мала тычылася іх жыцця, а эфект ад агляду ўяўляў кароткачасовы ўсплёск цікаўнасці альбо захаплення.

Яўстах Тышкевіч.



Крыстіян Томсэн вядзе экскурсію ў Музеі паўночных старажытнасцяў.

Першыя гістарычныя

У першай палове XIX стагоддзя ў музейнай справе адбыліся гэўныя змены. Павялічылася колькасць публічных музеяў, пашырылася геаграфія іх размяшчэння, пачаўся працэс драбнення некаторых буйных комплексных музеяў на спецыялізаваныя ўстановы, надавалася больш увагі іх адукацыйнай функцыі. Развіццё спецыяльных гістарычных дысцыплін (археалогіі, нумізматыкі, этнаграфіі) абумовіла з'яўленне музеяў гістарычнага профілю. Цікавасць да вывучэння і прэзентацыі ў экспазіцыях помнікаў мінулага падагравалася настроямі, звязанымі з эпохай рамантызму. Нарэшце, стварэнне шэрагу важных гістарычных музеяў першай паловы XIX стагоддзя наўпрост звязана з нацыянальна-вызваленчым рухам. Такія ўстановы пачалі ўсведамляцца элітамі этнасаў, якія знаходзіліся пад чужаземным прыгнётам ці падвяргаліся агрэсіі з боку моцных суседзяў, як важны інструмент абуджэння самасвядомасці. Адначасова прыйшло прызнанне таго, што музей з'яўляецца найзручнейшай формай захоўвання матэрыяльных сведчанняў мінулага народаў.

Упершыню такія музеі паўсталі на нацыянальных тэрыторыях імперыі Габсбургаў. У 1802 годзе па ініцыятыве графа Ферэнца Сечэні і пры падтрымцы грамадскасці гістарычны музей мінулага вугорскага этнасу быў адкрыты ў горадзе Пешт. Установа адыграла важную ролю ў развіцці самасвядомасці венграў і падрыхтоўцы рэвалюцыі 1848 — 1849 гадоў. Пачынаючы з 1818-га, фармаванню нацыянальнай самасвядомасці чэхаў паспрыяў Нацыянальны музей у Празе, збор якога сведчыў аб іх культурнай ідэнтычнасці. Як і гістарычны музей у Пешце, Чэшскі музей быў адкрыты па ініцыятыве і на сродкі грамадскасці. У 1821-м адкрыўся для наведвальнікаў Нацыянальны музей Славеніі ў Любляне.

Інтарэс да мясцовага

У гэты ж перыяд па ініцыятыве навуковай грамадскасці фармуюцца музейныя зборы на нацыянальных тэрыторыях Расійскай імперыі, у тым ліку ў Беларусі, Польшчы, Літве, Латвіі, Эстоніі, Украіне. Так, знаходзячыся ў роднасных сувязях з магнацкімі родамі былой Рэчы Паспалітай, Яўстах Тышкевіч ведаў пра два найбуйнейшыя прыватныя праекты, якія рэалізоўваліся ў першай палове XIX стагоддзя на этнічных польскіх землях. Гатычная галерэя Станіслава Патоцкага ў Вілянуве, а таксама Святыня Сівілы і Гатычны дом Ізабэлы Чартарыйскай у Пулавах адлюстроўвалі ідэі рамантызму, патрыятызму і ўвасаблялі культ герояў мінулага. Перапіска Тышкевіча з членамі Адэскага таварыства гісторыі і старажытнасцяў сведчыць, што вучоны ведаў пра музеі, што паўсталі ў той час на месцы правядзення раскопак у Паўночным Прычарнамор'і.

На беларускіх землях у першай палове XIX стагоддзя таксама назіралася актывізацыя прыватнага калекцыянавання гістарычных помнікаў. Гэтая дзейнасць стварала перадумовы для ўзнікнення першых публічных збораў. Сярод калекцыянераў — Мікалая Румянцава ў Гомелі, Адама Гюнтара ў Дабраўлянах, Івана Сабольшчыкава ў Віцебску, Міхаіла Гаўсмана ў Мінску — узмацнілася цікавасць да айчыннай культуры і гісторыі. Яны фармавалі базу крыніц, неабходную для правядзення даследаванняў па археалогіі, палеаграфіі, мастацтвазнаўстве, а музейныя прадметы ў прыватных зборах выклікалі ўсё большы грамадскі інтарэс. Так развівалася тэндэнцыя іх перавтварэння ў публічныя музеі.

Праект музея старажытнасцяў

Падчас нядоўгай службы ў ордэнскай капітуле ў Санкт-Пецярбургу ў 1834 — 1835 гадах граф Тышкевіч мог аглядаць калекцыі знакамітай Кунсткамеры, Румянцаўскага музея на Англійскай набярэжнай, "Рускага музеума" Паўла Свіньіна. Знаходзячыся да 1840-га ў штаце канцылярыі Харкаўскага генерал-губернатара, ён меў дастаткова часу, каб дэталёва пазнаёміцца з экспазіцыямі мюнцкабінета Харкаўскага ўніверсітэта (аднаго з лепшых у імперыі, дзе, у прыватнасці, з 1813 года знаходзіўся нясвіжскі нумізматычны збор), а таксама ўніверсітэцкага заалагічнага кабінета. Дакладна вядома пра знаёмства Тышкевіча з калекцыямі музея старажытнасцяў пры Кіеўскім універсітэце, створанага ў 1835 годзе.

Аднак галоўнае значэнне для фармавання музейных поглядаў нашага героя адыграла яго навуковая вандроўка ў скандынаўскія краіны летам 1843 года, апісаная ў кнізе "Лісты пра Швецыю". У той час перадача вопыту і навыкаў прафесіі адбывалася ва ўстановах і засноўвалася на традыцыі. Школай падрыхтоўкі спецыялістаў, перш за ўсё захавальнікаў, з'яўляліся буйныя музеі, якія ўжо меліся ў скандынаўскіх краінах. Акрамя таго, на думку вучонага, старажытная культура гэтага рэгіёна Еўропы была найбольш блізкай культуры яго роднай "Літоўскай Русі".

Да пачатку вандроўкі Тышкевіч меў вопыт збірання і сістэматызацыі археалагічных калекцый. Але менавіта падчас скандынаўскага падарожжа ён стаў музейным спецыялістам, правадніком ідэі стварэння на базе прыватных калекцый публічнага "літоўска-рускага музея". Веды, атрыманыя падчас падарожжа, дазволілі яму скласці праект Віленскага музея старажытнасцяў, а пазней пабудаваць яго экспазіцыю па лепшых узорах таго часу.

Едзе і... крытыкуе!

У першай палове XIX стагоддзя цікавасць да гістарычнага мінулага ў Скандынавіі вызначалася пашырэннем навуковых поглядаў гісторыкаў, якія, выйшаўшы за рамкі антычнага мастацтва, вывучаюць уласную міфалогію і гісторыю матэрыяльнай культуры, а таксама ўсеагульнай незадаволенасцю тым, што праз гістарычныя змены Данія і Швецыя апынуліся на перыферыі Еўропы.

У чаканні замежнага пашпарта ў Пецярбургу Яўстах Тышкевіч наведаў Царскасельскі арсенал, дзе, сярод іншага, яго ўвагу прыцягнула зброя Тадэвуша Касцюшкі. Прыбыўшы ў Стакгольм, вучоны адразу ж накіраваўся да прэзідэнта Каралеўскай Акадэміі навук Ёнса Берзеліуса, да якога ў графа меўся рэкамендацыйны ліст, напісаны прафесарам Віленскай медыка-хірургічнай акадэміі Эдуардам Эйхвальдам. Берзеліус дапамог Тышкевічу скласці план знаходжання ў скандынаўскіх краінах, што ўключаў знаёмства з працай найважнейшых мясцовых музеяў.

У адпаведнасці з планам Тышкевіч накіраваўся ў стакгольмскі Каралеўскі замак, у левым крыле якога знаходзіліся карцінная галерэя, зала скульптуры, а таксама калекцыі старажытнаегіпецкіх, старажытнарымскіх і скандынаўскіх старажытнасцяў. Пасля вывучэння экспазіцый замка, беларускі вучоны пакрытыкаваў іх стваральнікаў за адсутнасць "парадку" ў размяшчэнні экспанатаў. Верагодна, пад словам "парадак" Тышкевіч меў на ўвазе недастаткова выверэныя тыпалагічныя шэрагі сістэматычных экспазіцый у замку.

Фармаванню гэтага тыпу музейных экспазіцый у першай палове XIX стагоддзя спрыяла зацвярджэнне прыярытэту навуковага мыслення ды ідэя лінейнага гістарычнага развіцця. Іх з'яўленне было звязана з працэсам дыферэнцыяцыі ў навуцы. Прадметы, што прадстаўляліся па сістэматычным метадзе экспанавання, адбіраліся, інтэрпрэтаваліся і размяшчаліся па сістэме навуковай дысцыпліны, прадстаўленай у музеі. Асноўная структурная адзінка экспазіцыі — тыпалагічны шэраг. Па гэтым шляху пайшоў Тышкевіч. У экспазіцыі музея старажытнасцяў ён структураваў матэрыял так: 1. Манеты, медалі; 2. Гравюры, геаграфічныя карты, атласы; 3. Карціны, партрэты, скульптуры; 4. Дыпломы, рукапісы, аўтографы гістарычных дзеячаў; 5. Мемарыяльная калекцыя; 6. Археалагічная калекцыя; 7. Бібліятэка.

Ад замкаў да тэорыі ў Капенгагене

Са Стакгольма Тышкевіч накіраваўся ў замак Грыпсхольм, вядомы калекцыяй партрэтаў прадстаўнікоў дынастыі Еўропы, у тым ліку Рэчы Паспалітай, а таксама зборам ваенных трафеяў. Не меншае ўражанне на беларускага падарожніка зрабілі замкі Дротнінгхольм і Скуклостэр, які да таго часу ўжо набыў славу найбагацейшага сховішча гістарычных і мастацкіх помнікаў. У Лун-

дзе ўвагу прыцягнулі археалагічны, нумізматычны і прыродазнаўчы кабінеты ўніверсітэта, а таксама "кабінет рэдкасцяў" графа дэ ля Гардзі.

Аднак найважнейшым з музейнага гледзішча было яго знаходжанне ў Капенгагене, дзе ўвагу прыцягнуў Музей паўночных старажытнасцяў, створаны Крысціянам Томсэнам у 1819 годзе ў адпаведнасці з "тэорыяй трох эпох" (каменны, бронзавы і жалезны вякі). Пазней гэтая сістэматызацыя была пацверджана пераемнікам Томсэна Енсам Варсо, які падзяліў каменны век на палеаліт і неаліт. Гэтаксама як Леапольд фон Ранке заклаў парадыгму працы гісторыка паміж архівам і пісьмовым сталом, Крысціян Томсэн заклаў парадыгму працы археолага паміж раскопкамі і музеем. Гэта разуменне падзяляў Тышкевіч. Ён вывучаў прынцыпы пабудовы экспазіцыі Музея паўночных старажытнасцяў, абмяркоўваў пытанні практыкі, рабіў у экспазіцыі замалёўкі, складаў спісы экспанатаў. Для будучага музея старажытнасцяў вучоны набыў у Капенгагене калекцыю каменных сякер. Таксама Тышкевіч шмат часу праводзіў тады ў Музеі скульптуры Бертэля Торвальдсэна, які толькі адкрыўся ў гістарычным цэнтры Капенгагена на сродкі месцічаў.

Можна меркаваць, што на рашэнне Тышкевіча аб стварэнні аддзела прыроды ў віленскім музеі паўплывала знаёмства з Дзяржаўным прыродазнаўчым музеем, які на момант прыбыцця беларускага падарожніка ўжо меў будынак у Стакгольме, а таксама з прыродазнаўчым зборам у Капенгагене.

Шлях да "сацыялкі"

Падчас падарожжа Тышкевіч зафіксаваў станаўленне культурна-адукацыйнай сацыяльнай функцыі музея. Так, Музей паўночных старажытнасцяў у Капенгагене ў той час быў адкрыты для агляду раз у тыдзень бясплатна для "людзей усіх званняў". У гэтыя дні яго аглядала "велізарная колькасць наведвальнікаў". Не меншую колькасць людзей прыцягвалі экспазіцыі Каралеўскага замка ў Стакгольме, а таксама шведскіх гістарычных замкаў. Назіраючы за тым, як зборы, выстаўленыя ў замку Скуклостар, аглядае група студэнтаў Упсальскага ўніверсітэта, ён запісаў: "Рэлікві мінулых слаўных дзён выхоўваюць моладзь і, такім чынам, вызначаюць лёс будучыні". Не ў апошнюю чаргу дзякуючы музеям, па назіраннях вучонага, гісторыяй былі захопленыя прадстаўнікі розных слаёў шведскага грамадства, нават сяляне распавядалі аб былой велічы сваіх каралёў.

Да 1848 года, калі Яўстах Тышкевіч звярнуўся да віленскага генерал-губернатара Фёдара Мірковіча з прашэннем аб адкрыцці ў Вільні музея, ён акумуляваў перадавы вопыт збору, сістэматызацыі і прэзентацыі калекцый, а галоўнае — разуменне грамадскай місіі музея. Тое ўвасобілася ў першым публічным музеі Беларусі і Літвы — Віленскім музеі старажытнасцяў.

Аляксандр ГУЖАЛОЎСКІ, прафесар, доктар гістарычных навук

За маё творчае жыццё я ведаў шмат журботных фактаў пра тое, як немаведама куды знікаюць творы памерлых творцаў практычна ва ўсіх відах і жанрах. Не кажучы пра зніклыя беларускія творы манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага жывапісу: мазаікі, роспісы, вітражы, чаканкі, буйныя габелены, а таксама скульптурна-архітэктурныя помнікі, і не толькі ў нашай краіне.

Барыс КРЭПАК

Аляксандр Кішчанка, Міхаіл Савіцкі. Роспіс "Трыумф пакаленняў" у горадзе Міскоры.

Як і куды знікаюць творы?

Гісторыя страчанага ў калейдаскопе шматкроп'яў

Зразумела, без творчасці мастак у любым выпадку не можа існаваць. Гэта аксіёма. А між тым у кожнага ў майстэрнях набіраецца шмат работ, якія хочацца паказаць гледачу. І тут узнікае пытанне: "А што будзе са спадчынай мастака пасля яго сыходу з жыцця?" Праблема, якая, магчыма, ніколі не будзе вырашана. А мо прыйдзе час, калі ў краіне з'явіцца памяшканне для захавання такой спадчыны — фонда нашай нацыянальнай культуры?

Роздумы пачну з яскравага прыкладу. У 1973 годзе Аляксандр Кішчанка разам з Міхаілам Савіцкім стварылі для інтэр'ера новага корпуса санаторыя "Беларусь" у крымскім Міскоры эскізы і кардон тэмпернага роспісу "Трыумф пакаленняў", які раскрываў ідэю пераемнасці пакаленняў салдатаў рэвалюцыі і скаральнікаў космасу. Работа ішла няпроста. Бо так атрымалася, што галоўная нагрузка ў працы над творам легла на Кішчанку. Так здарылася, што менавіта ў перыяд непасрэднага ўвасаблення роспісу на аб'екце ў Міскоры Міхаіл Андрэевіч аказаўся ў мінскай бальніцы з цяжкім прыступам застарэлай язвы страўніка. Для чытача будзе цікава прачытаць фрагмент ліста Кішчанкі з Міскора ў Мінск свайму сааўтару, каб хаця б пункцірна ўявіць сабе складанасць работы над гэтым знакавым для мастацтва творам манументальнага маштабу (ліст у маім хатнім архіве): "Мішанька! Што ж ты так надоўга ўвязнуў у сваёй лячэбніцы? Ну, калі ты там трывала засеў, дык ужо выхадзі адтуль бугаём! Ведаеш, як ты патрэбны тут, у Міскоры! Але што казаць: старайся мацнець, і галоўнае — не губляць аптымізму! Мы яшчэ як мастакі павінны з табой даць куродыму! У мяне ўсё ідзе па плане. Эскіз абнавіў, зрабіў яго ў такім колеры, як патрабавала архітэктура. Зрабіў усё дакладна: фігуры залатыя, планета блакітная, а блакітнае, пад фігурамі ўнізе — робіць работу вельмі нязвыклай. Усе малюнкі ператварыў наноў… Доўга шпакляваў і грунтаваў. Толькі сорак яек улупіў у грунт! Словам, сцяну падрыхтаваў па вышэйшым разрадзе. Спатрэбілася майстэрства, а як жа інакш? Думаю, што за чатыры тыдні галоўную частку прамалюю, а яшчэ пару тыдняў спатрэбіцца пасля таго, як рабочыя падрыхтуюць столь, і тады ўсе паверхні сцен закончу цалкам…"

І — скончыў. Яснасць і дакладнасць кампазіцыйнага рашэння, майстэрства малюнка, асаблівы строй мастацкай формы, разлічаныя на ўспрыманне як з вялікай адлегласці, так і на агляд з бліжэйшых кропак. Шматгранасць абрысоўкі вобразаў, арганічная сувязь жывапісу з функцыянальным рашэннем сучаснага інтэр'ера зрабілі гэту работу адной з самых удалых у шэрагу найбуйнейшых савецкіх манументальных твораў 1970-х, пра што шмат пісалі ўсесаюзныя альманахі і спецыяльныя часопісы.

Але пасля развалу Саюза наступіў час, нярэдка ў сэнсе мастацтва непадуладны логіцы. На маю нядаўнюю просьбу расказаць пра лёс твора адміністрацыя санаторыя ветліва паведаміла, што пасля 1999 года, у час рэканструкцыі будынка, роспіс "Трыумф пакаленняў", выкананы двума народнымі мастакамі Беларусі, быў знішчаны. І ў беларускай прэсе пра гэта нічога не напісалі… Таму я падрабязна расказаў пра гэта, каб людзі ведалі, што насамрэч і рукапісы гараць, і помнікі разбураюцца, і фрэскі знікаюць. Разам з імі, на жаль, і памяць… І, магчыма, гэта паслужыць нейкім урокам (хацелася б верыць) .

Наогул, герастратаўская "традыцыя" існавала яшчэ і ў 1920-я гады ў Савецкім Саюзе — у час змен, і ў 1930-я — у чорны перыяд "вялікага тэрора", калі пасля арыштаў дзеячаў мастацтва разам з імі знікалі і іх творы. Так здарылася з мастацкай спадчынай расстраляных Рамана Семашкевіча, Яфіма Мініна, Пятра і Хрыстафора Даркевічаў.

Мала хто ведае, але ў пачатку 1920-х у Віцебску пры Мастацкім народным вучылішчы і пазней пры Мастацка-практычным інстытуце існаваў так званы губернскі Музей сучаснага мастацтва, у якім былі прадстаўлены творы мясцовых і маскоўскіх мастакоў: ад Шагала, Малевіча, Пэна, Бразера, Стржэмінскага, Юдовіна да Кандзінскага, Канчалоўскага, Ларыёнава, Машкова, Фалька, Родчанкі, Экстэр, Кузняцова. Аднак з розных прычын ужо ў сярэдзіне 1920-х калекцыя карцін была перавезена ў Петраград і Маскву. А тыя авангардныя палотны, што засталіся, прапалі, былі знішчаны або парэзаны на кавалкі для практык студэнтаў новага керзінаўскага Мастацкага тэхнікума. Сёння знаходжанне дзясяткаў твораў "найноўшага" "левага" мастацтва невядомае. Куды зніклі такія работы, як "Заезны дом", "Партрэт Юдаля Пэна", "Прытон" Марка Шагала, "Уваход" і "Кампазіцыя № 219" Васіля Кандзінскага, "Нацюрморт" і "Галава" Льва Зевіна, "Нацюрморт" Масея Куніна, "Ружы" Канстанціна Каровіна, "Арыфмометр" Івана Клюна, тры краявіды Наталлі Ганчаровай, "Нацюрморт з пляшкай" Сяргея Герасімава, графічныя творы Саламона Юдовіна, два нацюрморты, партрэт жанчыны і пейзаж Роберта Фалька?..

А віцебскі "Супрэматызм № 55" Казіміра Малевіча аказаўся, па адной версіі, спачатку ў калекцыі Сафі Ларэн, потым у мемарыяльным музеі сучаснага мастацтва ажно ў Токіа. Дарэчы, там жа побач экспануюцца і карціны выхадца з Віцебшчыны Марка Роткі, Рэмбранта, Пабла Пікаса, Агюста Рэнуара, Клода Манэ… Па іншай версіі, карціну Малевіча з Віцебска ў Маскву перавезла супрэматыстка Ніна Коган, а ў сярэдзіне 1960-х палатно трапіла ў дзяржфонд работ, якія прызначаліся для продажу. І, мабыць, адтуль твор і трапіў да кіназоркі. А потым Ларэн, як сцвярджаюць даследчыкі, палатно перапрадала (ці падаравала) Японіі. Вялікую работу па асвятленні працэса стварэння віцебскага Музея сучаснага мастацтва, фарміравання і распаду калекцыі (1918 — 1941) правёў віцебскі мастацтвазнаўца Валерый Шышанаў, які ў 2007 годзе выдаў кнігу "Віцебскі музей сучаснага мастацтва". Каму цікава складаная неадназначная гісторыя нашай выяўленчай спадчыны, прачытайце гэтае даследаванне…

Да пачатку Вялікай Айчыннай вайны ў Віцебску знаходзілася каля 20 карцін з фонду былога музея. А потым калекцыю разам з іншымі творамі, у тым ліку палотнамі Льва Альперовіча і Якава Кругера, эвакуіравалі ў Саратаў. А калі фонды вярнулі ў Віцебск, ацалеў толькі нацюрморт Давіда Штэрэнберга. А наогул з той калекцыі вярнуліся ў Дзяржаўны мастацкі музей БССР некалькі карцін. Каля двух дзясяткаў аказаліся ў Рускім музеі; шмат палотнаў Юдаля Пэна, якія былі перад вайной сабраныя ў віцебскім музеі яго імя і потым, у пачатку ліпеня 1941 года, таксама тэрмінова эвакуіраваныя ў вільготныя падвалы Саратаўскага мастацкага музея імя Радзішчава, да гэтага часу не знойдзены.

У архіве Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі захавалася даведка пра ўрон, які нанеслі фашысты Дзяржаўнай карціннай галерэі БССР. Так, у Германію была вывезена ў гады акупацыі Мінска вялікая колькасць экспанатаў, у тым ліку больш за 1700 твораў беларускага, рускага і заходнееўрапейскага жывапісу, 30 беларускіх ікон XVI — XVII стагоддзяў, каля 50 скульптур, 48 слуцкіх паясоў, сотні адзінак мастацкай парцаляны, бронзавых гадзіннікаў розных эпох, твораў разьбы па косці, 100 габеленаў і дываноў і гэтак далей. А колькі было скрадзена акупантамі з іншых нашых дзяржаўных і рэгіянальных музеяў? Акрамя таго, у полымі Вялікай Айчыннай загінула шмат твораў мастакоў, якія хутка пакідалі свае майстэрні і падаваліся на фронт, у партызаны ці накіроўваліся ў эвакуацыю.

А колькі помнікаў, створаных нашымі скульптарамі і архітэктарамі ў 1930-я, страчана на акупіраванай беларускай зямлі? Ніхто цяпер не даведаецца, колькі ж твораў, цікавых і розных, беларусы згубілі за апошнія сто гадоў, хаця б з моманту заснавання так званай Віцебскай мастацкай школы, а потым і ў час дзейнасці Віцебскага мастацкага тэхнікума (вучылішча)? А колькі знікла работ мастакоў Заходняй Беларусі, якая ўваходзіла ў склад Польшчы. Я маю на ўвазе творы Сяргея Вішнеўскага, Зміцера Крачкоўскага, Язэпа Драздовіча, Пётры Сергіевіча, Паўла Южыка. Дарэчы, вялікая калекцыя работ Паўла Фаміча (ён памёр у 1944-м), падрыхтаваная яго сябрамі для персанальнай выставы ў Маладзечне, знікла ўжо ў сярэдзіне 1950-х гадоў на радзіме жывапісца — у вёсцы Вётхава, што на Смаргоншчыне…

Сумна, але знікаюць творы і пры нашым жыцці...

К

Працяг — **у наступных нумарах "К".**

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, вул. Леніна, 20.
Тэл.: 327 45 62.
Экспазіцыі:
■ "Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст.";
■ "Мастацтва Беларусі XIX — пач. XXI стст.";
■ "Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.";
■ "Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.";
■ "Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.";
■ "Мастацтва краін Усходу XIV — XX стст.".
Выставы:
■ Выстава **"Вялікі Рэмбрант"** — да 3 чэрвеня.
■ Выстава жывапісу Сяргея Каваля **"Забытыя казкі"** — да 28 мая.
■ Выстава твораў народнага мастака Рэспублікі Арменія Фараона Мірзаяна **"Армянскі сілуэт"** — з 20 мая.
■ Выстава **"Жывапіс Алы Замай"**, прысвечаная 85-годдзю з дня нараджэння мастачкі — з 26 мая.
■ Акцыя **"Ноч музеяў-2017: Гульня ў класікі, або адмова ад строгай геаметрыі"** — 20 мая. Пачатак а 19-й.
■ Цыкл лекцый **"XX стагоддзе. Рэвалюцыі ў думках і мастацтве"** — кожную сераду а 19-й, Малая зала.

Філіялы музея
МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І ПАЛОВЫ XIX ст."
г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 327 88 78.
Пастаянныя экспазіцыі:
■ **"Інтэр'еры шляхецкай сядзібы"**.
■ **"Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча"**.
■ **"Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст."**.
■ Выстава выцінанак Алены Шаліма і Лаймутэ Федасеевай **"Папяровы мост сяброўства"**.
■ Выстава аўтарскай лялькі Сяргея Драздова **"Мужчынскі погляд"** — да 20 ліпеня.
■ Выстава моды и аксэсуараў эпохі Рамантызму **"І паланэз пачаць пара"** — да 13 студзеня 2018-га.
■ Акцыя **"Чароўная ноч у Ваньковічаў"** — 20 мая.
■ **Вечар лютневай музыкі** XVI–XVII стст. з удзелам Ільі Кубліцкага (гурт "Стары Ольса") — 24 мая. Пачатак а 19-й.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ
Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 69.
■ Пастаянная экспазіцыя.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 226 09 22.
Экспазіцыі:
■ Абноўленая экспазіцыя **"Старажытная Беларусь"**.
■ "Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы".
■ "Мастацтва ў гарадской культуры XIX — XX стст.".
■ Бестэрміновая акцыя **"Адзіны білет"**, якая дазваляе мінчанам і гасцям сталіцы наведаць сем музеяў, набыўшы ўсяго адзін білет у любым з іх.
■ Акцыя **"Ноч пад знакам Вялікай мядзведзіцы"** — 20 мая. Пачатак у 18.30.
■ Вялікая канцэртная праграма ў "Ноч музеяў-2017" — 20 мая ў гасцінным панадворку музея. Пачатак а 18-й.
Выставы:
■ Выставачны праект **"Ад рымскага дынарыя да беларускага рубля"** — да 1 чэрвеня.
■ Міжнародны выставачны праект **"Поле кветак"** — да 4 чэрвеня.
■ Выстава **"Рабінская дынастыя Медалье"** — з 25 мая.
■ Выстава фотаздымкаў Уладзіміра Вараб'я **"Чарнобыль. Погляд з сучаснасці"** — да 21 мая.
■ Акцыя **"Вольнае піяніна"** — кожны дзень з 16.00 да 19.00.

Філіялы музея
ДОМ-МУЗЕЙ І З'ЕЗДУ РСДРП
г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а. Тэл.: 290 68 47.
■ **Абноўленая экспазіцыя**, прымеркаваная да 100–годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі (залы дапоўнены новымі прадметамі амаль з усіх фондавых калекцый музея).
■ Выстава эксклюзіўных аўтарскіх работ Вольгі Дзеранчук **"Мая плюшавая любоў"** — да 28 мая.
■ **"Ноч канспірацыі"** — 20 мая.

МУЗЕЙ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ
г. Мінск, вул. К.Маркса, 38.
Тэл.: 327 46 12.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Шматвектарнасць знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь"**.

МУЗЕЙ ПРЫРОДЫ І ЭКАЛОГІІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 237 46 94; 291 99 51.
Экспазіцыі:
■ "Геалогія і палеанталогія".
■ "Сезонныя змены".
■ "Вадаёмы і насельнікі прыбярэжных раслін".
■ "Хвойны тып лесу і насельнікі змяшанага лесу".
■ "Насельнікі ліставога і змяшанага лесу".
■ "Ахоўныя прыродныя ўчасткі, рэдкія віды жывёл".
■ "Выстава насякомаедных раслін".
■ Выстава **"Жывыя цмокі"** — да 25 лютага 2018-га.
г. Мінск, вул. Багдановіча, 9а.
Тэл.: 237 46 94.
■ Выстава **"Насякомыя і не толькі"** — да 31 ліпеня.
г. Мінск, вул. Казінца, 117 (будынак кінатэатра "Электрон").
Тэл.: +37529 123 60 53.
■ Выстава **"Сафары парк"** — да 1 верасня.
■ Выстава "Дзівосны свет матыльковў" — да 11 верасня.
■ Атракцыён **"Лазерны квэст"**.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ТЭАТРАЛЬНАЙ І МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ
г. Мінск, Музычны зав., 5.
Тэл.: 220 26 67.
Пастаянныя экспазіцыі:
■ "Вытокі тэатральнай і музычнай культуры на беларускіх землях".
■ "Музычная і тэатральная культура Беларусі ў X — XIX стст.".
■ "Беларуская музычная культура XX ст.".
■ "Тэатральная культура Беларусі XX ст."
■ Выстава **"Чароўныя мелодыі гліны"** — да 10 чэрвеня.
■ Акцыя **"Калейдаскоп майскай ночы"** — 20 мая. Пачатак а 17-й.

ГАСЦЁЎНЯ УЛАДЗІСЛАВА ГАЛУБКА
г. Мінск, вул. Старавіленская, 14. Тэл.: 286 74 03.
■ Пастаянная экспазіцыя.
Майстар-класы:
■ **Дэкупаж** для творчых дзяцей і падлеткаў ад 5 да 14 гадоў — кожную суботу аб 11-й.
■ Інтэрактыўныя музейныя заняткі **"Асновы акцёрскага майстэрства"** для дзяцей ад 5 да 10 гадоў.
■ Выстава міфічных аўтарскіх лялек **"Песня паўночных багоў"** — да 4 чэрвеня.
■ Майстар-класы па акварэльным жывапісе, мяккай ляльцы, палімернай гліне, ткацтве, прадстаўленне лялечнага тэатра "Батлейка", кірмаш — 20 мая.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА КІНО
г. Мінск, вул. Свярдлова, 4.
Тэл.: 327 10 75.
Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Фарбы душы"** — да 4 чэрвеня.
■ Конкурс мадэльераў на тэму "Кінематограф", выступленні маладых кампазітараў і выканаўцаў, цыкл аўтарскіх лекцый, рэтраспектыва кароткаметражнага фільма "Лепшае за апошнія 5 гадоў" — 20 мая.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ
г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8.
Тэл: 327 11 66; 203 07 92.
Музей працуе: пн. — выхадны, аўт. — нядз. — ад 10-й да 18-й, сер. — ад 12-й да 20-й.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Часовая экспазіцыя **"Авіяцыя партызанам у гады Вялікай Айчыннай вайны"** — да 26 мая.
■ Выстава работ навучэнцаў мастацкай студыі "Флорыя" **"Як я бачу вайну і мір"** — да 25 мая.
■ Святочная праграма **"Ноч музеяў-2017. Горад засынае, прачынаецца музей..."** — 20 мая. Пачатак а 18-й.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"
г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19.
Тэл.: (8–01770) 2 06 60, 2 06 02;
+ 37529 551 80 51,
+ 37529 190 31 49.
Палацавы ансамбль
■ Пастаянная экспазіцыя.
Ратуша
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Анімацыйная праграма **"Немагчымае магчыма: на аўдыенцыі ў войта!"**

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"
г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць.
Тэл.: (8–01596) 2 82 91,
(8–01596) 2 82 70.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Міжнародная выстава **"Ultima ratio Regum. Беларусь у Паўночных войнах сярэдзіны XVII — пачатку XVIII стст."** — да 24 верасня.
■ Выстава акварэльных твораў Раманаса Барысаваса **"Паэзія руін"**.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА
г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5.
Тэл.: 294 91 96.
Экспазіцыі:
■ **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць"**.
■ Стацыянарная выстава **"У хвалях няспыннага руху: аўтамабільнымі шляхамі Коласа"** — да 30 верасня.
■ Выстава **"Мой мілы сын..."**, прымеркаваная да 100-гадовага юбілею з дня нараджэння Юрыя Канстанцінавіча Міцкевіча (1917 — 1941), сярэдняга сына народнага паэта Беларусі Якуба Коласа.
■ Экспазіцыя **"Склеп"** на сядзібе Якуба Коласа ў гаспадарчай пабудове.
■ Тэатралізаваная праграма **"Святло ў акне"** — 20 мая. Пачатак а 17-й.
■ Інтэрактыўная гульня **"Таямніцы дома Песняра"**.
■ Тэатралізаваныя экскурсіі па казках, апрацаваных Якубам Коласам, для школьнікаў малодшага ўзросту.
■ Музейна-педагагічны праект **"Крочым у школу разам з Коласам"**.
■ Пешая экскурсія **"Мясцінамі Коласа ў Мінску"**.
Акцыі:
■ **"Самы лепшы дзень"** (дзень нараджэння ў музеі).
■ Віншаванне ад музея, фотасесія **"У дзень вяселля — у музей!"**
■ Музейная творчая майстэрня.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ
г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4.
Тэл.: 327 78 66.
Экспазіцыі:
■ Пастаянная экспазіцыя **"Шляхі"** з праглядам роліка ў 3D-фармаце і інтэрактыўнай зонай для дзяцей **"Хлопчык і лётчык"**, галаграфічным тэатрам.
■ Юбілейная выстава **"Беларускай песні ўладар"**, прысвечаная 135-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы, — да 16 чэрвеня.
■ Інтэрактыўныя музейныя праграмы **"У пошуках папараць-кветкі", "Вячоркі"**.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА МІНСКА
г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.

Філіялы Музея гісторыі горада Мінска
ГАРАДСКАЯ МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ ТВОРАЎ Л.Д. ШЧАМЯЛЁВА
г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.
Экспазіцыя:
■ **"Жыццёвы і творчы шлях народнага мастака Беларусі Леаніда Шчамялёва"**.
■ Выстава фотаздымкаў Таццяны Латанскай (Украіна) **"Жывое сонца"** — з 26 мая да 25 чэрвеня.

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ МІХАІЛА САВІЦКАГА
г. Мінск, пл. Свабоды, 15.
Тэл.: 321 24 30.
Экспазіцыі:
■ **"Мастак. Грамадзянін. Герой".** Прысвечана Ганаровану грамадзяніну г. Мінска Міхаілу Савіцкаму.
■ Выставачна-інтэрактыўны праект **"Сустрэча з майстрам"**.
■ **"Мінск губернскі. Шляхецкі побыт".**
■ Персанальная выстава Марыты Голубевай і Уладзіміра Голубева **"Плюс / Мінус"** — да 4 чэрвеня.
■ Выстава твораў Алены Зінскі **"Часткі цэлага"** — да 4 чэрвеня.
■ **"Інтэлектуальная ноч — 2017"** — 20 мая. Пачатак а 19-й.

МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ РАТУША
г. Мінск, пл. Свабоды, 2а.
Тэл.: 321 24 30.
Экспазіцыі:
■ **"Мінск у гістарычнай прасторы. Картаграфічны кабінет".**
■ **"Мінск сярод сяброў. Гарады-пабрацімы сталіцы Беларусі".**

МУЗЕЙ "ЛОШЫЦКАЯ СЯДЗІБА"
г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 8.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Акцыя **"Ноч мастацтваў у Лошыцкай сядзібе"** — 20 мая. Пачатак а 18-й.
■ Унікальная канцэртная праграма **"Майскія музычныя вечары"** — 20 і 27 мая. Пачатак канцэртаў — а 19-й.

ФЛІГЕЛЬ ЛОШЫЦКАГА СЯДЗІБНА-ПАРКАВАГА КОМПЛЕКСУ
г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 10.
Тэл.: 285 18 86.
Экспазіцыя:
■ **"Кола часу"** — прадметы гарадской і сялянскай культуры кан. XIX — сяр. XX стст.
■ Выстава **"Мастацкія палотны "Мінскае палатно-Пакроў"** (мастацкія палотны, ручнікі, швейныя машыны).

ЭКСПАЗІЦЫЯ "КАРЭТНАЯ"
г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 18. Тэл.: 321 24 30.
■ Новая экспазіцыя **"Мінская конная чыгунка"**.
■ "Сані • вазок; каляска • брычка; карэта • вупраж" (пастаянная экспазіцыя па гісторыі гужавога транспарту жыхароў Мінска XIX — пачатку XX стст.).
■ Віртуальная гульня **"Карэтны майстар"**.

АРТ-ГАСЦЁЎНЯ "ВЫСОКАЕ МЬСТА"
г. Мінск, вул. Герцэна, 2а.
Тэл.: 321 24 30.
■ Выстава **"80+"** (фотапраект Наталлі Пуцята, Ланы Красікавай і Андрэя Казекі) — да 28 мая.
■ Музейная акцыя **"Вечар успамінаў"** — 20 мая. Пачатак а 17-й.

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ
г. Гомель, вул. Пушкіна, 5.
Тэл.: (8-0232) 77 57 41.
■ Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.
■ Пастаянная выстава тэхнікі на адкрытай пляцоўцы.
■ На тэрыторыі працуе пнеўматычны цір.
■ **"Музей крыміналістыкі"**.
■ Выстава халоднай зброі **"Для моцных духам..."**
■ Выстава **"Броня крепка"**.

ЛІДСКІ ГІСТОРЫКА-МАСТАЦКІ МУЗЕЙ
г. Ліда, вул. Перамогі, 37а.
Тэл.: (8-0154) 53 50 64.
Пастаянныя экспазіцыі:
■ **"Прырода Лідчыны"**.
■ **"Сучаснае мастацтва краю"** (жывапіс, графіка, скульптура, мастацкае шкло).
Выставы:
■ Выстава **"Майстэрня заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі, сябра Саюза мастакоў Беларусі Уладзіміра Мурахвера"**.
■ **"Вядзём пачатак мы ад Гедыміна..."**
■ Мемарыяльны пакой **Валянціна Таўлая**.
■ Выстава са збору А.Фішбайна **"Рэчы побыту канца XIX — пачатку XX стст."**.
■ Музейна-вобразная зала **"Хрушчоўка 60-х"**.
■ Выстава **"Вайны свяшчэнныя старонкі"**.
■ Выстава **"Надзейны шчыт краіны"**.
■ Выстава **"Падарожжа ў гарадскі і сельскі побыт"**.
■ Выстава **"Жыве мая ліра нанова!"**, прымеркаваная да 140-годдзя з дня нараджэння Цёткі (Алаізы Пашкевіч).

ІЎЕЎСКІ МУЗЕЙ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ КУЛЬТУР
г. Іўе, вул. 17 верасня, 9.
Тэл. (8-01595) 2 68 96.
■ Экспазіцыя **"Пад адзіным небам праз стагоддзі"** ("Карэннае насельніцтва Іўеўшчыны", "Беларускія татары").
■ Выставы **"Беларускія яўрэі", "Другая сусветная вайна"**.
■ Перасоўная выстава ўстановы "Музей "Замкавы комплекс "Мір" **"Літва і Беларусь на старонках сямейнага альбома княгіні Марыі Гагенлоэ"**.
■ Прадстаўленні лялечнага тэатра "Батлейка".

НАВАГРУДСКІ ГІСТАРЫЧНА-КРАЯЗНАЎЧЫ МУЗЕЙ
г.Навагрудак, вул. Гродзенская, 2. тэл.(8-01597) 2 14 70.
■ Пастаянная экспазіцыя: **"Гісторыя Навагрудчыны са старажытных часоў да Вялікай Айчыннай вайны".**
г.Навагрудак, вул.Мінская, 64-66.
■ Экспазіцыя: **"Музей яўрэйскага супраціўлення на Навагрудчыне".**

ДОМ-МУЗЕЙ АДАМА МІЦКЕВІЧА Ў НАВАГРУДКУ
г. Навагрудак, вул. Леніна,1.
Тэл.: (8-01597) 2 43 40 (каса).
■ Пастаянная экспазіцыя: **"Жыццё і творчасць Адама Міцкевіча"**.
■ Пастаянныя выставы: **"Святло кухні Міцкевічаў", "Малюнкі сельскага жыцця", "Пан Тадэвуш" праз час і народы".**

ГАЛЕРЭІ

"УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"
г. Мінск, пл. Кастрычніцкая, 1.
Тэл.: 327 26 12.
■ Выстава твораў навучэнцаў Дзіцячай школы мастацтваў горада Гомеля — да 29 мая.
■ Калектыўная выстава беларускіх жывапісцаў **"Магчыма ўсё!"** — да 29 мая.

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА
г. Мінск, вул. Казлова, 3.
Тэл./факс: 290 60 10.
■ Выстава сучаснага мастацтва **"Вяртанне вобраза. Да 130-годдзя Марка Шагала"** — да 21 мая.

ТЭАТРЫ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, пл. Парыжскай камуны, 1.
Тэл./факс: 334 11 56.
■ **21 — "Чароўная флейта"** (опера ў 2-х дзеях) В.А. Моцарта. Прэм'ера.
■ **22 — "Папялушка"** (балет у 3-х дзеях) С.Пракоф'ева.
■ **23 — "Вяселле Фігара"** (опера ў 4-х дзеях) В.А.Моцарта.
■ **24 — "Жар-птушка"** І.Стравінскага, **"Шахразада"** М.Рымскага-Корсакава (балеты ў адной дзеі).
■ **24 — "Абліччы прыгажосці"** (канцэрт заслужанай артысткі Рэспублікі Беларусь Тамары Глаголевай). Камерная зала імя Л.П.Александроўскай. Пачатак у 19.30.
■ **25 — "Кармэн"** (опера ў 3-х дзеях) Ж.Бізэ. У партыі Кармэн — Аліма Мамдзі (Францыя).
■ **26 — "Жызэль, або Вілісы"** (балет у 2-х дзеях) А.Адана.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АКАДЭМІЧНЫ МУЗЫЧНЫ ТЭАТР
г. Мінск, вул. Мяснікова, 44.
Тэл.: 200 81 26.
■ **22 — "Шклянка вады"** (мюзікл у 2-х дзеях) У.Кандрусевіча.
■ **23 — "Баль у "Савоі"** (аперэта ў 2-х дзеях) П.Абрахама.
■ **24 — "Шалом Алейхем! Мір вам, людзі!"** (мюзікл у 2-х дзеях) А.Хадоскі.
■ **26 — "Юнона" і "Авось"** (рок-опера) А. Рыбнікава.
■ **27 — "Дуброўскі"** (мюзікл у 2-х дзеях) К.Брэйтбурга.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ"
г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44.
Тэл./факс: 334 60 08.
■ **22 — "Адэль"** (гісторыя кахання) Я.Таганава.
■ **23 — "Гэта ўсё яна"** (драма) А.Іванова. Прэм'ера.
■ **24 — "Нязваны госць"** (сямейная меладрама) С.Бартохавай.
■ **25 — "А ці будзе заўтра" ("7 дзён без антракту")** Д.Багаслаўскага.
■ **26 — "Эра Андрагін"** (прэм'ерны паказ пластычнага спектакля тэатра "АКМЕ").
■ **27 — "Залатое сэрцайка"** (інтэрактыўная казка) С.Навуменка. Прэм'ера. Пачатак аб 11-й.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"
г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2.
Тэл.: (8-0212) 36 32 50.
■ **20 — "Яшчэ раз пра Чырвоны Каптурык"** С.Яфрэмава, С.Когана. Пачатак аб 11-й.
■ **21 — "Вясёлы Дарафей"** (інтэрактыўная казка). Пачатак аб 11-й.
■ **27 — "Прынцэса і Свінапас"** Х.-К.Андэрсена. Пачатак аб 11-й.